# Хрэстаматыя постзвыклага часу




Серыя “СВЕТ СУЧАСНАГА ІСЛАМУ”

# Хрэстаматыя постзвыклага часу

Рэдактар: Зіяуддзін Сардар
Скарочаная версія: Скот Джордан

Міжнародны Інстытут
Ісламскай Думкі

2023

**Хрэстаматыя постзвыклага часу (Belarus)**
*Рэдактар: Зіяуддзін Сардар*
*Скарочаная версія: Скот Джордан*
*Серыя "Свет сучаснага ісламу"*

© Міжнародны Інстытут Ісламскай Думкі
1444AH / 2023CE
*Paperback* ISBN 978-9941-33-627-0

**The Postnormal Times Reader (Belarus)**
*Edited by Ziauddin Sardar*
*Abridged by C Scott Jordan*
*IIIT Books-in-Brief Series*

© The International Institute of Islamic Thought (IIIT)
1441AH / 2020CE
*Paperback* ISBN 978-1-56564-958-3
IIIT
P.O. Box 669
Herndon, VA 20172, USA
www.iiit.org

Пераклад: Давуд Радкевіч
Вокладка: Шыраз Хан
Макет: Гасан Гасанаў
Інстытут Інтэграцыі Ведаў
Грузія, Тбілісі, вул. Дадыяні, 7 г.,
Гандлёва-дзелавы цэнтр «Карвасла», А-508
ikiacademy.org

Усе правы ахоўваюцца.
Ніякая частка гэтай кнігі не можа быць адноўленая
без пісьмовага дазволу ўладальніка аўтарскіх праў.
Погляды і меркаванні, выкладзеныя ў дадзенай кнізе, належаць аўтарам і могуць не супадаць з меркаваннем выдаўца.

Publishing House "UNIVERSAL"

4,A. Politkovskaia st., 0186, Tbilisi,Georgia ☎: 5(99) 17 22 30; 5(99) 33 52 02
E-mail: universal505@ymail.com; gamomcemlobauniversali@gmail.com

ISBN 978-9941-33-627-0

## ПРА СЕРЫЮ

**Серыя «Books-in-Brief» з’яўляецца зборам асноўных выданняў Міжнароднага інстытута ісламскай думкі, прадстаўленых у кароткім выкладзе. Палегчаны фармат дазваляе зэканоміць час, даючы чытачу рэальную магчымасць атрымаць ўражанне аб поўнай версіі кожнай кнігі і дапамагае паглыбіцца ў сутнасць арыгінала. Серыя складаецца са своеасаблівых сінапсісаў-аглядаў поўных выданняў, якія, спадзяемся, заахвоцяць чытачоў да далейшага, больш глыбокага вывучэння арыгіналаў.**

Мы жывём у перыяд пераменаў, якія пастаянна паскараюцца. Новыя трэнды, тэхналогіі і крызісы ідуць адзін за адным, трансфармуючы традыцыйныя сацыяльныя і палітычныя ландшафты. Звыклая сістэма каштоўнасцей і ідэалаў можа абрынуцца ўраз: нібы ніадкуль з’яўляюцца новыя паняцці, усё часцей адбываюцца незвычайныя падзеі, пашыраюцца і робяцца пануючымі. Толькі за апошнія некалькі гадоў мы сталі сведкамі з’яўлення папулізму і крайне правых у Еўропе і ЗША, трэшчын у Еўрапеўскім саюзе, кібервойнаў. Кітай як новая звышдзяржава займае ўсё больш дамінуючае месца. Пандэміі, падобыя да вірусаў Эбола і Зіка. Змены клімату, якое вядзе да экстрэмальных з’яваў надвор’я. Беспілотныя аўтамабілі. Штучны інтэлект. “Фальшывыя навіны”. “Альтэрнатыўныя факты”. “Постапраўда”. “Прарыўныя тэхналогіі”, якія разбураюць і часта псуюць усё. Свет у палоне няспынных перамен... Здаецца, нікому і нічому нельга больш давяраць. Усё, што мы лічым нормай, растае проста перад намі.

Тэорыя постзвыклага часу дапамагае чытачу зарыентавацца ў зменлівым свеце, дзе пануе няпэўнасць, а невукі сталі шаноўнай супольнасцю.

Постзвыклы час лепш за ўсё вызначыць як «прамежкавы перыяд, калі старыя артадоксы адміраюць, новыя яшчэ не нарадзіліся,і здаецца, што вельмі мае сэнс». Як выказаўся Эцыа Маўра: «Мы знаходзімся ў падвешаным стане паміж “ужо не” і “яшчэ не”, і таму для нас непазбежная нестабільнасць: няма нічога фіксаванага вакол нас, нават кірунку нашага руху». Тэорыя постзвыклага часу спрабуе асэнсаваць зменлівы свет, дзе няпэўнасць з’яўляецца дамінуючай тэмай, а невуцтва стала каштоўным таварам. «Хрэстаматыя постзвыклага часу» – наватарская анталогія прац пра супярэчлівай, комплекснай і хаатычнай прыродзе нашай эпохі. Яна ўключае паходжанне, тэорыю і метадалогію постзвыклага часу; даследуецца мноства пытанняў – ад змены клімату, кіравання і блізкаўсходніх праблем да рэлігіі і навукі з пункту гледжання постзвыклага часу. Склаўшы карту некаторых ключавых мясцовых і глабальных праблем нашай пераходнай эпохі, хрэстаматыя дапамагае вызначыць арыенціры ў нашай турботнай будучыні.

# ШТО Ж АДБЫЛОСЯ?

*Уводзіны Зіяуддзіна Сардара*

Вы там, ззаду, слухаеце? Лі Гейтс у фільме «Фінансавы монстр» кажа: «Ты і ўяўлення не маеш, дзе твае грошы. Ведаеш, калісьці быў час, калі ты мог прыйсці ў свой банк, адкрыць сваё сховішча і паказаць на злітак золата. Але гэты час мінуў. Твае грошы, тое, за што ты дзярэш свой азадак, гэта ўсяго толькі некалькі фатонаў энергіі, якія праходзяць праз сеціва оптаваЛаконных правадоў. Навошта гэта трэба? Мы зрабілі гэта, каб паскорыць іх, таму што вашы грошы павінны быць хуткімі. Хутчэй, чым у іншых. Але часам, калі вам патрэбныя больш хуткія рынкі з больш хуткім гандлем, больш хуткім прыбыткам, больш хуткім усім, у вас могуць лопнуць пакрышкі».

Вельмі разумнае і своечасовае назіранне. Аднак праблема не ў прабітай шыне: увесь аўтамабіль і сама дарога знаходзяцца ў аварыйным стане. Паўсюль разрывы, і здаецца, што адбываюцца яны адначасова з жахлівай рэгулярнасцю. У 2016 годзе мы сталі відавочцамі шэрагу беспрэцэдэнтных падзей. Няспынныя канфлікты ў Сірыі, Лівіі і Іраку прывялі да рэкорднага па маштабах міграцыйнага крызісу. У Францыі, Германіі і ЗША адбываліся масавыя расстрэлы безабаронных людзей. Левы папулізм прывёў да таго, што Джэрэмі Корбін стаў лідарам лейбарысцкай партыі ў Вялікабрытаніі, а Берні Сандэрс узначаліў хвалю палітычнага абурэння ў ЗША. Правы папулізм ў Францыі, Аўстрыі, Галандыі, Польшчы, Венгрыі можа прывесці крайне правыя сілы да ўлады ў Еўропе. Вірус Зіка. Адмова ад прарыўнага мірнага пагаднення ў Калумбіі[1]. Абвастрэнне напружанасці паміж Кітаем і Японіяй у Паўднёва-Кітайскім моры. Прэзідэнт Радрыга

[1] 26 верасня 2016 г. калумбійскія ўлады і паўстанцы з арганізацыі FARC падпісалі мірнае пагадненне. Дакумент павінен быў пакласці канец паўвекавога канфлікту, які забраў жыцці больш за 260 000 чалавек. Але на агульнанацыянальным рэферэндуме ён быў адпрэчаны.

Дутэртэ, які лічыць расстрэлы беднякоў неабходнымі ў сваёй амбіцыйнай вайне з наркотыкамі на Філіпінах. Брэксіт. Раскол у Еўрасаюзе. І, вядома ж, Дональд Трамп. Нешта нібы не тое адбываецца з гэтым светам.

А што з ім адбываецца?

Многія навукоўцы, мысляры, пісьменнікі і каментатары спрабуюць выявіць гэта ўжо больш за дзесяць гадоў. Па сутнасці, усе яны кажуць пра тое, што мы страцілі або страчваем нашу веру і давер да таго, што да апошняга часу лічылася нормай, звыклым і агульнапрынятым.

Такім чынам, звыклая норма, незалежна ад таго, як яе вызначыць, знікае. Мы рухаемся да таго, што я назваў «постзвыклым часам». Гэтая хрэстаматыя апісвае развіццё тэорыі постзвыклага часу і яе вытокі ў постзвыклай навуцы, аб'ядноўваючы некаторыя ключавыя артыкулы і працы. Мая мэта – прадставіць агляд тэорыі постзвыклага часу і паказаць, як праз яе прызму можна разумець бягучыя падзеі.

«Хрэстаматыя постзвыклага часу» распавядае пра каштоўнасці палілога, які з'яўляецца найважнейшым інструментам для пошуку намі выхаду з затораў, якія пастаянна ўзнікаюць на шляху ў будучыню. Дыскурс постзвыклага часу ўсё яшчэ знаходзіцца на стадыі распрацоўкі. Такім чынам, сама «Хрэстаматыя» будзе змяняцца і развівацца з цягам часу, па меры з'яўлення новых выданняў. Але гэта заўжды будзе тэкст, заснаваны на разнастайнасці і множнасці, а таксама зборнік, у які мы з задавальненнем уключым ваш артыкул.

# ВЫТОКІ І ТЭОРЫЯ

## Навука постзвыклай эпохі

*Сільвіа О. Фунтовіч і Джэром Р. Равец*

Пасля стагоддзяў трыумфу і аптымізму навука сёння вымушана выпраўляць паталогіі сусветнай прамысловай сістэмы, аснову якой яна складае. Ужо пераадоленая даўняя дыхатамія фактаў і каштоўнасцей, а таксама ведаў і невуцтва. Навука, якая адпавядае гэтым новым умовам, будзе заснавана на здагадках аб непрадказальнасці, няпоўным кантролі і мностве цалкам імаверных перспектыў. Самай актуальнай навукай для гэтай эпохі з'яўляецца «постзвыклая».

У постзвыклай навуцы няпэўнасць не выдаляюць, ёю кіруюць, а каштоўнасці не мяркуюцца, а фармулююцца эксплiцытна. Мадэллю навуковага аргументу з'яўляецца не фармалізаваная выснова, а інтэрактыўны дыялог.

Для гэтага новага віду навукі пры ацэнцы навуковага ўкладу ў прыняцце рашэнняў патрабуецца «пашыраная супольнасць калегаў» [1]. Такое пашырэнне легітымнасці для новых удзельнікаў палітычных дыялогаў пры наяўнасці ўзаемапавагі розных пунктаў гледжання і формаў пазнання павышае верагоднасць развіцця сапраўднага і эфектыўнага дэмакратычнага элемента ў навуковым жыцці.

**Прырода ўмешваецца ў навуковую лабараторыю**

Сама прырода больш не павінна разглядацца як дзікая і пагражаючая нашаму існаванню. Наша тэхналагічнае развіццё і медыцына зрабілі прыроду прадказальнай і збольшага кіраванай. Зваротным бокам гэтага дасягнення з'яўляецца тое, што цяпер цалкам верагодна страціць баланс. Трыумф навуковага метаду прывёў да яго панавання над усімі астатнімі спосабамі пазнання. Здаровы сэнс і спадчынныя навыкі заробку і жыцця страцілі аўтарытэт. Рацыянальны падыход у прыняцці грамадствам рашэнняў павінен выглядаць "навукова". Сёння навуковая экспертыза прывяла нас да палітычных праблем, якія яна сама вырашыць няздольная.

**Цэнтральная роля няпэўнасці і якасці**

Няпэўнасць і якасць пакінулі свае пазіцыі на перыферыі навуковай метадалогіі, каб стаць цэнтральнымі, інтэгруючымі паняццямі. Новыя палітычныя праблемы маюць агульныя рысы, якія адрозніваюць іх ад традыцыйна навуковых. Яны ўніверсальныя па сваіх маштабах і доўгачасовыя па сваім уздзеянні. Дадзеныя аб іх эфектыўнасці абсалютна неадэкватныя. Самі новыя, комплексныя і зменлівыя з'явы цяжкія для разумення. Палітыка не можа грунтавацца на фактычных прагнозах.

Неабходна распрацаваць новыя метады, каб наша невуцтва стала прыдатным для выкарыстання [2]. Для гэтага неабходна радыкальным чынам адмовіцца ад тэхнічных прыёмаў, за выключэннем абмеркаванняў па метадалагічных, сацыяльных або этычных пытаннях.

**Стратэгія вырашэння праблем**

Няпэўнасць і стаўкі пры прыняцці рашэнняў з'яўляюцца процілегласцямі атрыбутаў, якія традыцыйна характарызуюць навуку, а менавіта яе дакладнасць і каштоўнасны нейтралітэт. Тэрмін «сістэмныя няпэўнасці» перадае прынцып, паводле якога праблема

крыецца ў разуменні і кіраванні рэальнасцю, якая па сваёй сутнасці з'яўляецца комплекснай. Пад «стаўкамі пры прыняцці рашэнняў» мы разумеем разнастайныя выдаткі, выгады і каштоўнасныя абавязацельствы, якія звязаны з пэўнай праблемай і ўзнікаюць у розных зацікаўленых бакоў у сувязі з ёй. Памятаючы пра гэта, можна вызначыць тры віды стратэгій пры вырашэнні праблем.

### Прыкладная навука

Апісваючы стратэгіі вырашэння праблем, пачнём з самай знаёмай: з прыкладной навукі. Яна ўжываецца ў тым выпадку, калі ўзровень няпэўнасці сістэмы і стаўкі пры прыняцці рашэнняў з'яўляюцца нізкімі. Стаўкі будуць простымі і невысокімі.

Праблема можа быць вырашана з дапамогай звычайнага падыходу, якім вырашаюцца галаваломкі. Там, дзе ўзровень нявызначанасці (няпэўнасці) і знешнія стаўкі прыняцця рашэнняў нізкія, традыцыйныя працэсы экспертнай ацэнкі праектаў і рэцэнзавання работ выдатна спрацоўваюць, нават нягледзячы на іх пэўныя недахопы.

### Прафесійнае кансультаванне

Прафесійнае кансультаванне ўключае ў сябе прыкладную навуку, але займаецца праблемамі, якія патрабуюць іншай метадалогіі для іх поўнага вырашэння. Патрабуецца выказаць асабістае меркаванне, якое заснавана на навыках больш высокага ўзроўню, а няпэўнасць, цяпер больш складаная, выходзіць на метадалагічны ўзровень. Стаўкі пры прыняцці рашэнняў таксама павышаюцца, робяцца больш комплекснымі, паколькі мэты, якія адносяцца да пэўнай задачы, будуць насіць канфліктны характар і прыцягваць розныя зацікаўленыя бакі, а таксама натуральныя сістэмы.

Прафесійныя задачы звязаны з унікальнымі сітуацыямі. Адпаведна, важным становіцца асобасны кампанент. Грамадскасць можа збянтэжыцца або расчаравацца, убачыўшы, што навукоўцы моцна разыходзяцца ў думках наконт праблемы, відаць, звязанай выключна з прыкладной навукай. Унясенне большай яснасці павінна з лішкам кампенсаваць страту містычнага налёту навуковай бязгрэшнасці.

### Постзвыклая навука

Разгледзім трэцюю разнавіднасць стратэгіі рашэння праблем, калі няпэўнасць сістэмы і стаўкі пры прыняцці рашэнняў высокія. Назавём яе «постзвыклай», паказаўшы тым самым, што дзеянні па рашэнні загадак звыклай навукі не пасуюць для вырашэння палітычных пытанняў, звязаных з рызыкамі і навакольным асяроддзем.

Постзвыклая навука мае парадаксальную асаблівасць – у яе дзейнасці па вырашэнні праблем перавернута традыцыйнае дамінаванне «неабвержных фактаў» над «мяккімі каштоўнасцямі». Гэта павінна прывесці да з'яўлення шэрагу прагнозаў, якія забяспечаць навуковы ўклад у працэс прыняцця рашэнняў. Аднак усе элементы прычыннасці знаходзяцца ў меншай ступені няпэўнасці, а чаканне, пакуль усе факты будуць сабраныя, можа стаць яшчэ адной формой неразважлівасці.

Няпэўнасць выходзіць за сістэмныя рамкі і ўключае пытанні этыкі. Новыя пытанні палітыкі звязаны з дабрабытам новых зацікаўленых бакоў, такіх як будучыя пакаленні, іншыя жывыя віды і планетарнае асяроддзе ў цэлым. Толькі дыялог паміж усімі ўдзельнікамі працэсу можа прывесці да творчага вырашэння існуючых праблем.

**Пашыраныя супольнасці роўных**

Ва ўмовах постзвыклай навукі шматлікія няпэўнасці прадуктаў і працэсаў патрабуюць павышэння адноснай значнасці людзей. Тыя, чыё жыццё і сродкі да існавання залежаць ад вырашэння бягучых праблем, атрымаюць глыбокае разуменне таго, як агульныя прынцыпы рэалізуюцца ў іх на «задворках». Ім таксама будуць прадстаўлены «пашыраныя факты», уключаючы падрабязнасці прыватнага жыцця, неафіцыйныя апытанні і афіцыйную інфармацыю, апублікаваную неафіцыйнымі крыніцамі.

**Заключэнне**

Новыя палітычныя праблемы рызык і навакольнага асяроддзя з'яўляюцца глабальнымі не толькі па сваіх маштабах, але і па сваёй комплекснасці, распаўсюджанасці і навізне ў якасці прадмета навуковага даследавання. Навуковая дзейнасць цяпер ахоплівае кіраванне няпэўнасцю, якая не змяншаецца, у сферы ведаў і этыкі, а таксама прызнанне існавання розных перспектыў і спосабаў пазнання, якія з'яўляюцца законнымі. Постзвыклым адказам будзе прызнанне названых праблем і правядзенне далейшай рэінтэграцыі з дапамогай прыняцця няпэўнасці і вітання разнастайнасці.

**Літаратура**

1. Funtowicz, S. O., Ravetz, J. R. (1991) Three types of risk assessment and the emergenceof postnormal science. In: D. Colding and S. Krimsky (eds.) *Theories of Risk*. New York: Greenwood Press.
2. Ravetz, J. R. (1990) Usable knowledge, usable ignorance: incomplete science with policy implications. In: JR Ravetz. *The Merger of Knowledge with Power*. London: Cassell.

# САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ У ПОСТЗВЫКЛЫ ЧАС

*Зіяуддзін Сардар*

«Бяда ідзе і бяду вядзе» – кажа прыказка. І апошнім часам бедаў прыходзіць усё больш і больш. Калі шматлікіх пагроз, выкліканых змяненнем клімату, не хапала, каб забяспечыць нам бяссонныя ночы, то вось вам зверху яшчэ і адна з самых жахлівых рэцэссій у гісторыі, якую мы зараз перажываем. Не паспелі мы ачуняць, паўстала пандэмія свіногa грыпу, якая пагражае паглынуць зямны шар. За ўсім гэтым маячыць энергетычны крызіс, спусташэнне прыродных рэсурсаў, пастаянная пагроза распаўсюду ядзернай зброі і тэрарызму. Мы ненавідзім банкіраў, не давяраем нашым палітыкам, пастаянна турбуемся пра захаванасць нашых працоўных месцаў, пра бяспеку нашых дзяцей і пра гаротны стан нашых супольнасцей. Няма нічога пэўнага, абсалютна гарантаванага і цалкам бяспечнага.

Сардэчна запрашаем у постзвыклы час! *Espiritu del tiempo* (дух часу) характарызуецца няпэўнасцю, хуткімі зменамі, пераразмеркаваннем улады, пераваротамі і хаатычнымі паводзінамі. Мы жывём у прамежкавы перыяд, калі старыя артадоксіі паміраюць, новыя яшчэ не нарадзіліся, і, здаецца, мала што мае сэнс. Гэты час, калі любы выбар уяўляецца рызыкоўным і вядзе да краху, калі не ў поўную бездань.

Багата з таго, што мы лічылі звыклым, штодзённым або агульнапрынятым, больш не працуе. Увесь гэты свет цяпер стаў куды больш няпэўным. Наўрад ці знойдзецца краіна, дзе палітыкам давяраюць або паважаюць іх. З-за глабальнага пацяплення нельга давяраць нават змене пораў году. Гэта эпоха множных і аднaчасовых крызісаў. Справа не проста ў тым, што справы ідуць дрэнна; яны ідуць неймаверна дрэнна, у глабальным маштабе, разнастайна і аднaчасова. Такім чынам, мы трапляем у сітуацыю, якая далёкая ад звыклай, уваходзячы ў дамен постзвыкласці.

Усе гэтыя неадпаведнасці звязаны трыма аспектамі: комплекснасцю, хаосам (бязладдзем) і супярэчнасцямі, сіламі, якія фарміруюць і прасоўваюць постзвыклы час.

**Комплекснасць**

Амаль усё, з чым мы маем справу сёння, мае комплексны характар. Комплекснасць з'яўляецца натуральным пабочным прадуктам таго факту, што большасць нашых праблем мае сусветны маштаб.

Глабалізацыя павялічвае комплекснасць не толькі за кошт таго, што мы ўзаемазалежныя, але і за кошт пашырэння нашых узаемасувязей. Нішто не існуе і не адбываецца ў ізаляцыі. Калі гэтага недастаткова, то ёсць яшчэ адзін трэнд, які ўскладняе ўсё яшчэ больш: усё мяняецца вельмі хутка, прычым змены адбываюцца адначасова. Нам цяжка зразумець з'яву комплекснасці і амаль немагчыма справіцца з ёй.

Комплекснасць дае нам важны ўрок: паняцці кантролю і вызначанасці выходзяць з моды. Сёння мы больш не можам дазволіць сабе раскошу разважаць, назіраць і адгукацца на непажаданыя вынікі, ствараючы пэўны выгляд парадку пры абмеркаванні і кіраванні.

**Хаос**

Комплекснасць з'яўляецца папярэднікам і неабходнай умовай хаосу. Хаатычныя паводзіны – не рэдкасць. Але даволі нязвыкла назіраць, як цывілізацыі, цэлыя грамадствы або нават усё насельніцтва зямнога шара паводзіць сябе ў адпаведнасці з умовамі тэорыі хаосу. Паколькі ўсё звязана і аб'яднана ў адзінае сеціва з усім, збой у любым месцы спараджае эфект даміно, парушаючы працу іншых частак сеціва, і нават разбурае яго цалкам. Больш за тое, патэнцыял для станоўчай рэакцыі велізарны. Дзякуючы мабільным тэлефонам, электроннай пошце, блогам, твітам і кругласутачным навінам мы пастаянна ў курсе падзей.

Такім чынам, мы гатовыя імгненна рэагаваць, паколькі ўзброены неабходнымі сродкамі для запуску новых мадэляў ланцужковых рэакцый.

Як і комплекснасць, хаос таксама можа даць нам фундаментальны ўрок: індывідуальная і сацыяльная адказнасць і падсправаздачнасць маюць першачарговае значэнне для нашага калектыўнага выжывання. Індывідуалізм вядзе да катастрофы.

**Супярэчнасці**

Комплексны, аплецены мноствам сетак свет з бясконцай колькасцю канкуруючых інтарэсаў і ідэалогій, з задумамі і жаданнямі, якія паводзяць сябе хаатычна, не можа зрабіць нічога іншага, як толькі адрынуць супярэчнасці. Постзвыклы час вылучае дзве супярэчнасці, якія патрабуюць нашай асаблівай увагі.

Першая тычыцца пераменаў. Усё заўжды змянялася, але змены ніколі раней не адбываліся ў гэткім паскораным тэмпе, які мы назіраем сёння. Экспанентнае паскарэнне цяпер стала нормай. Разам з тым шырокія сегменты планеты і фрагменты нашага сацыяльнага

жыцця з'яўляюцца квазістатычнымі. Чым больш мяняюцца рэчы, тым больш здаецца, што яны застаюцца ранейшымі.

Другая супярэчнасць тычыцца ведаў. У той час як нашы веды растуць, прычым як на дражджах і амаль ва ўсіх сферах, здаецца, што мы робімся большымі дэгенератамі, чым калі-небудзь раней.

Невуцтва не знікае пад уздзеяннем звыклых даследаванняў, таму мы не маем уяўлення аб яго існаванні. Такім чынам, мы сутыкаемся з патройным ударам невуцтва або, калі хочаце, невуцтвам у кубе: няведаннем нашага невуцтва, спадарожным невуцтвам у дачыненні да патэнцыйных рызык апошніх распрацовак, а таксама невуцтвам, спароджаным інфармацыйнай перагрузкай. Невуцтва патрабуе прынцыпова новых спосабаў мыслення.

**Няпэўнасць**

Калі супярэчнасці, комплекснасць і хаос злучаюцца з набраўшымі моц зменамі, адзіным пэўным вынікам яўляецца няпэўнасць. Няпэўнасць, хутчэй за ўсё, тое адзінае, у чым мы можам быць упэўнены, але пакуль яна не з'яўляецца зручнай, а таксама палітычна або сацыяльна прымальнай асновай пры прыняцці сапраўды цяжкіх рашэнняў.

Спалучэнне невуцтва і няпэўнасці, а таксама схільнасць да хаатычных паводзінаў, супярэчлівы аналіз і комплекснасць пытанняў бяспекі і рызык, – усё гэта азначае, што нашыя цяперашнія варыянты «жыцця па-старому» небяспечна састарэлі.

**Маральныя вартасці**

Неабходна дамовіцца аб шляху, які мы абярэм для руху да новых звыклых часоў. Праблема, аднак, у тым, што для ўдзелу ў кагерэнтных дэбатах стала менш прасторы, часу і жадання; усё становіцца больш складаным, супярэчлівым і хаатычным. Каб дамовіцца аб выхадзе з постзвыклага існавання, нам неабходна навучыцца пераводзіць і пераўтвараць імкненні ў змены.

Мараль, якую варта прыдбаць з характарыстык постзвыклага часу, старая як свет і паказвае на адвечныя вартасці: пакору, сціпласць і адказнасць. Пакора, сціпласць і адказнасць з'яўляюцца абавязковымі маральнымі вартасцямі, неабходнымі ўмовамі жыцця ва ўмовах няпэўнасці і складанасці. Няздольнасць прызнаць няпэўнасць і складанасць канкрэтнай сітуацыі з'яўляецца не толькі тэхнічнай, але і этычнай памылкай [1]. Сапраўды, менавіта этыка і толькі этыка можа вывесці нас з постзвыклага тупіка.

Любы сацыяльны, культурны, палітычны, філасофскі і рэлігійны светапогляд, вядомы чалавецтву, павінен зноў навучыцца ўзаемадзейнічаць са сваімі ўласнымі этычнымі прынцыпамі. Тыя этычныя дэбаты і адказнасць, якія нам неабходна ініцыяваць, павінны пачацца з прыняцця аксіёмы постзвыклага часу аб тым, што няма ніякай манаполіі на праўду. Калі няма правільных і няправільных адказаў, любы чалавек і любы пункт гледжання могуць быць карыснымі, і кожны можа ўнесці свой пасільны ўнёсак у прыняцце патэнцыйнага рашэння. Да гэтага мы павінны дадаць этычную яснасць і настрой розуму, які прызнае, што мы ўсе апантаны невуцтвам і ніхто не з'яўляецца носьбітам усіх правільных адказаў. У постзвыклых умовах гнуткасць, адаптацыя і адчувальнасць да прыкметна адрозных першапачатковых умоў патрабуюць развіцця вастрыні этычнага ўспрымання для павелічэння разнастайнасці варыянтаў адказаў.

**Уяўленне**

Найбольш важнымі фактарамі ў барацьбе з постзвыклым часам з'яўляюцца ўяўленне і крэатыўнасць.

Чаму?

Таму што ў нас няма іншага спосабу справіцца з комплекснасцю, супярэчнасцямі і хаосам. Уяўленне з'яўляецца асноўным інструментам, які вядзе нас ад простага аргументаванага аналізу да больш складанага сінтэзу. Перш за ўсё нам неабходна ўявіць шлях выхаду з постзвыклага часу.

У значнай ступені наш цяперашні тупік уяўляе сабой вынік правалу працы ўяўлення. Вядома, мы будзем вучыцца на сваіх памылках, і будучыня стане лепшай, больш квітнеючай. Але гэта небяспечная ілюзія. Варта ўявіць іншыя шляхі.

Нам неабходна этычнае ўяўленне, якое можа прызнаваць няпэўнасць і рызыкі, з якімі мы сутыкаемся. Мы павінны выкарыстоўваць у сваёй працы складанасць і разнастайнасць, клапоцячыся аб тых маральных вартасцях, у якіх мы больш за ўсё маем патрэбу. Самая выдатная надзея – што мы возьмем на сябе адказнасць за рашэнні, якія павінны будзем прыняць, што гарантуе нам дасягненне нашай уяўнай будучыні, прывёўшы да яе ўсё чалавецтва і планету ў цэласці і захаванасці.

**Літаратура**

1. Cilliers, P. (2005 г.) Complexity, deconstruction and relativism. Theory, Culture & Society, 22 (5), pp. 255-267.

# Яшчэ раз пра постзвыклы час

*Зіяуддзін Сардар*

У артыкуле «Сардэчна запрашаем у постзвыклы час» я пастараўся сінтэзаваць ідэі, вынятыя з тканіны форсайта (прадбачання) і даследаванняў перспектыў будучыні. Постзвыклы аналіз з гэтага часу распаўсюджваецца не толькі на навуку, але і на даследаванні перспектыў будучыні, палітычны аналіз, эканамічную інфармацыю, архітэктуру і культурную спадчыну.

У дадзенай працы я б хацеў з крытычных пазіцый зразумець некаторыя пярэчанні, выказаныя з нагоды папярэдняга артыкула, паспрабаваць адказаць на некаторыя з узнятых пытанняў, пазначыць асобныя характарыстыкі постзвыклага стану, вылучыць схаванае за даляглядам постзвыклае і даследаваць, што значыць «быць постзвыклым».

**Постзвыклы час і яго змест**

Відавочнае пытанне: як мы можам знаходзіцца ў постзвыклым стане, калі няма такога паняцця, як звыклая норма? Хто вызначае, што ёсць звыклым?

У постзвыклым аналізе мы лічым звыклай нормай тое, з чым часцей за ўсё сутыкаемся. Гэта тое, што ўспрымаецца як дамінуючы спосаб існавання, дзеяння і ведаў, паўсюдна разгляданы як стандарт, прадыктаваны ўмоўнасцямі і традыцыямі, якія падтрымліваюцца дысцыплінарнымі структурамі і навукай, і тое, што мы здольныя прадказаць і кантраляваць. У тэорыі постзвыклага часу (ПЗЧ) звыклая норма не працуе.

Тыя, хто займаецца тэорыяй ПЗЧ, абралі постзвыклы час па пяці асноўных прычынах. Па-першае, для яго не ўласцівыя апакаліптычныя настроі. Па-другое, ён падкрэслівае важнасць дзеяння. Па-трэцяе, ён прыцягвае і засяроджвае нашу ўвагу на комплекснасці, супярэчнасцях і няпэўнасці, якія неабходныя для рэальнага разумення таго, як змяняецца свет. Па-чацвёртае, ПЗЧ мае трывалую тэарэтычную базу. Па-пятае, тэарэтычная праца дазваляе нам распрацоўваць палітыку для мноства сфер і праблем, каб фактычна накіраваць постзвыклы час у бок станоўчых перспектыў будучыні.

Ракеш Капур [1] сцвярджае, што ПЗЧ з’яўляецца заходняй тэорыяй і канцэпцыяй. Дадзенае сцвярджэнне далёка ад ісціны. Па-першае, межы Усходу і Захаду не толькі змяніліся, але сталі размытымі і нераспазнавальнымі. ПЗЧ не з’яўляецца ні заходняй, ні ўсходняй канцэпцыяй. Гэта проста тэарэтычная база, якая апісвае і тлумачыць нашу эпоху.

А як наконт аргументу, што мы сутыкаліся з падобнымі перашкодамі і «дзіўнымі часамі» у мінулым? Як сцвярджае Сэм Коўл [2], улічваючы нашы «дастатковыя схаваныя рэзервы ведаў» і вышэйшы эвалюцыйны стан, мы можам вырашыць усе нашы праблемы і, такім чынам, павінны працягваць рухацца ў тым жа кірунку. Гэта, як адзначае Мэрыл Він Дэвіс, «аптымізм манументальнага характара, заснаваны на здагадцы, што, паколькі нам удавалася вырашаць нашы праблемы ў мінулым, мы будзем працягваць рабіць гэта заўсёды» [3]. Традыцыйныя дысцыпліны з'яўляюцца часткай праблемы, паколькі менавіта яны давялі нас да цяперашняга праблемнага стану, і многае з таго, што спарадзіла сучаснасць, пагружана ў невуцтва. Мы ніколі не сутыкаліся з такой колькасцю праблем адначасова. Мы ніколі не адчувалі такіх паскораных тэмпаў перамен і не мелі такіх глабальных узаемасувязяў і комплекснасці. І мы ніколі не былі настолькі пагружаны ў невуцтва адносна рэчаў, якія маюць такія далёкасяжныя наступствы, што выходзяць за рамкі нашага ўласнага кантэксту.

Але ж сістэма, якая не аб'яднаная ў сетку альбо поўная ўнутраных супярэчнасцей, не можа дэманстраваць хаатычныя паводзіны і ператварыцца ў постзвыклую, ці не так? Адказ на гэтае пытанне палягае ў адказе на іншае пытанне, пастаўленае Мэрыл Він Дэвіс: «А мы ўжо прыбылі ў пункт прызначэння?» І так, і не. Постзвыкласць не з'ўляецца аднастайнай з'явай: яна не надыходзіць адначасова ва ўсіх кутках планеты. Так што не ўвесь свет ператварыўся ў постзвыклы, але любая частка зямнога шара можа стаць такой.

**Постзвыклы стан**

Постзвыклы стан уяўляе сабой асаблівы лад існавання, у якім мы знаходзімся. Мы сутыкаемся з праблемамі, якія моцна адрозніваюцца па сваіх маштабах, яны ўзаемазвязаны і ўбудаваны ў нарастаючыя тэмпы перамен. Маштаб, сеткавая арганізаванасць і паскарэнне спараджаюць комплекснасць, хаос і супярэчнасці (КХС) ПЗЧ, якія вядуць нас да няпэўнасці і невуцтва.

Нядаўнія палітычныя падзеі прадэманстравалі, што мы больш не маем справу з ізаляванымі паслядоўнасцямі падзей, лакальнымі па сваёй прыродзе, вызначанымі ў часе, кранаючымі жменьку людзей ці невялікую супольнасць і парушаючымі нязначную колькасць працэсаў. Наадварот, ва ўмовах постзвыкласці падзеі і сітуацыі хутка развіваюцца, робячыся хаатычнымі і ахутваючы ўвесь свет.

### Пашыраны цяперашні этап постзвыклага часу

Бліжэйшым часам постзвыкласць будзе павялічвацца. У тэорыі постзвыклага часу мы называем гэта «пашыраным цяперашнім часам», то бок гэта бліжэйшая будучыня, якая будзе фарміравацца пад уплывам сталых трэндаў і падзей, якія можна вылучыць сёння. Трэнд – не прысуд. Але калі гэтыя трэнды захаваюцца, мы абавязкова апынемся ў свеце, які робіцца ўсё больш постзвыклым.

Варта адзначыць, што ў розных сітуацыях КХС працуюць па-рознаму. У адным выпадку самым значным складнікам можа быць комплекснасць, у іншых – гэта можа быць хаос або супярэчнасць. Але, у цэлым, па меры таго як КХС набіраюць абароты і растуць, адбываецца іх аб'яднанне, што вядзе да ўзнікнення постзвыклай сітуацыі.

### «Будзь постзвыклым»

Дык як жа нам справіцца з постзвыклым часам? Як можна рухацца наперад, не робячыся ахвярай хаосу? Як нам выжыць ва ўмовах росту няпэўнасці і розных відаў невуцтва, з якімі мы сутыкаемся? Адказы на гэтыя і многія іншыя пытанні, якія ўзніклі ў постзвыклы час, пачынаюцца з іх усведамлення і вядуць да творчага падыходу і ўжывання ўяўлення.

Нам неабходна ведаць, што мы не можам кіраваць постзвыклым часам і кантраляваць яго, але мы можам арыентавацца ў ім. Нам неабходна ўлічваць той факт, што тыя шматлікія праблемы, якія адначасова абрынаюцца на нас, нельга вырашаць у ізаляцыі адна ад адной: разглядаючы адну праблему, вы таксама павінны бачыць і ўсе астатнія праблемы, з якімі яна ўзаемазлучаная. Такім чынам, плюралізм, разнастайнасць і множнасць перспектыў неабходныя для разумення і кіравання постзвыклымі ўмовамі.

Ведаць аб гэтай рэчаіснасці значыць «быць постзвыклым».

Амаль усе змены, якія адбываюцца ў постзвыклы час, маюць глыбокія этычныя канатацыі. Этыка тычыцца не толькі быцця ў свеце, але і быцця *разам* са светам. Яна тычыцца пытання аб тым, як мы звязаны з астатнім светам. Даследаванне перспектыў будучыні не абмяжоўваецца тым, што можа адбыцца ў будучыні. Яна павінна ў значнай ступені тычыцца таго, што павінна быць зроблена для захавання здаровай, этычнай будучыні.

Магчыма, самым фундаментальным зрухам, які будзе вызначаны постзвыклым часам, стане адкрыццё сілы азначэння. Сапраўдная ўлада Захаду грунтавалася на яго здольнасці даваць дэфініцыі ключавым канцэпцыям чалавецтва і чалавечага грамадства. Але

постзвыклы час сцвярджае, што «тэрмін прыдатнасці» гэтых азначэнняў мінуў. Таму ў справу ўступаюць творчы падыход і ўяўленне.

Творчы падыход і ўяўленне неабходна выкарыстоўваць, каб даць новыя азначэнні ўсяму, ад мастацтва і да архітэктуры, ад палітыкі да стратэгіі, ад навукі да духоўнасці, а таксама каб вызначыць, што значыць быць чалавекам у постзвыклы час. Нам усім варта ўзяць прыклад канадскай музычнай эксперыментальнай групы Post Normal, перавярнуўшы ўслед за імі старонку мінулага. У сваёй песні «Арктычная кроў і лёд» яны спяваюць, што з нашымі часамі адбываецца штосьці жудасна няўяўляльнае, але ў нас абавязкова атрымаецца дамагчыся лепшых вынікаў.

**Літаратура**


1. Kapoor, R. (2011) Is there a postnormal time? From the illusion of normality to thedesign for a new normality. *Futures*, 43, pp. 216-220.
2. Cole, S. (2011) Alliterative Logic: A Theory of Postnormal Times. *Futures*, 43 (2), March, pp. 209-215.
3. Davies, M.W. (2011) Postnormal Times: Are We There Yet? *Futures*, 43 (2), March, pp. 136-141. URL: http: alexander-cyberwar/all/


# МЕТАДЫ І ПЫТАННІ

## «Тры заўтра» постзвыклага часу

*Зіяуддзін Сардар і Джон А. Суіні*

**Уводзіны**

У святле далёка ідучых, хуткіх і сінхронных змяненняў ўзнікае новае важнае пытанне для футуролагаў, даследчыкаў форсайта і практыкаў: ці могуць існуючыя метады справіцца са складанымі, хаатычнымі, супярэчлівымі, няпэўнымі і нетрывалымі перспектывамі будучыні? Традыцыйна дысцыпліна «Даследаванні перспектыў будучыні» разглядае мноства альтэрнатыўных варыянтаў будучыні, праводзячы адрозненне паміж пэўнай, верагоднай, магчымай і жаданай будучыняй [1]. Але што можа быць верагодным у свеце, дзе няпэўнасць і хаос сталі нормай? А што можа быць пэўным у будучыні, у якой дамінуюць супярэчнасці? Ці пасуюць нашы традыцый-

ныя метады, такія як прагназаванне, сцэнарнае планаванне і мадэляванне, для мэтаў постзвыклага часу? Ці ўлічваюць сцэнары будучыні змены пераменаў? Ці даюць магчымасць існуючыя метады мадэлявання сцэнарыяў адэкватна ўлічваць неабходныя для супрацьстаяння ўплыву постзвыклага часу (ПЗЧ) плюралізм і палілог, у тым ліку сярод людзей, не-людзей і нечалавекападобных? Як мы распрацоўваем жыццяздольныя правілы для арыентацыі ў постзвыклым часе?

Існуючыя на сённяшні дзень метады даследаванняў перспектыў будучыні прымальныя, але маюць істотныя абмежаванні, асабліва адносна таго, што тычыцца ПЗЧ. Мы лічым, што сапраўдныя метады даследаванняў перспектыў будучыні не паспяваюць за тымі чыннікамі і рухаючымі сіламі, якія сапраўды парушаюць плаўны рух сучаснасці і падштурхоўваюць нас да *несвядомай* будучыні *(unthought futures)*.

Што трэба? Палілог рознай колькасці ўдзельнікаў і меркаванняў [2]. Палілог азначае «множныя логікі, выступленні і быццёвасць» [3]. Як бачым, палілог патрабуе стварэння новых фізічных і ментальных прастораў, у якіх разнастайнасць, плюралізм і супярэчлівыя перспектывы існуюць на сваіх уласных умовах, але пры гэтым яны глыбока зацікаўлены ў прыцягненні іншых да творчасці, абмену і набыцця ведаў. У дадатак да пошуку лепшых і больш эгалітарных спосабаў дзяліцца тым, што мы ведаем або як мы гэтыя веды атрымліваем, неабходна пастаянна шукаць заснаваныя на партнёрстве дынамічныя сродкі для дэталізацыі нашых гісторый і абмену імі. Любы аналіз сучаснасці і перспектыў будучыні таксама павінен прызнаваць, што многае з таго, што сёння мы лічым само сабой зразумелым, пасля стане дзіўным.

### Звыклая норма, постзвыкласць, постзвыклае спаўзанне і выбух

Першы дзіўны факт, які мы мусім прызнаць, заключаецца ў тым, што звыклая норма і постзвыкласць перакрываюцца і суіснуюць адна з адной. Шматлікія «звыклыя» сістэмы перастануць рана ці позна працягваць працаваць «як звычайна» у постзвыклы час, а комплекснасць – хаос – супярэчнасці (КХС) акажуць на іх прамы або ўскосны ўплыў. Само паняцце звыклай нормы выглядае некалькі дзіўна, асабліва для ПЗЧ. Адназначна, гэта – «сфабрыкаваныная звыклая норма» [4]. Яе сфабрыкаванасць у тым, што падобныя нормы былі распрацаваны магутнымі міжнароднымі інстытутамі і арганізацыямі, якія функцыянуюць, абапіраючыся на рынкавыя сілы, унутраныя, бясспрэчныя здагадкі і тонкія маніпуляцыі для стварэння ідэалагічных і спажывецкіх жаданняў і мараў.

Сфера сфабрыкаванай звыклай нормы (ССЗН) служыць інструментам пераарыентацыі нашага ўспрымання таго, што з'яўляецца і што не з'яўляецца звыклым. Як сфера, якая пашыраецца і сціскаецца адносна нашай індывідуальнай або грамадскай скіраванасці, ССЗН фарміруецца сіламі невуцтва і няпэўнасці.

«Звыклыя» з'явы рухаюцца да постзвыкласці праз працэс постзвыклага спаўзання (ПЗС). Хоць сілы, якія кіруюць ПЗС, могуць быць даволі магутнымі, не ўсе паддаюцца ўплыву гэтых моцных плыняў. Ёсць тыя, хто не можа ўбачыць ці, хутчэй, ігнаруе і абвяргае з'яўленне ПЗС. Яны пакутуюць на постзвыклае адставанне (ПЗА), гэта значыць перцэпцыйны стан адмаўлення. Такім чынам, ПЗА з'яўляецца станам непрызнання, які можна пераадолець толькі з дапамогай постзвыклага выбуху (ПЗВ). Гэта калі цалкам уся сістэма робіцца постзвыклай і няма дзе ад гэтага схавацца.

**Тры заўтра асноў постзвыклага часу**

Улічваючы дзіўныя асаблівасці нашай эпохі, вывучэнне перспектыў будучыні ў рамках ПЗЧ ставіць перад намі канкрэтныя задачы. Нам неабходна засяродзіцца на сінхроннасці і складанасці, а таксама на дынамічнай прыродзе ПЗЧ. Нам неабходна ўлічваць і няпэўнасці, і розныя узроўні невуцтва, а таксама выкарыстоўваць як мага больш уяўлення і творчасці ва ўсёй нашай дзейнасці. «Тры заўтра постзвыклага часу» («тры З») – гэта структура, якую мы распрацавалі для разумення і арыентацыі ў ПЗЧ, а таксама для вывучэння будучыні.

***Пашыраная сучаснасць*** – першае заўтра. Менавіта яго мае на ўвазе большасць людзей, кажучы пра «чаканую будучыню». У пашыранай сучаснасці пераважаюць трэнды і наспяваюць праблемы або «слабыя сігналы», якія немагчыма спыніць. Яны проста пашыраюць і падаўжаюць сучаснасць. Лепшае, што мы можам зрабіць у дадзенай сітуацыі, – паглядзець скрозь прызму ПЗЧ, каб ідэнтыфікаваць тыя сістэмы, якія могуць альбо набліжацца да постзвыкласці, альбо ўжо быць на мяжы ПЗЧ.

За *пашыранай сучаснасцю* следам ідзе ***звыклая будучыня*** (і яе варыянты), якая здаецца знаёмай, паколькі перадаецца вобразамі і ўяўленнямі пра будучыню і знаёмымі нам перспектывамі, сярод якіх могуць быць як заснаваныя на фактычных дадзеных прагнозы, так і навуковая фантастыка. Трэнды, убудаваныя ў *пашыраную сучаснасць*, разам з вобразамі рэкламы, карпаратыўным бачаннем, папулярнымі «футуралагічнымі» і навукова-фантастычнымі раманамі, фільмамі і тэлевізійнымі шоў, экстрапалююцца і праецыруюцца для стварэння карціны будучыні, якая занадта добра знаёмая.

За *знаёмай будучыняй* (і яе варыянтамі) ідзе ***неверагодная будучыня*** (і яе варыянты), гарызонт чыстай магчымасці. *Неверагодная будучыня* – не цалкам недаступная для думкі, а гарызонт, за якім штосьці заўжды застаецца недаступным для свядомасці. Неверагодная будучыня – гэта не проста тое, што не чакаецца ці не мяркуецца, а хутчэй тое, што знаходзіцца па-за рамкамі звыклага мыслення.

### Невуцтва, няпэўнасць і звярынец постзвыклых магчымасцей

У кожнага заўтра ёсць свой канкрэтны тып няпэўнасці і невуцтва. Найбольш базавая разнастайнасць фактараў няпэўнасці ўзнікае ў тым выпадку, калі вядомы кірунак змены, але ацэнка велічыні і верагоднасці падзей і наступстваў немагчымая. Гэтая сітуацыя характэрная для *пашыранай сучаснасці*. Мы называем гэта ***павярхоўнай няпэўнасцю***, якой у пэўнай ступені можна кіраваць з дапамогай адэкватных ведаў і інструментаў форсайта. У выпадку *знаёмай будучыні* перад намі паўстае шырокі спектр альтэрнатыў і мноства магчымых варыянтаў будучыні. Але мы ведаем, што многія з гэтых перспектыў будучыні з'яўляюцца проста праекцыяй агульнапрынятых вобразаў канкрэтнай будучыні. Дадзены варыянт уяўляе сабой ***неглыбокую няпэўнасць***.

І нарэшце, *неверагодную будучыню* (і варыянты), у якой можа здарыцца ўсё што заўгодна і ўсё невядома, уяўляе сабой ***глыбінную няпэўнасць***. У дадзеным выпадку мы не ведаем не толькі накіраванасць, параметры і наступствы зменаў, але і няздольныя зразумець, што адбываецца з сістэмай, бо наш светапогляд і эпістэмалогія цалкам неадэкватныя.

Кожны тып няпэўнасці звязаны з асаблівай катэгорыяй невуцтва. Па-першае, ***простае***, ці ***звычайнае невуцтва*** (пазначаецца як $Н^1$). Гэты від невуцтва можна пераадолець, разабраўшыся са складанымі сеткамі або прызнаўшы права на адначасовае існаванне «ісцін» дзеючых асоб з супярэчлівымі кропкамі гледжання. Гэта пануючы варыянт невуцтва *пашыранай сучаснасці*: яно можа быць пераадолена або зменшана з дапамогай навучання, даследаванняў, паважлівага стаўлення да думкі іншых і пастаноўкай правільных пытанняў. *Знаёмая будучыня* дае нам больш глыбокае невуцтва, калі мы нават не ведаем, якія пытанні варта задаваць. Мы называем яго ***пераадольным невуцтвам*** (пазначаецца як $Н^2$). Сёння яго нельга пераадолець шляхам навучання, паколькі няма чаму вучыцца, але яно стварае разуменне таго, што мы не ведаем і павінны імкнуцца даведацца ў будучыні. І далей ідуць, вядома ж, «невядомыя невядомыя» Рамсфелда: «Тое, што мы не ведаем, што мы не ведаем» [5]. Яно звязана з *глыбокай няпэўнасцю неверагоднай будучыні* (і яе варыянтаў) і класіфікуюццаецца як ***непераадольнае невуцтва*** (пазначаецца як $Н^3$).

Постзвыклыя з'явы лягчэй за ўсё бачныя ў пашыранай сучаснасці. Яны падобныя да ***чорнага слана*** ў пакоі, якога альбо ніхто не бачыць, альбо лічыць за лепшае ігнараваць. Чорны слон, адзначае Вінай Гупта, «гэта падзея, якая вельмі верагодна і шырока прадказваецца экспертамі, але людзі спрабуюць выдаць яго за чорнага лебедзя, калі яна нарэшце адбываецца» [6].

***Чорны лебедзь***, папулярны вобраз Насіма Талеба, адлюстроўвае сутнасць *знаёмай будучыні*. Нават эксперты не ў стане заўважыць і пазначыць чорных лебедзяў. Яны з'яўляюцца «з-за вугла», на роўным месцы, адзначае Талеб. Яны «вельмі адчувальныя да пралікаў, іх, як правіла, сур'ёзна недаацэньваюць, а часам сур'ёзна пераацэньваюць» [7]. Чорныя лебедзі могуць несці станоўчы эфект, гэта значыць, іх уздзеянне можа адкрыць раней немажлівыя магчымасці. Аднак яны таксама могуць аказваць адмоўны ўплыў і служыць сігналам для з'яўлення ПЗС або ПЗЧ.

Постзвыклыя з'явы нялёгка разгледзець у неверагоднай будучыні. Постзвыклы патэнцыял неверагоднай будучыні ўяўляецца намі пры дапамозе ***чорных медуз***. Чорныя медузы – чыннікі, якія аказваюць «моцнае ўздзеянне». Але самі па сабе яны з'яўляюцца «звыклай» з'явай, якая ператвараецца ў постзвыклыя дзякуючы станоўчаму выніку.

Чорныя медузы паказваюць на тое, як звыклыя сітуацыі і падзеі робяцца постзвыклымі, як яны змяняюцца шляхам мутацый праз ПЗА, становячыся ўзаемазлучанымі, аб'яднанымі, комплекснымі і супярэчлівымі.

Усіх разам, *чорных сланоў, чорных лебедзяў і чорных медуз* мы называем *«звярынцам постзвыклых магчымасцей»* (звярынец). Наш звярынец, як мы лічым, падобны да ансамбля, чые дзеянні кідаюць выклік глыбока ўкаранёным перакананням, выяўляюць замацаваныя супярэчнасці і абуджаюць новыя ідэі.

**Праца з "трыма З"**

Рамкі "трох З" маюць тры спецыфічныя функцыі: (1) дапамагчы нам даследаваць альтэрнатыўныя варыянты будучыні з акцэнтам на множнасць і постзвыклыя магчымасці; (2) крытычна паставіццада да існуючых прагнозаў і экстрапаляцыі; і (3) структураваць і сфарміраваць палітыку, спецыяльна прызначаную для арыентавацыі ў постзвыклы час.

Фарміраванне палітыкі, якая дапамагае справіцца з ПЗЧ, патрабуе прыняцця прасторава-часавай сінхроннасці "трох З". У сукупнасці тры разнавіднасці невуцтва і няпэўнасці, а таксама звяры-

нец паказваюць на ПЗА, працэс, з дапамогай якога звыклыя рэчы і падзеі становяцца хаатычнымі, ператвараючыся ў постзвыклыя.

Мэта *постзвыклай палітыкі* (ПЗП) – падвесці нас да ўсведамлення невуцтва ў трох яго разнавіднасцях, дапамагчы зразумець комплекснасць і звязаныя з ёй няпэўнасці, навучыць апярэджваць постзвыклыя магчымасці і, такім чынам, намеціць жыццяздольны, хоць, магчыма, і непрыемны шлях наперад.

**Месца “трох З” у даследаванні перспектыў будучыні**

У той час як дысцыпліна «Даследаванні перспектыў будучыні» падкрэслівае альтэрнатывы, многія метады даследаванняў перспектыў будучыні і форсайта рэдка спыняюцца на плюралізме і разнастайнасці, і толькі нешматлікія падкрэсліваюць дынамічны і аб’яднаўчы характар магчымасцей вар’іравання будучыні. Структура “трох З” прапаноўвае шматузроўневы падыход, які можа служыць карысным інструментам крытыкі і крытычнага вывучэння перспектыў будучыні. “Тры З” таксама можа служыць аналітычным інструментам для выяўлення і кантэкстуалізацыі трэндаў, наспеўшых праблем і ўяўленняў пра будучыню (або пра варыянты будучыні). Мы лічым, што “тры З” можа дапоўніць многія іншыя метады і даследаванні перспектыў будучыні як дысцыпліны.

У ПЗЧ пашырэнне межаў праўдападобнага патрабуе новага тыпу мыслення, які напрамую звязаны з творчасцю і ўяўленнем, і мы павінны навучыцца спраўляцца з комплекснасцю і няпоўным веданнем. Наш падыход павінен быць і радыкальным, і памяркоўным, каб быць рэалістычным і эфектыўным. Гэта той напрамак, па якім у канчатковым выніку вядзе нас структура “трох З”, – наперад, да *неверагоднага.*

**Літаратура**


1. Henchey, N. (1978) Making Sense of Futures Studies. *Alternatives: Perspectiveson Society and Environment*, Winter.
2. Kristeva, J. (1977) *Polylogue*. Paris: Seuil.
3. Chen, H. (2010) The Concept of the ‘Polylogue’ and the Question of ‘Intercultural’ Identity. *Intercultural Communication Studies*, vol. XIX, no. 3, pp. 54-64.
4. Rao, V. (2012) Welcome to the Future Nauseous, ribonfarm: experiments in refactored perception, 09 May. URL: http://www.ribbonfarm.com/2012/05/09/welcome-to-the-future-nauseous / (Accessed: 10 April 2015).
5. Morris, E. (2014) *The Unknown Known*. Participant Media.
6. Gupta, V. On Black Elephants. URL: http://vinay.howtolivewiki.com/blog/flu/on-black-elephants-1450 (Accessed: 27 April 2009).
7. Taleb, N.N. (2007) *The Black Swan: The Impact of the Highly Improbable.* New York: Random House.

# Заразлівая ўзаемазвязанасць: ілюстрацыя «трох заўтра»

*Джон А. Суіні*

Да 2011 года мястэчка Лерой, штат Нью-Ёрк, было вядомы выключына тым, што з'яўлялася радзімай знакамітага амерыканскага жэлацінавага дэсерту *«Jell-O»*. Але ўсё змянілася, калі група падлеткаў сярэдняй школы (Leroy High School) стала дэманстраваць некантралюемыя спазмы, цікі, курчы і заіканне. Дыягназ: масавае псіхагеннае расстройства (МПР). Раннія справаздачы адзначаюць, што першая група пацярпелых падлеткаў глядзела розныя відэа на YouTube і імітавала убачанае. Доктар Дэвід Ліхтэр пракаментаваў: «Я думаю, такое цалкам верагодна можа адбыцца з людзьмі, якія выходзяць у інтэрнэт і назіраюць за паводзінамі іншых. Я таксама думаю, што цалкам верагодна распаўсюджванне ўплыву дадзенай з'явы за межы прамой кантактнай групы» [1].

Прадчуванне доктара Ліхтэра, відаць, спраўдзілася, калі ў Мардж Фітцсімманс, 36-гадовай медсястры, якая не мела непасрэднага кантакту ні з адным з пацярпелых школьнікаў, пачалі праяўляцца тыя ж сімптомы. Доктар Роберт Барталамью звяртае ўвагу на злавесную патэнцыйную магчымасць, кажучы наступнае: адным са «значна больш маштабных і глабальных эпізодаў (калі толькі мы хутка не зразумеем, як сацыяльныя медыя гэта робяць) з'ўляецца іх роля ў якасці асноўнага вектару і агента распаўсюду канверсійнага расстройства ўпершыню за ўсю гісторыю чалавецтва» [2].

Сімптомы псіхічных захворванняў не з'яўляюцца сталымі і нязменнымі, але могуць быць мадыфікаваны шляхам змены культурнага асяроддзя. Калі культурны фон з'яўляецца чыннікам, які спрыяе ўзнікненню такіх інцыдэнтаў, як яго разуменне можа дапамагчы высвятленню таго, што адбылося ў Лероі?

Афект стаў папулярным паняццем сярод тэарэтыкаў, паколькі паказвае на ўласцівую нам пластычнасць як «порыста-адкрытых сістэм» [3]. Афект вядзе да мноства сацыяльных і палітычных наступстваў. Найбольш глыбокім з іх з'яўляецца тое, што наш мозг і цела настолькі моцна ўспрымальныя да шэрагу эпігенетычных сіл, што самі катэгорыі, якія выкарыстоўваюцца для абазначэння індывідуальнасці, у лепшым выпадку неадназначныя, калі не зусім адвольныя. «Заразлівая ўзаемазвязанасць» выяўляецца ў неадчэпным жаданні праверыць сваю электронную пошту, у жаданні націснуць функцыю

абнаўлення на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы, якую вы толькі што загрузілі.

Ці можа афект растлумачыць выбух у Лероі? Ці можа сусветнае павуцінне (WWW) заразіць каго-небудзь? Ці можна скарыстацца заразлівай узаемазвязанасцю ці нават ператварыць яе ў зброю? Выкарыстоўваючы аб'ектыў постзвыклага часу для даследавання заразлівай узаемазвязанасці сусветнага павуціння, у дадзенай працы прымяняецца новы форсайт-метад для вывучэння наспяваючых сіл і праблем, якія будуць падштурхоўваць і вызначаць развіццё WWW у наступныя гады.

**Наколькі постзвыклымі з'яўляюцца часы?**

У рэшце рэшт, постзвыклы час патрабуе новых спосабаў даследавання і аналізу, хоць бы для таго, каб справіцца з хаосам, супярэчнасцямі і комплекснасцю жыцця ў эпоху непакорлівай няпэўнасці і ўсё больш хуткіх зменаў. «Тры заўтра» (“тры З”) з'яўляюцца метадам для мадэлявання гэтай дынамікі і забеспячэння больш надзейнай асновы і падыходу для даследаванняў перспектыў будучыні. Метадалогія “трох З” выкарыстоўвае пэўную з'яву або кірунак (у нашым выпадку афект і WWW) для даследавання магчымасцей, якія могуць чакаць нас наперадзе. Такім чынам, сцэнары, створаныя з выкарыстаннем метаду “трох З”, надаюць асноўную ўвагу наспеўшым праблемам і накіраваныя на тое, каб закрануць раней *немажлівыя* праблемы і пытанні.

**Чорныя сланы *пашыранай сучаснасці***

У 2013 годзе адзін сайт онлайн-купонаў правёў апытанне сярод 2403 бацькоў аб выкарыстанні гаджэтаў маленькімі дзецьмі. 86% рэспандэнтаў прызналіся, што выкарыстоўвалі смартфон для заспакаення дзіцяці, калі яно плакала, або ў якасці нянькі [4]. Амерыканская акадэмія педыятрыі рэкамендавала бацькам «не даваць дзецям узростам менш за 2 гады праглядаць інфармацыю на экране» [5]. Паколькі рост паўсюднага выкарыстання смартфонаў і планшэтаў – з'ява параўнальна новая, няма ніводнага фундаментальнага даследавання, якое магло б абгрунтаваць ці проста вылучыць гіпотэзу аб наступствах знешняга ўздзеяння або афектаў. Якая заразлівая ўзаемазвязанынасць можа паўстаць у выніку падобнага роду ўмяшанняў?

**Чорныя лебедзі перспектыў *знаёмай будучыні***

Няма недахопу ў сцэнарах будучыні адносна інтэрнэту. Большасць вобразаў інтэрнэту будучыні засяроджана на доступе,

паслугах і інфраструктуры, чорныя лебедзі дадзенага гарызонту павіненны прызямліцца ў галіне канвергенцыі патэнцыйных афектаў WWW. Улічваючы шырокую цікавасць да сек'юрытызацыі (павышэння абароненасці) інтэрнэту, – ад захаванасці асабістай канфідэнцыйнай інфармацыі да вядзення кібервойнаў, – стварэнне метасімвала, які можа стаць штуршком да знаёмай будучыні (і яе варыянтаў), мае вырашальнае значэнне ў гэтай галіне.

Збігнеў Бжэзінскі прапануе шырокі спектр магчымасцей у будучыні. Бжэзінскі піша: «Цалкам магчыма выкарыстоўваць у стратэгічна-палітычных мэтах вынікі даследаванняў мозга і паводзін чалавека. <...> "Можна было б распрацаваць сістэму, якая магла б сур'ёзна пагоршыць працу мозга вялікіх груп насельніцтва ў пэўных рэгіёнах на працяглы час" <...>» [6].

«Яшчэ адзін катастрафічны тэракт вядзе не толькі да перамогі палітыкі адсочвання ўсёй нейроннай інфармацыі, але і узаконьвае стратэгію кантролю свядомасці праціўніка па законах ваеннага часу. Змяняючыя свядомасць наркотыкі і узятыя на ўзбраен-не нейронныя тэхналогіі становяцца стандартамі ваенных аперацый» [7]. Што, калі ўвага недзяржаўных суб'ектаў пераключыцца з забеспячэння бяспекі ядзернай, біялагічнай і / або кіберзброі на нелегальную нейрасаматычную зброю? Ці можна выкарыстоўваць сацыяльныя сеткі ў якасці зброі?

### **Чорныя медузы перспектыў *неверагоднай будучыні***

За апошняе дзесяцігоддзе насельніцтва Грын-Бэнка ў Заходняй Вірджыніі павялічылася да 147 жыхароў. Усе апошнія дасягненні цывілізацыі забаронены на тэрыторыі пасёлка з-за яго размяшчэння ў Нацыянальнай зоне радыёмаўчання (National Radio Quiet Zone). Як людзі могуць жыць без доступу да WWW?

Хоць электрамагнітная звышадчувальнасць (ЭЗА) застаецца непрызнаным медыцынскім сімптомам, многія паведамляюць пра фізічныя немачы, асновай якіх з'яўляецца рознай ступені адчувальнасць да электрамагнітных палёў (ЭМП). Калі ахвяры ЭЗА насамрэч не пакутуюць адчувальнасцю да ЭМП, а проста ўспрымаюць яго прысутнасць на ментальным узроўні, тады востры нейрасаматычны стан з'яўляецца паталогіяй, іншымі словамі, эфектам заразлівынай сувязі.

А што, калі ўзнікне станоўчая зваротная сувязь, заснаваная на ўспрыманні эфекту ЭМП? Можа, варта пашырыць Нацыянальную зону радыёмаўчання? Ці магчыма ператварэнне пацярпелых у бежанцаў? Як нацыянальныя і міжнародныя інтарэсы могуць сутыкнуцца і канкураваць у сферы грамадскай аховы здароўя? Відавочна, падобныя

пытанні цалкам верагодныя, але іх патэнцыяльныя наступствы патрабуюць ад нас зірнуць у твар немажліваму.

**Сцэнары**

*Пашыраная сучаснасць*

У выніку загадкавай пандэміі тысячы дзяцей у 27 краінах дэманструюць шэраг анамальных формаў паводзін: ад некантраляваных спазмаў да амаль кататанічных станаў. Адзіным агульным фактарам, які звязвае ўсіх пацярпелых, з'яўляецца выкарыстанне мабільнага дадатка для вывучэння мовы ў раннім дзяцінстве, які стаў сусветна папулярным у 2018 годзе. Да сярэдзіны 2019 года быў зарэгістраваны мільён загрузак дадатку, хоць медыкі адразу забілі трывогу ў дачыненні да бескантрольна ўцягвальнага інтэрфейсу і залежнасці, выкліканай гульнявым працэсам. Расследаванне, якое ажыццяўляецца Цэнтрам па кантролю за захворваннямі, пакуль не дало ніякіх пераканаўчых вынікаў, і палітычным лідарам даводзіцца праводзіць шматлікія слуханні, каб супакоіць разгневаных выбаршчыкаў.

*Знаёмая будучыня*

Услед за публікацыяй тысячы сакрэтных урадавых дакументаў пасля чарговага скандалу з выкрывальнікамі, адно паведамленне зноў распаліла гнеў засмучаных бацькоў, якія страцілі сваіх дзяцей падчас загадкавай пандэміі больш за дзесяць гадоў таму. Адзначаючы ўдзел ураду ў садзейнічанні даследаванням і распрацоўцы тэхналогіі нейраафектыўных маніпуляцый праз шэраг інтэрфейсаў сеткавых СМІ, якія пазней былі выкарыстаныя для стварэння інавацыйных дадаткаў па навучанні дзяцей, у згаданым паведамленні таксама адзначаецца, што тая тэхналогія была часткай кэша дадзеных, страчаных падчас маштабнай кібератакі ў 2028 годзе. Сітуацыя пагаршаецца тым, што вядомая ў рэгіёне экстрэмісцкая групоўка абвясціла пачатак новай эры баявых дзеянняў, голасна заявіўшы, што «новая зброя» забяспечыць ім перамогу і дазволіць наносіць буйнамаштабныя наступальныя ўдары за мяжой.

*Неверагодная будучыня*

Калі агенцтвы навін пачалі паведамляць пра змест адноўленага відэа ад адной экстрэмісцкай групоўкі, якая заяўляла пра парыхтоўку нападу на Нью-Ёрк з выкарыстаннем неператорнай, нябачнай зброі, грамадства апанаваў страх. Паніка, якую падмацоўвалі нястрымныя спекуляцыі і асцярогі з-за падазроных выбухаў розных захворванняў у нядаўнім мінулым, а таксама шкоднай

інфармацыі з мноства выпадкова рассакрэчаных дакументаў, ператварылася ў фобію. Тысячы людзей пачалі звяртацца па медыцынскую дапамогу з нагоды розных сімптомаў, хоць большасць з іх былі здаровыя. Інтэрнэт-групы падтрымкі пацярпелым раслі ў геаметрычнай прагрэсіі, а іх дзейнасцю кіравала гіпотэза аб тым, што самаабарона ад электронікі, асабліва ад прылад з доступам у інтэрнэт, прынясе палёгку. Тое, што пачыналася як міграцыя некалькіх сем'яў, хутка ператварылася ў ад'езд тысяч у пошуках прытулку.

**Падштурхоўваючы і ўзважваючы перспектывы будучыні**

Як і сеткі, заражаныя кампутарным вірусам, чалавецтва, якое ўцягвае ўсё і ўся, таксама схільнае да няшчасных выпадкаў. Аднак інтэрпрэтацыя афекту як выпадковасці з'яўляецца толькі адным з варыянтаў прачытання развіцця дынамікі ўспышкі масавага псіхагеннага расстройства ў Лероі. Гэта вылілася ў шэраг магчымых варыянтаў: доступ дзяцей да інтэрнэт-інтэрфейсаў і іх выкарыстанне, магчымасць разгортвання недзяржаўнымі суб'ектамі нейрасаматычнай зброі, а таксама верагоднасць ператварэння ЭЗА ў сур'ёзную праблему грамадскай аховы здароўя.

Людзі заўжды выкарыстоўвалі розныя прылады для пашырэння межаў свайго існавання ў свеце. Але ўсё часцей гэтыя інструменты нагадваюць пратэзы, якія абяцаюць шэраг радыкальных магчымасцей, аднак іх сацыяльная прымальнасць стала залежаць ад шэрагу ўмоваў.

**Літаратура**


1. Admin WKBW. "Social Networking to Blame for Spreading LeRoy Illness?" February 2012. URL: http://www.wkbw.com/news/Social-Networking-to-Blame-for-Spreading-LeRoy-Illness-138821059.html
2. Dimon, L. (2013 года) What Witchcraft is Facebook? *The Atlantic*, September 11.URL: http://www.theatlantic.com/health/archive/2013/09/what-witchcraft-is-facebook/279499/
3. Dator, J.A., Sweeney, J.A., & Yee, A.M. (2015) *Mutative Media. Lecture Notes in Social Networks.* Cham: Springer International Publishing. URL: http://link.springer.com/10.1007/ 978-3319-07809-0
4. Mi. Amodio. Hightech babysitters: Gadgets as attention grabbers for little ones. June 27, 2013. URL: http://zone.tmcnet.com/topics/articles/343806-high-tech-babysitters-gadgets-as-attention-grabberslittle.htm
5. Council on Communications and Media. "Children, adolescents, and the media". *PEDIATRICS*, 132 (5), 2013, pp. 958-961. DOI: 10.1542 / peds.2013-2656
6. Brzezinski, Z. (1970) *Between Two Ages: America's Role in the Technetronic Era.* New York: The Viking Press.
7. Dunagan, J.F. (2010) Politics for the Neurocentric Age. *Journal of Futures Studies*, 15 (2), pp. 51-70.

# Невуцтва, нявызначанасць і "а што, калі?"

*Джэром Равец*

Сёння амаль паўсюдна прызнана, што ў аснове навуковай дзейнасці больш не ляжаць адкрыцці. Асноўныя праблемы навуковай сферы зараз вынікаюць з выклікаў (і пагроз), прадстаўленых да гэтага часу сляпым і некантралюемым ростам усёй нашай навукова-тэхнічнай і прамысловай сістэмы.

Разгледзім наступнае сцверджанне: «У такіх складаных пытаннях, як уплыў чалавечай дзейнасці на навакольнае асяроддзе, пошук простых ісцін можа схаваць няпэўнасць рэальнасці. Практычна ўсе, што мы робім, спажываем і з чым сутыкаемся, нясе пэўныя рызыкі. Мы павінны вырашыць, за якія рызыкі неабходна ўзяцца асабліва рашуча, у якой паслядоўнасці, якім чынам, як глыбока і за які кошт. Навука аб навакольным асяроддзі – не простая рэч; апісаць тэхнічныя дадзеныя і даць дэталёвую ацэнку рызык складана, але ў ёй адлюстроўваецца рэальнасць тых выбараў, якія грамадства павінна зрабіць. Пытанні няпростыя, і навуцы належыць важная роля».

Гэта цытата доктара Крыса Фэя, старшыні і галоўнага выканаўчага дырэктара *«Shell UK Limited»*. Доктар Фэй атрымаў адукацыю ў сферы сацыяльных праблем навуковага ведання, якую складана атрымаць ва ўніверсітэтах, але якая была яму прадастаўлена даволі нечаканым чынам падчас яго працоўнай дзейнасці.

Прыведзеная вышэй цытата нагадвае нам, што страта ўпэўненасці і выхад на авансцэну этыкі з'яўляюцца цэнтральнымі праблемамі ў гэтым новым для навукі стане. Адначасова навуковыя эксперты губляюць гегемонію ў галіне абмеркавання і дыскутавання палітычных пытанняў, звязаных з навукай. «Аб'ектыўнасць» ператварылася ў праблему, а не ў падмурак навукі. Мы выкарыстоўваем тэрмін «постзвыклая навука», каб неяк пазіцыянаваць гэты новы від навукі.

## Навадныя пытанні

Прымаючы ідэю існавання розных стыляў даследавання, мы можам перайсці да маёй класіфікацыі, якая пабудавана вакол «навадных пытанняў». Мы можам пачаць з трох відаў даследаванняў, якія пазначым як «даследаванне», «праектаванне» і «пошук». Кожнаму з іх адпавядаюць пэўныя пытанні: «што / як? », «як / чаму? » і «а што, калі?».

Гэтыя «навадныя пытанні» заклікаы хутчэй праясняць, а не даваць азначэнне; а тэрмін «навадное пытанне» дазваляе нам ўявіць, што ў любым канкрэтным даследаванні ўсе тры віды пытанняў з'яўляюцца ў патрэбны час і ў патрэбным месцы.

У кантэксце новых выклікаў, якія стаяць перад навукай, пытанне «а што, калі?» становіцца вядучым, набываючы новую актуальнасць. Цяпер наша невуцтва ўжо не бяскрыўднае – яно робіцца небяспечным. Магчыма, ніколі, або часам, або вялікую частку часу, ці ўвесь час, а можа, раз ці два, або кожны раз.

Калі мы пазначым «а што, калі?» як галоўнае пытанне, тады ўся наша канцэпцыя навуковай дзейнасці можа развівацца досыць плённа. Задача ў тым, каб гарантаваць уварванне няпэўнага рабочага асяроддзя сістэмы толькі ў прымальнай ступені, так, каб дзейнасць па вырашэнні праблем была скіравана ў асноўным на гэтыя дакладна вызначаныя намеснікі няпэўнай рэальнасці.

Нароўні з няпэўнасцю рэальнага свету нам неабходна таксама эфектыўна спраўляцца з яго комплекснасцю. Такі падыход пранізвае ўсю нашу навукова-тэхнічную культуру. Калі мы прывыкнем задаваць пытанне «а што, калі?» і чакаць нечаканага, тады мы цалкам усвядомім, што ніводзін пункт гледжання не можа ў поўнай меры змясціць у сабе любую рэальную сітуацыю.

Прыняцце «а што, калі?» у якасці навуковага падыходу таксама акажа важны ўплыў на працэс распрацоўкі правілаў паводзін. На сёння нам вядома, што выкарыстанне навукі для распрацоўкі згаданых правілаў моцна адрозніваецца ад простага працэсу «атрымання фактаў». Каб забяспечыць наяўнасць фактаў, першапачаткова патрабуецца расставіць прыярытэты, для таго, каб падтрымаць даследаванне. Затым неабходна выбудаваць гэта даследаванне вакол адпаведных пытанняў. А паколькі кожнае пытанне, якое тычыцца правілаў, з'яўляецца комплексным і ўключае аспекты як прыроды, так і грамадства, то і «прычына» праблемы будзе гэтак жа неадназначнай.

Падыход «а што, калі?» таксама з'яўляецца выражэннем *прынцыпу абачлівасці*. Ён абараняе навукоўцаў ад паспешнага выбару даследчыцкіх праблем. Уявіце сабе няспынны дыялог паміж удзельнікамі рознага роду запытаў. Хоць пытанне «а што, калі?» перастае быць цэнтральным пасля пачатку даследчай працы, яго заўжды варта ўзгадваць у якасці важнага дапаўнення да працэсу вырашэння галаваломак, з якога ў канчатковым выніку ўзнікаюць адпаведныя факты.

Нарэшце, ёсць сацыяльныя наступствы навуковага падыходу «а што, калі?». У дыялогу павінны фігураваць ідэі і прапановы

людзей з розным узроўнем досведу ці нават зусім без яго. Паколькі мноства пытанняў «а што, калі?» выклікана досыць арыгінальнымі дадзенымі, прынясце падыходу «а што, калі?» неаддзельна ад прызнання пашыраных фактаў, пашыранай супольнасці калег і самога падыходу постзвыклай навукі.

### Заключэнне: кантэксты «а што, калі?»

А як наконт «крытычнай навукі» мінулага пакалення [1]? Я адмовіўся ад такога палітызаванага падыходу па дзвюх прычынах. Пэўны час, калі рэальнасць «ваенна-прамысловага і навуковага комплексаў» была новым адкрыццём для шырокай грамадскасці, здавалася магчымым, што радыкальны рух можа быць арганізаваны вакол самой навукі. Аднак падтрымаць гэты энтузіязм не ўдалося, а тым часам змянілася сама палітыка. Калі навука павінна стаць цэнтральным пытаннем у гэтым новым кантэксце, дэбаты будуць сканцэнтраваны не столькі на аспектах размеркавання, колькі на яго філасофскім грунце.

Гэты новы фокус выяўлены ў выступах Сардара за Іншых [2]. Па меры таго, як яго выказванні набіраюць вагу, мы знаходзім каштоўны дар «бачыць сябе такімі, якімі нас бачаць іншыя». На гэтай аснове мы маглі б ажыццявіць неабходную рэформу навукі адносна яе сацыяльных функцый, метадаў работы і канцэптуальных аб’ектаў. Дадатковае развіццё можа адбывацца ў межах спантанна паўсталай культуры, якая, сярод іншых трэндаў, пазначаецца па-рознаму: і «зялёнай», і «феміністычнай», і «нью-эйдж». Разнастайнасць назваў паказвае на вялікую разнастайнасць праблем і стыляў, некаторыя з якіх супадаюць, а некаторыя – несумяшчальныя і ўзаемна процілеглыя. Любое паслядоўнае бачанне навукі, заснаванае на адным складніку гэтага разнастайнага руху, відавочна, так ці інакш, адштурхне большасць іншых удзельнікаў.

### Літаратура


1. Ravetz, R. (1996) Critical Science: Politics and Philosophy. In: *Scientific Knowledge and its Social Problems*. New Brunswick, NJ: Transaction Press, pp. 422-436.
2. Sardar, Z. (1994 г.) Conquests, chaos, complexity. The Other in modern and postmodern science. *Futures*, 26 (6), pp. 665-682.

# «Тут жывуць цмокі»: даследуючы «невядомае невядомае»

*Шырын Элахі*

**Уводзіны**

На меднай паверхні глобуса Ленакса выгравіраваны памятныя словы на лацінн: HIC SVNT DRACONES. Гэтая фраза, перакладзеная як «Тут жывуць цмокі», выкарыстоўвалася для абазначэння небяспечных або нязведаных тэрыторый. Для любога карыстальніка картаў разуменне межаў ведаў было амаль гэтак жа важна, як і самі веды. Ілюзія ведання была найвялікшай небяспекай [1].

А дзе жывуць цмокі ў сучасным свеце? Становіцца ўсё больш відавочным, што яны тояцца паўсюдна вакол нас. Яны выяўляюць сябе кожны раз у белых плямах, якія тычацца навуковых, геаграфічных, часавых і інстытуцыйных межаў, якія застаюцца незапатрабаванымі з-за праблем, увасобленых у іх, з-за нашага чалавечага імкнення да парадку і кантролю.

**Прыклады «Тут жывуць цмокі»**

Навуковы свет не прызнае «вобласці пражывання цмокаў», таму даследаванняў на гэтую тэму мала. Дадзены артыкул вылучае тры прыклады: «надзённыя праблемы», «чорныя лебедзі» і «постзвыклая навука».

*Надзённыя праблемы* або беспарадкі ўяўляюць сабой неадназначныя, моцна абмежаваныя, цесна ўзаемазвязаныя комплексныя дылемы. З-за іх пераменлівага характару і складаных ўзаемазалежнасцей практычна немагчыма даць ім адзінае азначэнне, паколькі ў гульні ўдзельнічаюць адразу мноства розных пунктаў гледжання і праблем [2].

*Чорны лебедзь* – гэта непрадказальная, неверагодная падзея, для якой характэрны велізарны ўплыў на існуючы стан [3].

*Постзвыклая навука* характарызуецца высокімі стаўкамі, няпэўнасцю фактаў, спрэчнымі каштоўнасцямі і неадкладнымі рашэннямі. У такой сітуацыі прызнанне з боку калег нізкае або практычна адсутнічае, тэарэтычныя мадэлі заснаваныя на статыстычнай апрацоўцы і ўводзе дадзеных, а няпэўнасць імкнецца да няведання.

Усе яны маюць справу з узаемадзеяннем паміж шматлікімі ўзаемазлучанымі і ўзаемазалежнымі сістэмамі з мноствам розных удзельнікаў. Таму інфармацыя заўжды будзе заставацца няпоўнай. Яшчэ адной агульнай адметнай рысай гэтых сістэм з'яўляецца іх здольнасць кідаць выклік традыцыйнаму мысленню і статусу-кво.

**Прызнанне вобласці «тут жывуць цмокі»**

Чалавечая псіхалогія, інстытуцыйныя рамкі і навуковыя ўмоўнасці – ўсе згаварыліся знішчыць тэрыторыю «тут жывуць цмокі» ў калектыўнай свядомасці. Процідзейнічаць гэтаму працэсу можна праз выкарыстанне новых лічбавых інструментаў і працэсаў, якія дазваляюць выкарыстоўваць больш шырокія сацыяльныя рамкі. Такі падыход зможа аб'яднаць разрозненыя культурныя каштоўнасці і светапогляды, каб дамагчыся большай сацыяльнай легітымнасці, а таксама прызнання і лакалізацыі тэрыторый «тут жывуць цмокі».

Найважнейшае пытанне палягае ў тым, ці прывядуць гэтыя новыя лічбавыя інструменты і працэсы да росту ўсведамлення існавання і да прызнання вобласці «тут жывуць цмокі». Калі выкарыстаць гэтыя інструменты ў спалучэнні са сцэнарамі і форсайтам, можна гарантаваць траплянне тэрыторыі «тут жывуць цмокі» на нашы калектыўныя ментальныя карты.

**Сцэнары як аналіз мета-рызык**

Форсайт дазваляе нам уявіць сабе тое, што яшчэ не адбылося, каб абараніць сябе ад суровых рэалій фактычнага досведу. Мы запускаем гэты працэс, каб зразумець і вызначыць кірунак, які можа разгарнуцца ў будучыні.

Сцэнарная метадалогія з'яўляецца форсайт-метадалогіяй, якая дазволіць даследаваць складанасць, а таксама супярэчлівыя сістэмы перакананняў. Сцэнары прапануюць сродкі калектыўнага вывучэння няпэўнасцей, выпрацоўваючы такім чынам агульнае разуменне дынамікі і праблем, якія ляжаць у іх аснове і могуць паўплываць на будучыню.

Ніколі раней яшчэ не было нагэтулькі вялікай патрэбы ў сацыяльнай адаптацыі перад тварам экспанентных зменаў. Сёння розныя супольнасці настолькі ўзаемазвязаныя і ўзаемазалежныя, што існуе вялікая патрэба ў падвышанай супрацiўляльнасці, аднак гэта патрабуе прызнання існавання «тэрыторый, якія насяляюць цмокі», і стратэгій па іх матэрыялізацыі.

**Заключэнне**

Надышоў час прызнаць існаванне зямель, якія пазначаюцца выразам «тут жывуць цмокі», і высветліць, якія з іх уяўляюць найбольшую рызыку для грамадства, якое мы жадаем для сябе і новага падрастаючага пакалення. Невуцтва, двухсэнсоўнасць і навуковая няпэўнасць занадта часта ўдала сціраліся з нашых карт ведаў. Але свет пастаянна мяняецца. Землі, дзе жывуць цмокі, атачаюць нас

паўсюль, але чалавецтва, якое залежыць ад складанай сеткі узаемазвязаных сістэм, ігнаруе іх на свой страх і рызыку.

**Літаратура**

1. Ravetz, J. R. (1986) Usable knowledge, usable ignorance: incomplete science with policy implications. In: W. C. Clark, R. C. Munn (eds.) *Sustainable Development of the Biosphere.* New York: Cambridge University Press, pp. 415-432.
2. Rittel, H., Webber, M. (1973) *Dilemmas in a General Theory of Planning, Policy Sciences* (4), pp. 155-169; Ackoff, R. (1974) *Redesigning the Future: A Systems Approachto Societal Problems.* NJ, London: John Wiley & Sons.
3. Taleb, N.N. (2007 г.) *The Black Swan.* London: Allen Lane.

# ПРАСТОРА І ЧАС

## Постзвыклыя артэфакты

*Зіяуддзін Сардар*

З пункту гледжання постзвыклага часу ўзнікае натуральнае пытанне: калі постзвыклы час уяўляе сабой асаблівую гістарычную эпоху, азначае пераход ад папярэдніх перыядаў гісторыі, то якія прадметы матэрыяльнай культуры і ўнікальныя асаблівасці яна спарадзіла або можа спарадзіць? Якое «барахло», кажучы жаргоннай мовай, вызначае гэтую эпоху як асобны перыяд?

Калі постзвыклы час спарадзіў свае ўласныя артэфакты, то мы дамо рады адрозніць іх ад артэфактаў іншых перыядаў Сучаснасці, такіх як мадэрн або постмадэрн. Таму, дзеля мэтаў дадзенага даследавання, давайце падзелім Сучаснасць на чатыры ча́савыя адрэзкі:

**Класіка** (1920-1950)
**Мадэрн** (1950-1975)
**Постмадэрн** (1975-2005)
**Постзвыкласць** (2005 – па цяперашні час)

Гэта дзяленне гэтак жа адвольнае, як і любыя іншыя спробы разбіць гісторыю на памянёныя блокі. Аднак цяпер мы можам ідэнтыфікаваць артэфакты і паглядзець, ці не спарадзіў постзвыклы час нешта зусім асаблівае.

Такім чынам, вось мой прыкладны спіс узнікаючых постзвыклых артэфактаў.

**Сэнс**
*Класіка:* «Я думаю, значыць, я існую»
*Мадэрн:* «Я развіваюся, а значыць, я існую»
*Постмадэрн:* «Я купляю, а значыць, я існую»
*Постзвыкласць:* «Я распаўсюджваю, а значыць, я існую»

**Ісціна**
*Класіка:* маналітная
*Мадэрн:* маналітная
*Постмадэрн:* адносная і плюралістычная
*Постзвыкласць:* супярэчлівая

**Ідэнтычнасць**
*Класіка:* «Я – традыцыя і культура»
*Мадэрн:* «Я – навука і тэхналогіі»
*Постмадэрн:* «Я – тое, што я купляю»
*Постзвыкласць:* «Я – мая старонка на Facebook»

**Змены**
*Класіка:* квазістатычныя, павольныя
*Мадэрн:* хуткія
*Постмадэрн:* яшчэ хутчэй
*Постзвыкласць:* тэмп яшчэ больш паскараецца, хаатычныя

**Сістэмы**
*Класіка:* простыя, закрытыя
*Мадэрн:* складаныя, закрытыя
*Постмадэрн:* комплексныя, адкрытыя
*Постзвыкласць:* адкрытыя, узаемазвязаныя, комплексныя, хаатычныя

**Ключавыя ідэі**
*Класіка:* заваёва, перавага, прагрэс
*Мадэрн:* прагрэс, эфектыўнасць, мадэрнізацыя
*Постмадэрн:* растварэнне гранд-наратываў (сэнс), множнасць ісцін, множнасць галасоў
*Постзвыкласць:* комплекснасць, хаос, супярэчнасці, няпэўнасць, невуцтва

**Сусветны парадак**

*Класіка:* канкуруючыя каланіяльныя дзяржавы (Вялікабрытанія, Францыя, Галандыя, ЗША)

*Мадэрн:* біпалярны свет; «халодная вайна» (ЗША – Савецкі Саюз)

*Постмадэрн:* аднапалярны свет (ЗША)

*Постзвыкласць:* шматпалярны свет (ЗША, Кітай, Расія, ЕС, Індыя, Бразілія)

**Веды**

*Класіка:* правядзенне абгрунтаванага даследавання...

*Мадэрн:* ...якое стала магчымым дзякуючы навуковаму прагрэсу і развіццю

*Постмадэрн:* сацыяльна сканструяваныя і адносныя, Вікіпедыя

Постзвыкласць: «пашыраныя факты», закладзеныя ў няпэўнасці і няведанні

**Навука**

*Класіка:* пагоня за ісцінай, фінансуецца галоўным чынам дзяржавай

*Мадэрн:* навуковы метад як нейтральная, аб’ектыўная праўда; фінансуецца дзяржавай і карпарацыямі (ваенна-прамысловы комплекс); рэцэнзуемыя публікацыі

*Постмадэрн:* сацыяльна сканструяваная; фінансуецца галоўным чынам комплексам ваенна-прамысловых карпарацый; рэцэнзуемыя публікацыі

*Постзвыкласць:* «факты няпэўныя, каштоўнасці спрэчныя, стаўкі высокія, рашэнні тэрміновыя»; кіруецца мегакарпарацыямі (Google, Microsoft) і мільярдэрамі-філантропамі; «пашыраныя супольнасці калегаў», але ўсё яшчэ ў значнай ступені фінансуецца комплексам ваенна-прамысловых карпарацый

**Тэхналогіі**

*Класіка:* павольнае ўкараненне навукі для палягчэння працы

*Мадэрн:* ідэалагічна арыентаваны на «паляпшэнне грамадства», антыбіётыкі, а таксама ядзерная зброя

*Постмадэрн:* убудаваны ў палітыку; секвеніраванне геному, біятэхналогіі, інфармацыйныя і камунікацыйныя тэхналогіі

*Постзвыкласць:* зліццё чалавека і машыны, рэдагаванне ДНК, дроны, кібаргі

**Медыцына**

*Класіка:* без антыбіётыкаў і неабходных анестэтыкаў

*Мадэрн:* «сучасная хірургія», антыбіётыкі, маніторынг пры дапамозе электракардыяграмы (ЭКГ), аперацыі на сэрцы, трансплантацыя нырак

*Постмадэрн:* электронны маніторынг пацыентаў, мікрахірургія, пластыка твару

*Постзвыкласць:* дыстанцыйная хірургія, тэрапія ствалавымі клеткамі, сінтэтычныя органы

**Сувязь**

*Класіка:* тэлефон, тэлеграф, азбука Морзэ, радыё

*Мадэрн:* мікрахвалі, тэлевізар

*Постмадэрн:* мабільныя тэлефоны, электронная пошта, Інтэрнэт, World Wide Web

*Постзвыкласць:* імгненная, бесперапынная, кругласутачныя сусветныя каналы навін, Facebook, Twitter, «інтэрнэт рэчаў»

**Палітычная арганізацыя**

*Класіка:* імперыі

*Мадэрн:* нацыянальныя дзяржавы

*Постмадэрн:* рэгіянальныя групы і саюзы (ЕС, АСЕАН, АІК)

*Постзвыкласць:* пераход улады да недзяржаўных суб’ектаў

**Лад кіравання**

*Класіка:* прадстаўнічая дэмакратыя

*Мадэрн:* дэмакратыя, заснаваная на ўліку інтарэсаў бакоў (неаліберальная, гіперсучасная)

*Постмадэрн:* дарадчая дэмакратыя (разнастайнасць, множнасць, «палітыка адрозненняў»)

*Постзвыкласць:* комплекснае, хаатычнае, некіравальнае

**Эканоміка**

*Класіка:* класічная макраэканоміка (Адам Сміт)

*Мадэрн:* капіталістычная (свабодны рынак), камуністычная (цэнтралізавана кіраваная)

*Постмадэрн:* неаліберальная эканамічная глабалізацыя (буйнамаштабны карпаратыўны гандаль і прыватызацыя рэсурсаў)

*Постзвыкласць:* лічбавая, «подыумны» манетарызм

**Рэлігія (разнавіднасць)**

*Класіка:* манатэізм

*Мадэрн:* манатэізм

*Постмадэрн:* нью-эйдж, фундаменталізм
*Постзвыкласць:* эклектыка, фундаменталізм, палітэізм

**Роўнасць**
*Класіка:* заканадаўча зацверджаная дыскрымінацыя, «закон аб бедных»
*Мадэрн:* дзяржава ўсеагульнага дабрабыту, мяркуецца роўнасць ўсіх перад законам, эфект прасякання выгады для паляпшэння становішча бедных
*Постмадэрн:* мультыкультуралізм, інтэграцыя, асіміляцыя
*Постзвыкласць:* рост няроўнасці, багатыя багацеюць з маланкавай хуткасцю

**Межы**
*Класіка:* фіксаваныя
*Мадэрн:* гнуткія
*Постмадэрн:* празрыстыя
*Постзвыкласць:* знікаючыя

**Прырода**
*Класіка:* прыручыць і эксплуатаваць
*Мадэрн:* прыручаная, пад кантролем, але ёсць «межы росту»
*Постмадэрн:* сацыяльнае канструяванне прыроды, экапалітыка
*Постзвыкласць:* дзікая, змяненне клімату, знікаючыя віды

**Навакольнае асяроддзе**
*Класіка:* адносна спрыяльнае
*Мадэрн:* забруджанае
*Постмадэрн:* таксічнае
*Постзвыкласць:* экалагічная катастрофа, змяненне клімату

**Бог**
*Класіка:* «Бог паўсюль і ва ўсім»
*Мадэрн:* «бог – гэта Праўда» (ранні мадэрн); «Бог памёр» (Позні мадэрн)
*Постмадэрн:* «бог – гэта машына» або «бог – гэта я»
*Постзвыкласць:* «богам з’яўляецца невуцтва»

**Рэлігія (роля)**
*Класіка:* рэлігія тлумачыць свет
*Мадэрн:* рэлігія дапамагае нам зразумець свет

*Постмадэрн:* рэлігія была хлуснёй; ліберальны секулярызм – новая тэорыя збавення

*Постзвыкласць:* рэлігія – нявызначаны феномен, таму павінна быць адкрыта для множных інтэрпрэтацый і стаць комплекснай

**Вайна**

*Класіка:* Першая сусветная

*Мадэрн:* Халакост

*Постмадэрн:* вайна ў Персідскім заліве (як яе паказвалі па ТБ)

*Постзвыкласць:* атакі дронаў, кібервайна, баявыя робаты (вайна як гульня, пазбаўленая чалавечага складніка)

**Пратэсты**

*Класіка:* акты грамадзянскага непадпарадкавання (рух за правы чарнаскурага насельніцтва Паўночнай Амерыкі), негвалтоўнае супраціўленне (Гандзі)

*Мадэрн:* анархісцкая падрыўная дзейнасць, жорсткія дэманстрацыі («Чорныя пантэры»), мірныя маршы (кампанія за ядзернае раззбраенне)

*Постмадэрн:* масавая мабілізацыя (пратэсты супраць вайны ў Персідскім заліве)

*Постзвыкласць:* стымулююцца лічбавымі СМІ, узаемазвязаны, складаныя і хаатычныя па сваёй прыродзе («арабская вясна», пратэсты дальнабойшчыкаў ў Вялікабрытаніі, ЗША і іншых краінах, пратэсты работнікаў грамадскага транспарту Аргенціны)

**Тэрарызм**

*Класіка:* гарадскія банды, тэрарызм у імя незалежнасці («Бітва за Алжыр»[2])

*Мадэрн:* лакальны, з канкрэтнымі мэтамі (ІРА, баскскія сепаратысты)

*Постмадэрн:* глабальны, тэрарысты-смяротнікі, недзяржаўныя суб’екты (Аль-Каіда)

*Постзвыкласць:* глабальны, узаемазвязаны, з прыцягненнем сацыяльных сетак, тэрытарыяльна арыентаваны («Ісламская дзяржава Ірака і Леванта» (ДАІШ), Талібан, Бока Харам)

---

[2] «Бітва за Алжыр» – ваенная кінадрама італьянскага рэжысёра Джыла Понтэкорва, якая выйшла на экраны ў 1966 годзе і стала адным з самых гучных кінаскандалаў дзесяцігоддзя. У цэнтры фільма – падзеі алжырскай барацьбы за незалежнасць у 1954-1960 гг. Фільм заснаваны на кнізе мемуараў Саадзі Ясефа – аднаго з лідараў «Фронту нацыянальнага вызвалення», левай палітычнай партыі Алжыра.

**Цела**
*Класіка:* мускулістае
*Мадэрн:* спартыўнае
*Постмадэрн:* андрагіннае
*Постзвыкласць:* палепшанае

**Гарады**
*Класіка:* Місісіпі, Кейптаўн (перыяду апартэіду)
*Мадэрн:* Нью-Ёрк, Лондан, Парыж
*Постмадэрн:* Токіа, Дубай, Путраджая (Малайзія)
*Постзвыкласць:* Багдад (пасля вываду саюзнікаў), Каір (пасля двух паўстанняў), Алепа, Фергюсон (ЗША)

**Фільмы**
*Класіка:* «Містэр Сміт едзе ў Вашынгтон»[3]
*Мадэрн:* «Уварванне выкрадальнікаў целаў»[4]
*Постмадэрн:* «Сэкс, хлусня і відэа»[5]
*Постзвыкласць:* «Яна»[6]

---

[3] «Містэр Сміт едзе ў Вашынгтон» (Mr. Smith Goes to Washington) – фільм рэжысёра Фрэнка Капры, зняты ў 1939 годзе па апавяданні Люіса Р. Фостэра «Джэнтльмен з Мантаны» (The Gentleman from Montana). Сюжэт разгортваецца вакол барацьбы героя-адзіночкі, адданага сваёй краіне і яе ідэалам свабоды, з карупцыяй і палітыкамі-інтрыганамі.

[4] «Уварванне выкрадальнікаў целаў» (Invasion of the Body Snatchers) – навукова-фантастычны фільм рэжысёра Дона Сігела, зняты ў 1956 г., першая экранізацыя рамана Джэка Фіннея (псеўданім Уолтара эБрэйдана), амерыканскага пісьменніка-фантаста. Асноўная тэма – уварванне варожага розуму з іншых сусветаў. Кніга аказала ўплыў на творчасць многіх пісьменнікаў і кінематаграфістаў, і спробы яе экранізацыі працягваюцца да гэтага часу. З кожным новым фільмам сюжэт набывае ўсё больш змрочныя, сюррэалістычныя фарбы.

[5] «Сэкс, хлусня і відэа» (Sex, Lies and Videotapes) – амерыканская псіхалагічная драма рэжысёра Стывена Содэрберга 1989 г. Фільм пра ўзаемаадносіны жанчыны, расчараванай у сваім сямейным жыцці з-за пастаянных здрад мужа, і мужчыны, які не спадзяецца знайсці шчасце ў каханні. Фільм падымае праблему сутнасці сапраўднай інтымнай блізкасці.

[6] «Яна» (Her) – амерыканская фантастычная меладрама рэжысёра і сцэнарыста Спайка Джонза, сусветная прэм’ера якой адбылася ў 2013 годзе. У аснове сюжэту – падзеі, якія адбываюцца ў недалёкай будучыні і апісваюць адносіны чалавка і штучнага інтэлекту.

**Тэлебачанне**

*Класіка:* «Я люблю Люсі»[7]

*Мадэрн:* «Місія невыканальная»[8]

*Постмадэрн:* «Зорны шлях: Наступнае пакаленне»[9]

*Постзвыкласць:* «Крамянёвая даліна»[10]

**Музыка**

*Класіка:* джаз, біг-бэнд свінг

*Мадэрн:* поп, рок-н-рол, дыска, цяжкі рок (хэві-метал)

*Постмадэрн:* нью-эйдж, псіхадэліка, сумесь усходняй і заходняй, панк, гранж і хаўс

*Постзвыкласць:* яшчэ не з’явілася, але канадская эксперыментальная група «Post Normal» працуе ў гэтым кірунку

**Галівудскія героі**

*Класіка:* Кларк Гейбл – «Шчыра кажучы, даражэнькая, мне напляваць»

*Мадэрн:* Джэймс Дзін – «Дрэнны хлопчык з добрай сям’і»

*Постмадэрн:* Арнольд Шварцэнэгер – «Hasta la vista, дзетка»

*Постзвыкласць:* Джоні Дэп – «Шчыра кажучы, трэба сцерагчыся сумленных людзей. Ніколі нельга прадказаць, калі яны збіраюцца ўчыніць неверагоднае глупства»

---

[7] «Я люблю Люсі» (I Love Lucy) – амерыканскі камедыйны тэлесерыял, выходзіў у 1951-1957 гадах, аб хатняй гаспадыні, якая марыць апынуцца на сцэне, але яе муж усяляк гэтаму перашкаджае. Серыял лічыцца адным з самых папулярных і ўплывовых за ўсю гісторыю тэлебачання.

[8] «Місія невыканальная» (Mission: Impossible) – амерыканскі тэлевізійны серыял, зняты ў 1966-1973 гг. У аснове сюжэту – праца спецыяльнага атрада аператыўнікаў, якія змагаюцца са злачынцамі, шпіёнамі і дыктатарамі. Часта аперацыі ладзяцца ў краінах Усходняга блока, на фоне «жахаў камуністычнай дыктатуры».

[9] «Зорны шлях: Наступнае пакаленне» (Star Trek: The Next Generation) – амерыканскі тэлевізійны навукова-фантастычны серыял, які здымаўся ў 1987-1994 гадах. З’яўляецца часткай фантастычнай сагі «Зорны шлях», апавядае пра прыгоды касмічнага карабля «Энтэрпрайз NCC-1701-D».

[10] «Крамянёвая даліна» (Silicon Valley) – амерыканскі камедыйны серыял, створаны ў 2015-2019 гг. пра бізнес у Крамянёвай даліне.

**Сэкс-сімвал**

*Класіка:* Мэй Уэст – «Гэта пісталет ў цябе ў кішэні, ці ты проста рады мяне бачыць?»

*Мадэрн:* Мэрылін Манро – «У джазе толькі дзяўчаты» (Gentlemen Prefer Blondes)

*Постмадэрн:* Мадонна – «Я матэрыяльная дзяўчына» (I am a material girl)

*Постзвыкласць:* Лаверна Кокс – «Падробка»[11]

**Сэкс**

*Класіка:* «Кодэкс Хейса» (ніякіх двухспальных ложкаў, ніякіх пацалункаў даўжэй за дзесяць секунд, ніякай аголенасці)

*Мадэрн:* «Трах-бах, дзякуй, мэм»

*Постмадэрн:* «кіберсэкс» – падключыцца, увайсці, адключыцца

*Постзвыкласць:* парнаграфія робіцца нормай

**Шлюб**

*Класіка:* манагамны

*Мадэрн:* серыйны манагамны

*Постмадэрн:* серыйны, множны, манагамны

*Постзвыкласць:* гетэра, гома, транс, серыйны, множны

**Будынкі**

*Класіка:* Эмпайр-стэйт-білдынг, Нью-Ёрк

*Мадэрн:* Музей Гугенхайма, Нью-Ёрк

*Постмадэрн:* гатэль «Бонавентура», Лос-Анджэлес

*Постзвыкласць:* Каралеўская гадзіннікавая вежа, Мекка

**Мастакі**

*Класіка:* Пабла Пікаса (1881-1973), іспанскі мастак, заснавальнік кубізму

*Мадэрн:* Джэксан Полак (1912-1956), амерыканскі мастак, прадстаўнік абстрактнага экспрэсіянізму

*Постмадэрн:* Эндзі Уорхал (1928-1987), амерыканскі заснавальнік поп-арта

*Постзвыкласць:* Бэнксі (нар. 1974), псеўданім англійскага вулічнага мастака

---

[11] «Падробка» (Faking It) – амерыканскі рамантычны камедыйны тэлесерыял (2014-2016), які распавядае пра тое, як падлеткі з ліберальнай тэхаскай супольнасці сутыкаюцца з праблемамі сэксуальнай арыентацыі, талерантнасці і прызнання сярод моладзі.

**Раманы**

*Класіка:* Скот Фіцджэральд «Вялікі Гэтсбі» (раман «стагоддзя джаза»)

*Мадэрн:* Альберт Камю «Старонні» (класіка экзістэнцыялізму)

*Постмадэрн:* Салман Рушдзі «Дзеці поўначы» (гісторыка-бытавое даследаванне з элементамі містыкі і чараўніцтва)

*Постзвыкласць:* Дж. Уілсан «Аліф-невідзімка» (гарадское фэнтэзі)

# Глабальнае адзівачванне

*Джон А. Суіні*

Бандару Махшахру не прывыкаць да спёкі. Улетку ў яго паўночнаіранскай вёсачцы тэмпература нярэдка трымаецца вышэй за 45 градусаў па Цэльсіі. Але калі цеплавы індэкс перавысіў 74 градуса па Цэльсіі, другі па велічыні паказчык, калі-небудзь зарэгістраваны ў гісторыі, свет звярнуў на гэта ўвагу. На працягу многіх гадоў справаздачы папярэджвалі, што экстрэмальныя з'явы пачнуць выяўляцца ў сусветнай кліматычнай сістэме. Аднак сама перасцярога аб чаканым наплыве вялікай колькасці экстрэмальных з'яў не значыць, што ў нас ёсць альбо будзе магчымасць прагназаваць і / або змякчаць іх. Кліматычная сістэма з той, якой мы яе ведаем, ператвараецца ў постзвыклую, і любыя спробы нешта вызначыць загадзя ўсё больш і больш нагадваюць сізіфаву працу.

Наколькі дзіўнымі могуць стаць падзеі? Гэта можа быць вызначаючым пытаннем XXI стагоддзя.

Метэаабсерваторыя на Мауна-Лоа, атмасферная станцыя ля падножжа аднайменнага вулкана на Гаваях (ЗША), у маі 2013 года зафіксавала, што ўтрыманне дыяксіду вугляроду ў атмасферы дасягнула 400 праміле. Апошні раз, калі ўзровень вугляроду ў атмасферы быў такім жа высокім, «тэмпература на зямным шары ў сярэднім была прыкладна на 3 градусы вышэй, а ўзровень мора ўздымаўся над берагавой лініяй на 5 метраў і вышэй», але чалавецтва тады яшчэ не існавала. Мы заблыталі ход развіцця глабальнай кліматычнай сістэмы, і паколькі гэты працэс працягваецца, мы жывём у свеце, схільным да надзвычайных дзівацтваў.

Глабальнае адзівачванне, а не проста глабальнае пацяпленне, уяўляе сабой больш, чым простую гульню слоў. Гэта прагноз.

Глабальнае адзівачванне – «справядлівая мянушка для ўзнікаючай сеткі

- нарастаючага тэхналагічнага прагрэсу, залежнасці і ўсюдыіснасці,
- будучай экалагічнай катастрофы альбо катастроф, і
- транснацыянальнага драйву і распаўсюджвання постзвыклых актантаў[12]».

Калі ў 2010 годзе вулічны гандляр падпаліў сябе ў Тунісе, мала хто мог прадбачыць наступствы гэтай падзеі. У эпоху крайняга адзівачвання Махамед Буазізі з'яўляецца тыповым прыкладам постзвыклага актанта. Дзякуючы сеткавым СМІ пратэсты на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы распаўсюдзіліся з хуткасцю ляснога пажару. Як мы можам прадумваць падобнага роду змены? Якія канцэптуальныя лінзы могуць дапамагчы разабрацца ў тым, што здаецца неpraўдападобным? Наколькі навакольнае нас адзівачвае?

З'яўленне канцэпцыі экасістэмы шмат у чым спрыяла далейшаму сістэматычнаму аналізу дзейнасці чалавека ў біясферы. Аднак на мяжы стагоддзяў многія мысляры ўжо сталі рабіць галасныя заявы аб ролі і магчымых наступствах антрапагенных зменаў у жыццядзейнасці планеты. Гэта азначае, што некаторыя даследчыкі тэарэтызавалі свет як адзіную сістэму, якая ўсё больш і больш спрабуе справіцца з крайнасцямі чалавечага рэгулявання.

Мноства рэчаў, якія мы лічылі само сабой зразумелымі, «звыклымі», зараз сталі надзвычайнымі, а таму нялёгка перадаць усе варыянты экстраардынарных паводзін адным тэрмінам. Нашы тэхналогіі сталі экстрэмальнымі, сучаснасць набыла экстрэмальныя канатацыі, наша эканамічная сістэма экстрэмальная, карпаратыўныя паводзіны – экстрэмальныя, і амаль усе ідэалогіі ператварыліся ў экстрэмальныя.

Неверагоднае адзівачванне, выклікане зменай клімату, прымусіла некаторых задумацца аб радыкальных «рашэннях». У той час як некаторыя лічаць, што адзіным спосабам, дзякуючы якому чалавецтва можа пазбавіцца ад крайніх дзівацтваў, з'яўляюцца ініцыятывы па змяненні клімату, іншыя звяртаюцца да разгляду больш абмежаваных «сродкаў абароны». Сцвярджаючы, што «біямедыцынская мадыфікацыя чалавека» павінна абмяркоўвацца ў святле будучых неве-

[12] ***Актант*** (фр. actant – «дзеючы») – агульнапрынятае найменне ўдзельніка, члена супольнасці, чалавека, які належыць да пэўнага кола грамадскасці. У літаратуразнаўстве і фалькларыстыцы – персанаж літаратурнага або фальклорнага твора як суб'екта адлюстроўваемага дзеяння (акцыі), стымул разгортвання падзей, якія складаюць сюжэт.

рагодных адзівачванняў, шэраг аўтараў мяркуюць, што ўзмацненне пачуцця эмпатыі, развіццё фармакалагічнай непераноснасці вугляродаёмкіх прадуктаў, такіх як чырвонае мяса, і стварэнне больш нізкарослых людзей – больш разумныя і менш рызыкоўныя меры, у параўнанні з буйнамаштабнымі ініцыятывамі кліматычнай інжынерыі [1].

У свеце, ахопленым надзвычайных адзівачваннем, людзям, магчыма, давядзецца турбавацца не толькі пра новыя пагрозы, але і пра небяспекі з мінулага, якія, як чакаецца, з'явяцца зноў, калі глабальная кліматычная сістэма ператворыцца ў постзвыклую. Гэтая дынаміка найбольш відавочная ў тундры, дзе вечная мерзлата тоіць у сабе водбліскі будучых кашмараў. Навукоўцы дапускаюць магчымасць таго, што «небяспечныя вірусы ў стане анабіёзу сапраўды хаваюцца глыбока пад зямлёй», паколькі дагістарычная вечная мерзлата стварае ўмовы захавання інфекцый. Хоць такога роду сцэнар гучыць як навуковая фантастыка, нельга недаацэньваць эфект надзвычайнага адзівачвання. Гэта тое, чаму нас можа навучыць эпоха неверагоднага адзівачвання: *немажлівае* становіцца ўсё больш непазбежным.

**Літаратура**

1. Dyer, G. (2011) *Climate Wars: The Fight for Survival as the World Overheats.* Oxford: Oneworld Publications.

# Адносіны "Усход – Захад" у постзвыклы час

*Зіяуддзін Сардар*

*О, Захад ёсць Захад, Усход ёсць Усход, і з месцаў яны не сыдуць,*
*Пакуль не паўстане Неба з Зямлёй на Страшны Гасподні суд [1].*

Ідэі заваёўваюць нашмат большую тэрыторыю і карыстаюцца большым аўтарытэтам, чым усе арміі каралевы-імператрыцы, апетыя Кіплінгам. Нягледзячы на сведчанні гісторыі, палітыкі, эканомікі і культуры, спрошчанае меркаванне Кіплінга па-ранейшаму застаецца пераважным падыходам да разумення свету.

Але ўсё пачалося не са слоў Кіплінга. Усход і Захад розныя. Гэтыя адрозненні істотныя і маюць вечнае значэнне. Праблема ўзнікае з-за таго, што адрозненне ўспрымаецца як непераадольны бар'ер: *«…і з месцаў яны не сыдуць».* Тое, што закадзіравана ў гэтай

негатыўнай ацэнцы, з'яўляецца асновай страху, сумневаў у адносінах да Іншага, пачуццём пастаяннай неабароненасці і прадузятасці. Усход, нягледзячы на ўсю яго складанасць, па-ранейшаму разглядаецца Захадам як крыніца «страшылак» і зладзеяў.

Але сёння настаў час перамагчы гэтую згубную бінарную логіку. Межы і раздзяляльныя лініі Усходу і Захаду не толькі змяніліся, але і сталі размытымі і дрэнна адрознымі. Захад нясе ў сабе столькі ж Усходу, колькі Усход Захаду. Сіла ідэй, якія спарадзілі заходні імперыялізм, жыве і працягвае квітнець, кіруючы Усходам унутры сябе, сама па сабе.

Пошук зыходнага зламысніка і ўказанне віны ўяўляе сабой спосаб працягнуць гульню, характэрную для непрымірымай апазіцыі, у якой пануюць падазронасць, ваенная гатоўнасць, маніпуляванне грамадскай думкай, падвойныя стандарты і грэбаванне надзённымі чалавечымі патрэбамі. Усход быў датычны да ўвекавечвання этасу бінарных апазіцый. Цалкам дастаткова асудзіць Захад за яго ўчынкі. Усход ёсць Усход, а Захад ёсць Захад.

Любая спроба адысці ад бінарных проціпастаўленняў павінна ўлічваць наяўнасць дабра як на Усходзе, так і на Захадзе, а таксама прысутнасць зла у абодвух бакоў. Толькі прызнаўшы, што ва ўсіх «смятанка на вусах», можна пагадзіцца з неабходнасцю знайсці новыя спосабы выбаўлення ад асобных недахопаў.

Неабходнасць збліжэння Усходу і Захаду выглядае яшчэ больш настойлівай, калі ўлічыць сапраўды глабальны характар многіх праблем, якія нас пераследуюць. Ніводную з гэтых праблем асобна ўзятая дзяржава не ў стане вырашыць, а праблемы гэтыя ўплываюць на кожнага чалавека на планеце. Першыя дзесяцігоддзі XXI стагоддзя з усёй відавочнасцю паказалі, што мы жывём у постзвыклы час.

Усход і Захад маюць патрэбу ў новых метадалогіях вырашэння праблем постзвыклага часу. Разнастайнасць і множнасць неабходныя як для разумення комплекснасці, так і для працы з ёй. Хаос вучыць нас, што індывідуальная і сацыяльная адказнасць маюць першачарговае значэнне для нашага калектыўнага выжывання. У постзвыклы час свет сапраўды можа быць разбураны дзейнасцю ўсяго некалькіх чалавек.

Постзвыклы час вывеў на пярэдні план пэўныя віды супярэчнасцей. Мы вымушаныя абмяркоўваць будучыню ў стане пастаяннай няпэўнасці, і калі не ў поўным няведанні, дык, прынамсі, з частковым або недастатковым веданнем. Гэта азначае, што нам трэба адкласці ў бок нашыя рознагалоссі пра несумяшчальнасць Усходу і

Захаду і кіраваць супярэчнасцямі і комплекснасцю шляхам абумоўленага кансэнсуснага дыялогу, у якім усім удзельнікам даецца роўны голас. Для вырашэння супярэчнасцей або комплексных праблем нельга ўжываць ніякія сродкі гвалту. Пакора, сціпласць, адказнасць, разнастайнасць і дыялог – гэта не дадатковыя вартасці, а неабходныя якасці для выжывання ў постзвыклы час.

У постзвыклы час няма месца спрошчанаму меркаванню Кіплінга. Усход і Захад павінны аб'яднацца і выкарыстаць тое лепшае, што могуць прапанаваць іх традыцыі, гісторыя і соцыум, каб выжыць у наш неспакойны час і захаваць пры гэтым здаровы сэнс і чалавечнасць. Каб выйсці з тупіка, у які нас загналі цяжкасці цяперашняга моманту, нам патрэбныя новыя пытанні і новыя ідэі, якія падвядуць нас да новых больш правільных адказаў.

**Літаратура**

1. Р. Кіплінг. Балада аб Захадзе і Усходзе.

# Супярэчнасці Еўрапейскага саюза

*Джордзі Серра*

Прывід блукае па Еўрапейскім саюзе (ЕС), прывід яго ўласных супярэчнасцей. Паводле гэтых супярэчнасцей, ЕС ператвараецца ў сапраўды постзвыклы інстытут. Супярэчнасці з'яўляюцца прадуктам эканамічнай палітыкі ЕС, той галоўнай рухаючай сілы, якая сфарміравала Саюз. Аднак менавіта яго палітычныя, сацыяльныя і нават культурныя аспекты забяспечаць значнасць ЕС у будучыні.

Эвалюцыя ЕС уключала ў сябе распрацоўку мноства дамоваў. Да 2001 году стала ясна, што Еўрасаюзу трэба зрабіць якасна новы крок наперад – распрацаваць еўрапейскую канстытуцыю. Яе мэта: уніфікацыя разнапланавага заканадаўства і наданне яму палітычнага імпульсу. Але факт у тым, што тое, што павінна было стаць асновай сапраўды наддзяржаўнага ўтварэння, стала праектам клуба, членамі якога маглі быць толькі дзяржавы.

Еўрапейская канстытуцыя стала першай супярэчнасцю, якія падарвала стабільнасць ЕС: Саюз не спраўляецца з роляй міжнароднага органа і заходзіць занадта далёка ў сваіх дзеяннях як клуб

дзяржаў. Па праўдзе кажучы, ЕС часцяком не ў стане разгарнуць сумесныя палітычныя дзеянні з-за недахопу сіл, але ў дзяржаў таксама часта няма дастатковага ўплыву для абароны сваіх канкрэтных інтарэсаў. У выніку многія стратэгіі недастаткова амбіцыйныя, каб вырашаць сур'ёзныя праблемы, якія закранаюць Еўропу.

Тым не менш ЕС разглядаўся як прыклад паспяховага міжнароднага кіравання, прынамсі да крызісу 2008 года. Спецыфіка гэтага крызісу была ў тым, што ён насіў сістэмны і глабальны характар. У цэлым фінансавы крызіс стаў для ЕС як выклікам, так і магчымасцю. Але выклік застаўся непрынятым, а магчымасць была страчана. Еўрапейскія інстытуты ўвялі меры жорсткай эканоміі, прынятыя з палкасцю веры неафітаў, і заклікалі насельніцтва кантынента прыняць іх без лішніх пытанняў, інакш усе будуць асуджаныя на пагібель.

Парадаксальна, але рэзкае скарачэнне бюджэту выглядае найбольш паслядоўным рашэннем, улічваючы абмежаваныя магчымасці еўрапейскай структуры. Еўра быў распрацаваны ў 1995-м годзе, прыняты ў 1999-м годзе і ператварыўся ў манеты і банкноты, якія ўвайшлі ў абарачэнне, у 2002-м годзе. Ён увасабляў палітычны штуршок да дасягнення больш высокага ўзроўню інтэграцыі: агульная валюта для больш моцнага Саюза. Але еўра таксама стаў метафарай недахопу палітычнай волі. Еўра быў і працягвае заставацца недастатковым інструментам для выпрацоўкі сумеснай эканамічнай палітыкі, а без сумеснай палітыкі ён асуджаны на знікненне.

Такім чынам, еўра пакутуе на два сур'ёзныя недахопы. Па-першае, ён уяўляе сабой агульную валюту для краін з моцна адрознымі эканамічнымі ўмовамі і дынамікай. Па-другое, ён кіруецца ўстановай, а менавіта Еўрапейскім цэнтральным банкам (ЕЦБ), цалкам не залежным ад дзяржаўнага кантролю. ЕЦБ змог прапанаваць танныя грошы еўрапейскім прыватным банкам толькі ў надзеі, што гэтыя банкі дапамогуць сваім нацыянальным дзяржавам. У рэшце рэшт жорсткая эканамічная палітыка была хутчэй спробай забяспечыць сумнеўную маральную аснову для скарачэння бюджэту, чым рэальным эканамічным аргументам.

Апантанасць эканоміяй прывяла да ўзнікнення другой супярэчнасці: капітал ставіцца вышэй за людзей. ЕС уклаў мільёны ў праграму па забеспячэнні жыццяздольнасці фінансавых сістэм, але вельмі нямногія з іх крэдытуюць прадпрыемствы, якія знаходзяцца ў цяжкім становішчы, і фізічных асоб, якія маюць патрэбу ў іпатэцы. Не будзем забываць пры гэтым, што крыніцай такога фінансавання з'яўляюцца грамадскія грошы, грошы, якія паступаюць ад падатка-

абкладання грамадзян і ў канчатковым рахунку з кішэняў кожнага члена Еўрасаюза. Рацыянальнае абгрунтаванне, дадзенае такім дзеянням, палягала ў тым, што падзенне банкаў можа мець сістэмны эфект, які паглыбіць крызіс і пашырыць яго наступствы.

Вынікам спробаў ЕС справіцца з фінансавым крызісам сталі глыбокія разломы ўнутры яго межаў, якія спарадзілі яшчэ больш супярэчнасцей. У цяперашні час унутры Еўрасаюза назіраецца раскол сярод яго грамадзян: тыя, хто жыве ў выратаваных краінах, супраць тых, хто ратуе. Сур'ёзны падзел ўнутры асобнай краіны адбываецца паміж тымі, у каго ўсё добра, і тымі, у каго ўсё дрэнна. Усё больш і больш еўрапейцаў прыходзяць да высновы, што іх дзеці і ўнукі могуць ніколі не дасягнуць таго ўзроўню дабрабыту, які яны маюць цяпер. У глабальным маштабе аказаная фінансавая падтрымка паказала на крохкасць структуры Еўрасаюза. Аднак унутры самаго Саюза фінансавая дапамога ўмацавала ўяўленне пра тое, што ЕС аддае перавагу эканамічнай стабільнасці над дэмакратычнай легітымнасцю.

Еўрасаюз павінен прыняць лёсавызначальнае рашэнне. Што з'яўляецца мэтай яго існавання: аб'яднаць сваіх грамадзян, спрыяць пермяшчэнню людзей і працоўнай сілы паміж еўрапейскімі дзяржавамі, зблізіць народы Еўропы, уславіць іх інтэлектуальную і культурную гісторыю або ўзбагаціць банкіраў і фінансавыя ўстановы? У рэшце рэшт, еўрапейская супольнасць павінна вызначыцца, чым яна з'яўляецца:

• Рынкам?
• Валютай?
• Незавершаным праектам па наддзяржаўныя кіраванні?
• Ці ўсім разам узятым?

Ад адказу залежыць будучыня ЕС і дарэчнасць яго далейшага існавання ў постзвыклы час.

Хачу адзначыць, што абмежаванне ЕС толькі эканамічным вымярэннем і прадастаўленне эканамічнай логіцы права дыктаваць, як Саюз мусіць функцыянаваць, з'яўляецца вялікай памылкай. Еўропа заўжды ўяўляла сабой мазаічнае пано, складзенае з розных тэрыторый, народаў, культур і разнастайных прыхільнасцей. Яе дзеянні ніколі не адрозніваліся гарманічнасцю і любая спроба ўяўлення прадставіць гэтую частка свету як аднастайную адзінку пацерпіць крах. Але нават калі Еўропу прымушаюць працаваць як эканамічную адзінку, яе эканамічныя характарыстыкі насамрэч не адлюстроўваюць рэальную сутнасць ЕС. Сапраўдная прычына згуртаванасці дадзенага саюза заключаецца ў іншым.

На розум прыходзяць два прыклады: правы чалавека і абарона навакольнага асяроддзя. Калі мы разгледзім нарматыўны корпус ЕС, так званыя «Правілы Супольніцтва», мы можам прызнаць,

што гэта выдатны зборнік правоў, які належыць, магчыма, самаму дэмакратычнаму рэгіёну свету. Еўрасаюз распрацаваў адно з самых перадавых заканадаўстваў па пытаннях навакольнага асяроддзя. Справаздачы Еўрапейскай Камісіі па пытаннях аховы здароўя, адукацыі, гендэрнай роўнасці, умовах працы і правах меншасцей заахвоцілі некаторыя дзяржавы перагледзець свае заканадаўствы па дадзенай тэматыцы, каб адпавядаць прынцыпам ЕС.

На мой погляд, большасць грамадзян ЕС разумеюць, што магчымасці пераломнага моманту былі страчаныя. Еўрапейскія выбары 2014 года былі першай ластаўкай. З ростам ліку крайне правых партый у Еўрапарламенце там сабраўся самы высокі працэнт антысаюзных прадстаўнікоў за ўсю яго гісторыю. Для правых (і крайне правых) партый рашэнне праблем палягае ў аслабленні ЕС, для іншых адзіна лагічнай альтэрнатывай з'яўляецца прамая супрацьлегласць: узмацненне ЕС.

Тым не менш падзеі 2015 года паказалі, што абодва бакі і маюць рацыю, і не маюць рацыі. Мільёны бежанцаў з Сірыі і іншых краін пачалі прыбываць у Еўропу. Перш нямногія краіны Еўрасаюза адкрыта адмовіліся прымаць іх, але па меры росту колькасці мігрантаў раслі і пярэчанні. З тых часоў урэгуляванне гуманітарнага крызісу стала прычынай ганьбы для многіх еўрапейцаў. Сёння вельмі нешматлікія лічаць, што ЕС служыць іх інтарэсам і патрэбам, таму нядзіўна, што большасць разглядае магчымасць выхаду з Саюза.

Варыянтаў далейшай гісторыі на сёння некалькі: альбо ЕС прыходзіць да свайго цывілізаванага і годнага канца, альбо пераадольвае ўнутраныя супярэчнасці і пераходзіць у постзвыклы час з поўным разуменнем і належным прадбачаннем. Па-першае, неабходна павысіць дасведчанасць людзей аб важнасці рэгіянальнага вымярэння ва ўсё больш узаемазлучаным, комплексным і хаатычным свеце. Па-другое, ЕС мае патрэбу ў новым фармаце, адпаведным для постзвыклага часу, які ўлічваў бы як эканамічны дабрабыт усяго яго насельніцтва, так і яго структуру кіравання. Па-трэцяе, Еўрапейскі саюз мае вострую патрэбу ў новым кіраўніцтве. Каб выжыць у будучыні, ЕС неабходна новае пакаленне этычна арыентаваных лідараў, здольных пераадольваць постзвыклы час.

# Постзвыклая Амерыка ў кіно

*С. Скот Джордан*

У перыяды ключавых пераўтварэнняў амерыканскае кіно выкарыстоўвала Іншага, каб ідэнтыфікаваць сябе. У даваеннай класіцы выкарыстоўваліся персанажы афраамерыканскага паходжання. Кінематограф пасля Другой сусветнай вайны пераследваў прывід камунізму. Вобразы арыенталізму ўвайшлі ў моду ў 1960-1970-я гады, яшчэ да таго, як «арабскі тэрарыст» увасобіў у сабе кінапагрозу [1]. За апошняе дзесяцігоддзе адбыўся пэўны зрух. Страх перад Іншым саступіў месца страхам, народжаным пагрозамі нашага часу: страху у адносінах да змены клімату [2], паніцы з нагоды фінансавага крызісу, трывозе, выкліканай інтэрнэтам і асцярогай, звязаным з аўтаматызацыяй, штучным інтэлектам і кланаваннем. Улічваючы дух часу, нядзіўна, што сучасны кінематограф падышоў да постзвыклага часу.

Я хацеў бы абмеркаваць два фільмы, у якіх, як мне здаецца, адлюстроўваецца постзвыклая Амэрыка: «Амерыканскі снайпер» Клінта Іствуда (2014) і «Той, хто выжыў» Алехандра Гансалеса Іньярыту (2015). Пры павярхоўным праглядзе яны маюць мала альбо не маюць ніякага дачынення да постзвыклага часу. Але мы можам вычленіць у іх метафары [3], якія праліваюць яркае святло на трывогі Амерыкі, яе страхі і асцярогі, спароджаныя невуцтвам і звязаныя з няпэўнасцю.

Фільм «Амерыканскі снайпер» распавядае гісторыю нябожчыка-снайпера спецпадраздзялення «марскіх коцікаў» Крыса Кайла, чалавека, які праславіўся забойствамі людзей. Такі сабе амерыканскі герой. Фільм Клінта Іствуда бярэ дадзены трагічны амерыканскі сплаў і ператварае гісторыю гэтага чалавека ў сюррэалістычную метафару постзвыклай Амерыкі. Большая частка фільма перадае вам вельмі знаёмыя адчуванні тыповага антыўтапічнага ваеннага фільма амерыканскай вайны, якая разгарнулася пасля падзей 11 верасня. У завяршэнне Кайл застаецца, па меншай меры, метафарай добрага старога амерыканскага грамадства, яго флагманам.

Гэта метафара таго, у што ператварыліся Злучаныя Штаты з моманта дасягнення імі глабальнага панавання, пакінуўшы аўдыторыі выбар у дачыненні да траекторыі будучага курсу. Кайл любіць Тэхас, ён любіць зброю і хоча быць каўбоем. Больш важным з’яўляецца тое, што яму ўласціва класічнае амерыканскае ненармальнае пачуццё справядлівасці. Выкарыстаная метафара нагадвае незлічонае мноства іншых пустых метафар, якія існуюць у свядомасці радыкальных

амерыканскіх рэалістаў. У фільме Кайл успрымае рэпартаж з перадачы навін аб выбухах у амбасадзе ЗША ў Кеніі ў 1998 годзе, як калі б ён бачыў свайго малодшага брата, якога збіваюць хуліганы. Грамадства, гэтак схільнае да фундаменталісцкага індывідуалізму, раптам пачынае ўспрымаць чужынцаў толькі тады, калі тыя прывязаныя да яго эпітэтам «амерыканскія».

Каментар з навін прасякнуты першабытным страхам і глыбіннай няўпэўненасцю ў дачыненні да новага ворага; а затым адбываюцца падзеі 11 верасня. Камуніст, японец, немец – усё маюць адметныя характарыстыкі, якія лёгка можна вывесці ў карыкатурным святле, але цяпер яны сышлі ў цень. Вораг – здань, амаль нелюдзь. Таму Амерыка таксама павінна страціць свой чалавечы твар. Мы назіраем за спецтрэніроўкамі Кайла, якія, як чакаецца, пакажуць нам яго чалавечую сутнасць, але замест гэтага працэс больш нагадвае адрэгуляванае анлайн-навучанне. А потым рэальнасць вяртаецца ў свае звыклыя рамкі.

На першы погляд здаецца, што ў Кайла ёсць усё: ідэальная нявеста, дзіця на падыходзе – сапраўдная «амерыканская мара», але мы даведаемся, што стральба ў кампутарных гульнях або па стэндавыя мішэнях не рыхтуе да забойства жывых людзей. Амерыка назірае за светам праз магутны прыцэл і служыць шчытом, у якім мае патрэбу свет. Тэрмін «герой», нібыта футбольны мяч на полі, перакідаюць туды-сюды, трансфармуючы яго на вачах у гледачоў. Крыс Кайл – наш герой. Усе ясна паказаныя каштоўнасныя супярэчнасці Кайла цягнуць яго ў глыбокую няпэўнасць постзвыклага часу. У выніку атрымліваецца самастойны герой донкіхоцкага тыпу, за якога аўдыторыя пастаянна перажывае, спадзеючыся то на яго перамогу, то на паразу.

Але свет ужо не нагэтулькі просты. Герой постзвыклага часу не можа проста перамагчы дрэннага хлопца ці абясшкодзіць бомбу. Герой постзвыклага часу – перш за ўсё штурман. Постзвыклы герой сутыкаецца з неабходнасцю ўзяць нашы старыя канцэпцыі, выпрабаваць іх і запатрабаваць перавыхаваць саміх сябе, у адваротным выпадку мы асуджаныя загінуць ад рук сапраўднага ворага – нас саміх.

Першыя з гэтых герояў амаль напэўна асуджаны стаць трагічнымі асобамі, паколькі няведанне постзвыклага часу будзе ўтойваць у сабе смяротныя выпрабаванні. Адны прызна́юць комплекснасць і супярэчнасці, пануючыя вакол іх, іншыя – будуць імкнуцца пераадолець іх, а трэціх яны заб’юць. Гэтых персанажаў паглыне іх няпэўнасць, якая пануе навокал, а іх магчымасці абмежаваныя тым, як яны спраўляюцца з уласным невуцтвам.

Зусім несвядома фільм адлюстроўвае асноўныя дылемы, унутраныя супярэчнасці і глыбокае невуцтва Амерыкі ў постзвыклы час. Я жыву ў той Амерыцы, дзе зброі больш, чым людзей, стральба ва ўніверсітэцкіх гарадках – норма, а экспарт вайны завецца знешняй палітыкай. Фільм «Амерыканскі снайпер» – люстэрка нашага напаўсвабоднага мыслення, якое падштурхоўвае да пастаяннага гвалту.

Постзвыклы час неспакойны і нязручны. Намёк на тое, як Амерыка можа прымірыцца з ім, даецца ў фільме Іньярыту «Той, хто выжыў». Рэжысёр прапануе нам свой вопыт навігацыі па гэтых трывожных часінах.

Каб падрыхтаваць нас да будучага падарожжа, фільм адкрываецца кадрамі бягучай вады, ключавога элемента жыцця. Бацька і сын. Глас і Хоўк. Затым нешта, скажам так, не з гэтага свету – іх пісталеты. Алень з незлічонымі адгалінаваннямі рагоў: дрэва жыцьця стала целам. БАХ! Ненатуральны гук запускае наша падарожжа. Побач мы бачым стаянку людзей, якія жывуць на прыродзе. Надыход раніцы перапынены стрэлам. Джон Фіцджэральд выказвае капітану Эндру Генры, аўтарытэтнай постаці, занепакоенасць з нагоды ненатуральнага шуму. Злавесны Іншы стаіўся паўсюль.

Па сутнасці, гэта гісторыя – бацькоўскі даведнік па постзвыклым часе. Роля Гласа як бацькі даволі складаная. Простая метафара палягае ў тым, што Глас, следам за ілжывым амерыканскім палітычным поглядам, вядзе зрынуты нецывілізаваны свет да росквіту. Глас не здольны ўбачыць святло у канцы тунэля гэтага падарожжа. Ён проста спрабуе даставіць людзей у бяспечнае месца, у бліжэйшы форт. Ён вымушаны стаць бацькам для гэтай групы «белых», якія спадзяюцца толькі на яго ў выратаванні ад паўсюднай небяспекі новага нападу з боку племя арыкара. Квэст мае высокую верагоднасць правала, нават калі дабрацца да форта. І што тады?

Гэтак сама і Фіцджэральд – свайго роду бацька.Назавем яго бацькам невуцтва і постзвыклага адставання. Фіцджэральд прымае маладога Брыджэра як свайго сына, разбэшчваючы яго старымі парадыгмамі, якія павольна бурацца ў канцы эпохі. Яго філасофія заключана ў тым, што кожны сам за сябе, пакуты зусім не патрэбныя, а хлусня апраўданая. Усё гэта абрынецца перад тварам няпэўнасці.

Капітан Генры – фальшывы бацька. Такога бацькоўства мы патрабуем ад нашых урадаў і розных членскіх арганізацый. Трагедыя ў тым, што яны знаходзяцца ва ўладзе экспертаў і грамадскай думкі, і іх чакае жахлівы лёс апускання ў хаос і непазбежныя супярэчнасці. Генры не можа выратаваць сваіх дзяцей, сваіх людзей. Правадыр племя арыкара ўяўляе сабой свайго роду антытэзу капітану Генры.

Ён, а значыць, і яго племя, зацікаўлены знайсці сваю дачку. Ён застаецца верны сваёй тоеснасці, але карыстаецца перавагамі моцы зброі белых людзей і ведання іх мовы. Яго выклік невуцтву ператвараецца ў магчымасць для ўсіх фальшывых бацькоў перад тварам заўтрашняй няпэўнасці.

Фільм уяўляе сабой гісторыю зліцця гэтых розных прыёмаў бацькоўства і прапануе нам цікавы эксперымент у постзвыклы час. Гэтае збліжэнне адбываецца ў выніку супрацьстаяння, найбольш прыкметным з якіх з'яўляецца сутыкненне Гласа з Бацькам-грызлі ці ў дадзеным выпадку з маці-мядзведзіцай.

Уяўленне майго ўласнага бацькі пра мядзведзяў сфармавалася пад моцным уплывам падзей часоў халоднай вайны. Саветы. Чырвоны. За час маёй уласнай жыцця мядзведзі з мілага мультыплікацыйнага героя ператварыліся ў сілу прыроды. Я вырас з Віні-Пухам, Мядзведзем Ёгі і Балу. Затым наступіла чарга «Человека-грызлі» Вернера Херцага (2005 г.). Гэты дакументальны фільм быў напоўнены духам выратавання прыроды і павагі да яе прыгажосці, але ён дае нам і каштоўны ўрок. Прырода дзікая, і ўсе, хто трапляе на яе тэрыторыю, мусяць падпарадкоўвацца яе правілам. Мядзведзь – кароль амерыканскіх джунгляў. Дык чаму б не дазволіць яму стаць сапраўдным бацькам у фільме Іньярыту?

Трагедыя гэтага фільма ў тым, што канфлікт разгараецца паміж бацькамі. Як у пікніку для бацькі і сына, перамога ў гэтым спаборніцтве не залежыць ад таго, хто любіць больш, у каго больш бацькоўскай удаласці або якога-небудзь іншага пачуцця рамантызаванай бацькоўскай сувязі. Глас, Фіцджэральд, Генры, правадыр індзейцаў і мядзведзь – героі гэтай гісторыі. Канвергенцыя гэтых персанажаў адбываецца толькі ў выніку ўласціва ўсім ім невуцтва і з-за іх падыходу да няпэўнай будучыні.

Адзін з заключных кадраў фільма зноў пакідае нас сам-насам з бягучай вадой, якая імчыць праз пейзаж тундры, але цяпер вялізная пляма крыві расплываецца па беразе. Вецер, вада і свежы снег вяртаюць яму прыгажосць пачатку фільма. Такая стаўка постзвыклага часу. Ісціна не проста эмпірычная, яна патрабуе ад розуму падняцца на другі ўзровень у разважанні. Дыханне невуцтва будзе задушана ветрам прыроды.

Дык як Амерыка будзе дыхаць у постзвыклы час?

**Літаратура**

1. Гл.: Berstein, M., and Studlar, G. (eds.) (1997) *Visions of the East: Orientalismon Film.* London: I B Tauris; Sardar, Z. (1990) *Orientalism.* Buckingham: Open University Press.
2. E Ann Kaplan (2015) *Climate Trauma: Foreseeing the Future in Dystopian Film and Fiction.* Rutgers University Press.
3. Whittock, T. (1990) *Metaphor and Film.* Cambridge University Press.

# Постзвыклае праўленне

*Джордзі Серра*

Мадэрн стаў адказам на запыт аб новым выглядзе ўлады, якой патрабавалася новая легітымная крыніца, якая б парвала з сярэднявечнымі традыцыямі і структурамі. Але дапушчэнне аб тым, што свет маналітны і мае адзіную крыніцу кіруючай сілы, больш не з'яўляецца сапраўдным у шматпалярным, шматкультурным свеце. Мадэрн перажывае крызіс, і яго пераемнік постмадэрнізм проста стаў «новым імперыялізмам заходняй культуры» [1].

Агульнапрынятыя спосабы кіравання небяспечна старэюць, грамадства знаходзіцца ў стане поўнай збянтэжанасці. У выніку большасць людзей страціла ўсякую цікавасць да палітыкі. Дух часу ўяўляе сабой перапляценне няўпэўненасці і непакою, выкліканых нашай няздольнасцю зразумець, што адбываецца. Праўда і факты губляюць сваю каштоўнасць. Папулізм – натуральны вынік постзвыклага часу. Палітычныя падзеі адбываюцца і распаўсюджваюцца такімі тэмпамі, што мы ледзь за імі паспяваем.

Разгледзім выпадак Украіны. Усё пачалося з дэманстрацый у Кіеве супраць уладаў. Урад пад кіраўніцтвам прэзідэнта Віктара Януковіча хоць і быў карумпаваны, але ўсё ж абраны дэмакратычным шляхам. Галоўным злачынствам Януковіча было тое, што ён хацеў далучыць Украіну да Расіі. Захад палічыў за лепшае, каб ён замест гэтага увайшоў у НАТО. Неўзабаве ўзброеныя пратэстуючыя ў Кіеве захапілі ўрадавыя будынкі і запатрабавалі змены ўрада і канстытуцыі. Калі парламент прагаласаваў за адстаўку Януковіча, ён збег у Расію, і не менш карумпаваная былая прэм'ер-міністр Юлія Цімашэнка была вызвалена з турмы, каб выступіць перад дэманстрантамі.

Прыкладна дзесяць гадоў таму на гэтым, верагодна, усё бы і скончылася. Заходнія дзяржавы стварылі б ва Украіне ўрад "пад сябе", як яны гэта рабілі ў многіх іншых краінах. Аднак агульна-

прызнанае традыцыйнае размеркаванне ўлады і іерархіі інтарэсаў неабгрунтавана. Рэальнасць таго, што ўлада сапраўды змянілася, цяжка зразумець, не кажучы ўжо пра тое, каб прыняць гэта.

Звярніце ўвагу на комплекснасць і якія вынікаюць з яе супярэчнасці ва ўкраінскай справе. На карту пастаўлены не толькі інтарэсы дзвюх канкуруючых дзяржаў: ва Украіне пражывае 120 розных нацыянальных меншасцей і ў кожнай ёсць свае абгрунтаваныя і беспадстаўныя патрабаванні. Супярэчнасці абсалютна відавочныя. Захад ставіў вышэй за ўсё свае інтарэсы, а інтарэсам Расіі не надавалі значэння. Змена дэмакратычна абранага прэзідэнта была цалкам неканстытуцыйнай і недэмакратычнай. Дэмакратычныя патрабаванні кіеўскага натоўпу лічыліся законнымі; а дэмакратычныя патрабаванні натоўпу ў Крыме, дзе ладзіўся рэферэндум, былі прызнаныя «незаконнымі». Нашы фашысты, якія сталі неад'емнай часткай новага ўрада ў Кіеве, добрыя; а іх фашысты – расісты і дзікуны.

Калі запаліць паперу для феерверкаў у постзвыклым свеце, то вы апячэцеся гэтак жа моцна, як і аб'ект запальвання. Гэта добра відаць на прыкладзе Егіпта. Першыя дэманстрацыі супраць урада Мурсі былі арганізаваны праз Facebook і хутка перараслі ў хаатычную з'яву, якая прывяла да звяржэння рэжыму. Егіпецкія вайскоўцы скарысталіся хаосам, а секулярысты падыгралі ім. У выніку законны, дэмакратычна абраны ўрад, хоць і аўтакратычны, быў заменена праўленнем ваеншчыны. «Пераварот» не быў насамрэч пераваротам. Аніяк не наблізіўшы Егіпет да большай дэмакратыі, секулярысты ператварылі краіну ў жудасную паліцэйскую дзяржаву.

Або разгледзім постзвыклы стан Іспаніі. Следам за «залатым перыядам» для сектара нерухомасці адбыўся выбух жыллёвай мыльнай бурбалкі, што прывяло да хаатычнага калапсу. Іспанія звярнулася па дапамогу да Еўрапейскага саюза, каб падлатаць сваю банкаўскую сістэму. Іспаніі давялося перажыць сур'ёзныя скарачэнні бюджэту і некаторыя структурныя рэформы, якія прывялі да рэзкага змяншэння выдаткаў на сістэму сацыяльнага забеспячэння ў краіне. Узровень беспрацоўя ў Іспаніі вырас больш чым на 20%, з-за чаго за гэты перыяд беспрацоўнымі сталі не менш за пяць мільёнаў чалавек. На працягу шэрагу гадоў іспанская палітыка спыніла сваё развіццё з-за бязвыхаднага становішча па ўсіх напрамках. Гэты тупік паралізаваў Іспанію на некалькі гадоў.

Знойдзенае рашэнне вярнула Іспаніі статус-кво, даўшы ёй пераходны ўрад. Насельніцтва зацікаўлена толькі ў атрыманні прыбытку за кошт грамадства. Кансерватыўны ўрад Роя перамог на выбарах 2010 года. Аднак гэты кансерватыўны ўрад у канчатковым

выніку зрабіў прама супрацьлеглае таму, што абяцаў: ён не толькі не знізіў, але павысіў падаткі, а беспрацоўе не толькі не зменшылася, але адбылося яго рэзкае павелічэнне. Аднак не эканоміка была галоўнай праблемай. Ёю стала Каталонія. Каталонія хацела аддзяліцца ад Іспаніі і стаць незалежнай дзяржавай.

І што ж зрабіў іспанскі кансерватыўны ўрад, як дзейны, так і папярэдні, для вырашэння гэтых праблем? Па-першае, ён надзяліў каталіцкую царкву правам выносіць рашэнні па шэрагу сацыяльных пытанняў. Па-другое, ён урэзаў або проста скасаваў многія дэмакратычныя правы. Права на дэманстрацыі было абмежавана так званым «законам-кляпам». Стратэгічная мэта ў тым, каб ператварыць вулічныя мітынгі і дэманстрацыі ў адміністрацыйныя парушэнні [2]. Па-трэцяе, заканадаўства ў Іспаніі зладзілі такім чынам, што іпатэка стала не зусім іпатэкай, а асабістым крэдытам з рэальнымі, то бок жыллёвымі, гарантыямі. У гэтым выпадку страта маёмасці цягне за сабой спыненне крэдыту толькі тады, калі выручаная ад продажу сума пакрывае ўвесь памер крэдыту. У адваротным выпадку ранейшыя ўладальнікі ўсё адно будуць павінны рэшту пазычаных грошай. Было падлічана, што да 2015 года больш за 100 000 сем'яў былі выселены са сваіх дамоў. Сапраўдная трагедыя ў тым, што большасць з гэтых людзей не маюць работы і дагэтуль павінны банкам велізарныя грошы.

Рэгулюючыя ўстаноўкі будуюцца на агульнапрынятай прамалінейнай прычынна-выніковай сувязі. У нашы дні феномены з'яўляюцца вынікам складаных сувязяў паміж прычынай і вынікам, у якіх перамешаны многія выпадковыя чыннікі. Таму ўздзеянне толькі на адзін элемент не толькі бескарысна, але часта і надзвычай небяспечна. Палітычная дзейнасць павінна зрабіць якасны рывок, каб займець значную ролю ў постзвыклы час.

Насамрэч мы не ведаем, як фармаваць жыццяздольную палітыку для постзвыклага часу. Але ёсць тры асноўных прынцыпы, якімі мы можам кіравацца. Па-першае, неабходна прызнаць, што ніхто не кантралюе сітуацыю. Таму распрацоўка палітычных установак павінна ўлічваць і ўключаць мноства розных меркаванняў, а таксама канкуруючых і нават супярэчлівых інтарэсаў. Па-другое, мы павінны разумець, што для комплекснага асяроддзя і кіраўнічы механізм павінен быць комплексным. Каб дэмакратыі выжылі, у аснове кіравання павінны быць множнасць і разнастайнасць. Па-трэцяе, годная палітыка павінна ўлічваць уплыў станоўчай зваротнай сувязі. Як мы збіраемся справіцца з мноствам непрадбачаных наступстваў? Як мы маемся пераадольваць хаатычныя ўзрушэнні? Хоць мы і

не можам прадказаць вынік палітычных дзеянняў, мы мусім мець пэўнае ўяўленне аб іх патэнцыйных наступствах.

Адказам на постзвыклыя праблемы з'яўляецца імкненне зразумець і прыняць дынаміку постзвыклага часу і адпаведныя дзеянні.

**Літаратура**

1. Sardar, Z. (1998) *Postmodernism and the Other*. London: Pluto.
2. Kassam, A. (2015) Journalists take fight against Spanish 'gag law' to European court. *The Guardian*, December 15. URL: https://www.theguardian.com/world/2015/dec/15/journaliststake-fight-against-spanish-gag-law-to-european-court (Accessed: October 3, 2016).

# Постзвыклая Японія

*С. Скот Джордан*

У Японіі няма нічога «звыклага». Краіна дзесяцігоддзямі сутыкаецца з унутраным хаосам, няпэўнасцю і супярэчнасцямі. Рух да постзвыклага часу, паспешліва пераўтвораны ў яго падтрымку, быў не знішчэннем традыцыі, а, хутчэй, сістэматычным пазбаўленнем ад класічных элементаў грамадства. Экстрапаляцыя японскай палітыкі і дзеянняў паказвае, як на практыцы краіна прайшла праз постзвыклы час.

Тое, як развівалася сістэма арыентавання [у часе], дае неабходнае разуменне ідэі пераменаў. У мінулым змены ўяўлялі сабой канцэпцыю, за якой пільна сачылі дзяржавы, імкнучыся захоўваць кантроль і парадак. Японская дзяржава, якая зараз не мае нацыянальнага дэвіза, ідучы да новага заўтра, смела сустрэла КХС постзвыклага часу: комплекснасць, хаос і супярэчнасці. Каб зразумець, чаму Японія лепш за астатніх падрыхтавалася да постзвыклага часу, неабходна перш убачыць у гістарычнай перспектыве, як гэтая краіна спраўлялася з КХС.

Комплекснасць можна праілюстраваць на прыкладзе кубіка Рубіка. На першы погляд, калі ўсе маленькія каляровыя квадрацікі перамяшаныя, кубік здаецца даволі складанай рэччу. Тым не менш існуе шаблон, дзякуючы якому можна сабраць кубік, склаўшы кожную з яго шасці граняў у адным колеры. Насамрэч кубік Рубіка не такі ўжо і складаны, а нават даволі просты прадмет. А цяпер давайце трохі зменім правілы. Па-першае, уявім, што вы – дальтонік, а па-другое, пры кожным зробленым вамі павароце кубіка адбываецца яшчэ адзін аўтаматычны і выпадковы зрух.

Комплекснасць зусім не чужая японскаму грамадству. Жыццё і структура грамадства ў Японіі прасякнутыя жорсткімі правіламі, якія ўключаюць у сябе іерархію, лаяльнасць, павагу і рытуалы. Гісторыя Японіі – гэта хутчэй гісторыя зліцця новага, знешняга, з мясцовым і карэнным, каб стварыць нешта новае, захаваўшы пры гэтым свае традыцыйныя каштоўнасці.

Заўсёды новае, але заўсёды цалкам японскае. Адукацыя паранейшаму мае першачарговае значэнне, але ў вучэбную праграму дадаюцца новыя канцэпцыі і навучэнцы атрымліваюць адукацыю, складнікі якой прыйшлі з-за мяжы. Абсалютная ўлада імператара дапаўняецца вельмі заходнім парламентам, але гэты парламент практыкуе рытуальную павагу нароўні з ідэяй дэмакратыі. У канчатковым выніку ўсе элементы ваенізаванага грамадства выцясняюцца, але толькі для таго, каб праз гады ператварыцца ў войска, адданае ідэі «міру і бяспекі ўсяго чалавецтва».

Японцы паступова сталі ўвасабляць у сабе арганічны сінтэз Усходу і Захаду. А зараз давайце дадамо дадатковы ўзровень да нашага складанага кубіка Рубіка. Пры кожным павароце кубіка, які вы робіце, выпадковым чынам змяняецца адзін з дзевяці квадрацікаў на кожнай грані. Цяпер хаос пачынае панаваць у гэтым постзвыклым падарожжы і найменшыя змены прыводзяць да радыкальных вынікаў.

Хаос у Японіі ў значнай ступені выяўляецца ў яе барацьбе за ўладу. Аб’ект улады і тыя, хто да яго імкнуўся, далі штуршок бурнай мілітарызацыі, якая скончылася канчатковай стратай улады. Пасляваенная Японія знаходзілася пад моцным уплывам замежных ідэй, і такія успрынятыя ідэалы, як эфектыўнасць і развіццё, сур’ёзным чынам кантралявалі японскую палітыку. Зусім нядаўна была выяўлена цесная сувязь паміж эканамічным панаваннем і эканамічнай катастрофай, тэхналагічным лідарствам і разбурэннем навакольнага асяроддзя, а таксама гарманічным светам і варожай бяспекай.

А зараз вернемся да нашага кубіка Рубіка. На кожны ваш паварот робіцца іншы выпадковы паварот, і выпадковы квадрацік можа мяняць свой колер з кожным вашым новым рухам. Выпадковае змяненне колеру маленькіх квадрацікаў дазваляе кубу, напрыклад, захоўваць дзесяць квадрацікаў чырвонымі. Гэта супярэчнасць перашкаджае дасягненню мэты гульні.

Супярэчнасці назіраюцца ў пасляваенным парламенце і закліканы стаць адным з найвялікшых дасягненняў дэмакратыі. Хоць у краіне было шмат апазіцыйных партый, толькі адна, ліберальна-дэмакратычная партыя (ЛДП), была відавочна кіруючай. У цяперашні час вядуцца дыскусіі аб супярэчнасці паміж бяспекай дзяржавы і

строгім мандатам, выкладзеным у артыкуле 9 Канстытуцыі Японіі, якая забараняе фарміраванне і ўтрыманне пастаяннай арміі.

Нават у дзелавым свеце падыход Японіі да капіталізму здаецца заходнім бізнес-прафесіяналам супярэчлівым. Капіталізм падсілкоўваецца канкурэнцыяй. Японская традыцыя не лічыць спаборніцтва чымсьці вартым. Манаполія для японцаў – не дрэнные слова: калі адзін бізнес пачынае кантраляваць пэўны рынак, японцы ставяцца да гэтага з павагай, таму іншыя кампаніі шукаюць сабе іншыя рынкі. Унутраная канкурэнцыя практычна адсутнічае. Замест гэтага японскія кампаніі канкуруюць на сусветным рынку з іншымі карпарацыямі ў глабальным маштабе.

Тры кампаненты японскага навігацыйнага плана руху [у постзвыклай прасторы] даюць важныя веды аб постзвыклым часе.

Першы – просты, тычыцца японскага парламента. Тое, што пачыналася як Рада мудрацоў пры імператары,ператварылася ў збор навукоўцаў, якія маюць пачуццё грамадзянскага абавязку і змагаюцца за захаванне рытуалу, які мае глыбокае карэнне ў японскай культуры. Сёння гэта кіруючы шматгалосы орган. І калі заканадаўчыя органы іншых краін звычайна складаюцца з двух супрацьлеглых бакоў, парламент Японіі быў рэфармаваны такім чынам, каб забяспечыць максімальнае прадстаўніцтва розных галасоў японцаў.

Другі элемент японскага руху праз постзвыклы час – глабальная свядомасць. Японія ведае, што яна (свядомасць) уплывае як на тое, што адбываецца навокал, так і паддаецца ўплыву таго, што адбываецца ў астатнім свеце. Само выжыванне японцаў залежыць ад яго.

Трэці элемент – перспектыўнае мысленне. Гучыць проста, але ў спробе збалансаваць унутраную і знешнюю палітыкі аказваецца цяжка выйсці за рамкі *пашыранай сучаснасці*. Японія павінна быць на некалькі крокаў наперадзе ўсіх астатніх у сваёй палітыцы, каб выжыць. Нацыя, якая не мае пастаяннай арміі, у асяроддзі суседзяў, якія хутка сталі буйнымі ваеннымі дзяржавамі, і якая існуе ва ўмовах новага ўзмацнення гістарычнай напружанасці, краіна вымушана аддаваць прыярытэт пабудове міру ва ўсім свеце. Каб стаць вядучай эканамічнай дзяржавай, патрабуецца штосьці большае, чым простае разуменне міжнародных рынкаў і фінансаў.

Па меры таго, як феномен постзвыклага часу становіцца ўсё больш відавочным, будзе цікава назіраць за тым, як японскія правіцелі вядуць сваю дзяржаўную палітыку і прыстасоўваюцца да ўсё больш нестабільнай сусветнай абстаноўкі. Новы кубік Рубіка немагчыма сабраць метадам выпадковага падбору, але з гэтай працэдуры можна шмат чаго даведацца пра сябе і пра тое, як нам варта жыць на гэтай планеце.

# Жыццё і праца

## Гульня рэлігійных тронаў

*С. Скот Джордан*

У вас сваё меркаванне, а ў мяне сваё. Пакуль я не надумаў забіць вас. Мы думаем, што жывём у свецкую эпоху, аднак Бог паўсюль. Улада над прыняццем рашэнняў перададзена Богу. Нам застаецца здзіўляцца, чаму моладзь у вялізных колькасцях далучаецца да хрысціянскіх евангелісцкіх рухаў або пераходзіць на бок «ДАІШ», а таксама падобных ім радыкальных рэлігійных экстрэмісцкіх арганізацый, назвы якіх мільгаюць у газетных загалоўках.

Свет, створаны Джорджам Р. Марцінам у серыі кніг «Песня лёду і агню», які стаў папулярным дзякуючы тэлесерыялу «Гульня тронаў» [1], з павагай прадстаўляе і даследуе рэлігію ў тым выглядзе, у якім яна існуе ў рэальным свеце. Пры гэтым аўтар робіць тонкі намёк на рэлігійныя ўзаемаадносіны ў нашым уласным свеце і супярэчнасці, якія ўзнікаюць пры гэтым. У эпізодзе пад назвай «Тое, што мёртвае, памерці не можа» Тырыян Ланістэр, правіца караля Вэстэраса, сутыкаецца з загадкай. «Трое вялікіх мужоў сядзяць у пакоі: кароль, святар і багацей. Паміж імі знаходзіцца меч, які кожны можа купіць. І кожны муж прапануе сваю цану за меч, каб забіць двух іншых. Хто выжыве? Хто памрэ?» Варыс, які задае пытанне, адказвае на маўчанне Тырыяна выслоўем, якое дае мудры ўрок: «Улада знаходзіцца там, дзе, на думку людзей, яна знаходзіцца. Яна – выкрут, цень на сцяне, і вельмі маленькі чалавек можа пакінуць вельмі вялікі цень».

Варыс патлумачыў постзвыклы стан Сямі Каралеўстваў, а таксама даў нам важную спажыву для роздуму пра рэлігію ў наш час. Адбылося нешта дзіўнае: дзякуючы сацсеткам, кругласутачным каналам навін і іншым формам імгненных зносін маленькія людзі цяпер могуць пакідаць сапраўды вялікія глабальныя цені.

Разгледзім прыклад прапападобнага Фрэда Фелпса і яго паслядоўнікаў, вядомых як баптысцкая царква Вестбара *(Westboro Baptist Church).* Яны вядомыя сваімі экстравагантнымі пратэстамі супраць пахавання вайскоўцаў і прадстаўнікоў ЛГБТ-супольнасці. Паведамлялася, што на час смерці Фелпса ў яго царкве было ўсяго 40 членаў [2]. Пры гэтым Фелпсу ўдалося прыцягнуць вялікую ўвагу як у Амерыцы, так і ва ўсім свеце і, такім чынам, здабыць велізарную ўладу.

Пастар Тэры Джонс з пазадэнамінацыйнага Інфармацыйна-асветніцкага цэнтра «Голуб свету» *(Dove World Outreach Center)* у Гейнсвіллі, Фларыда, служыць нам яшчэ адным прыкладам. Ён быў адным з тых шматлікіх хрысціян, якія з'яўляюцца носьбітамі анты-ісламскіх настрояў, і аднойчы заявіў, што збіраецца спаліць Кур'ан [3]. У выніку дзеянняў Джонса, у якога было не больш за два дзясяткі паслядоўнікаў, і хуткасці, з якой працуюць камунікацыйныя тэхналогіі, яго намеры ператварыліся ў глабальны феномен. У рэшце рэшт, Джонс Кур'ан не спаліў, і невядома, ці меўся ён насамрэч учыніць гэты акт.

Тое, што мы назіраем, гэта не проста змена парадыгмы, а фундаментальная перабудова таго, што для рэлігіі з'яўляецца звыклай нормай, а што – не. Дзейнасць экстрэмістаў, заўзятых фанатыкаў, пурытан і прыхільнікаў гвалту, якія звычайна існуюць на перыферыі, пашырылася: яна стала глабальнай па сваіх маштабах і размаху.

Па іроніі лёсу, пакуль мы пастаянна сядзім у віртуальных супольніцтвах, рэальныя супольніцтвы практычна знікаюць. Замест таго каб размаўляць адзін з адным тварам у твар, людзі ўсё часцей аддаюць перавагу зносінам з дапамогай тэкставых паведамленняў, Facebook, Twitter і іншых сацыяльных сеткавых платформаў. Маладыя людзі становяцца ўсё больш раз'яднанымі. У эпоху знікнення сэнсу яны шукаюць яго ў сваім адчужаным, няпэўным і неадназначным жыцці.

Нядаўнія загалоўкі ў СМІ распавялі пра тое, што моладзь сімпатызуе "ідэалам" Ісламскай дзяржавы. Гэта з'ява характэрна не толькі для прыгнечаных і замкнёных. Гэта глабальны феномен. І гэта асаблівы прадукт нашага постзвыклага часу, калі "дзірка ў форме Бога", якая ўтварылася ў свядомасці людзей, можа быць запоўненая толькі чымсьці ўражлівым. Аналіз, які правялі Ганс Кюнг [4], Талал Асад [5] і Карэн Армстранг [6], дае падставу меркаваць, што рэлігія выяўляецца ў перакананні пра існаванне звышнатуральнага. Іншымі словамі, гэта не толькі вера ў звышнатуральнае, але і вера ў сваю ўпэўненасць, што ты валодаеш Абсалютнай Праўдай. Рэлігія выходзіць за межы веры і робіцца працэсам прыняцця рашэнняў і непазбежна ўступае ў канфлікт з іншымі працэсамі прыняцця рашэнняў, такімі як палітыка, навука, дзяржава і секулярызм. Такім рэлігія становіцца адзінай крыніцай упэўненасці для вернікаў. Атака на рэлігію ўспрымаецца як атака на самасць, адмова ад рэлігійных прынцыпаў успрымаецца ў грамадстве як страта самасці. А страчанае «я» – рэч небяспечная.

У постзвыклы час дадзеная з'ява будзе памнажацца неймаверна. Яна ператворыцца ў цыкл страчанага «я», які робіць непрыемнае заяўленне, пастаянна твітуецца ў сацыяльных сетках датуль, пакуль не будзе пераадолены трэндавы парог і не страчаны кантроль. Медыйная платформа, распрацаваная для аб'яднання людзей, яднае нас толькі для таго, каб адштурхнуць адзін ад аднаго яшчэ далей, знішчаючы па ходзе нашае «я». У постзвыклы час дзеянні асобных людзей ператвараюцца ў складаную пастановачную п'есу, якая складаецца з памылковых стэрэатыпаў і абуральнага невуцтва. Пры гэтым самі людзі могуць існаваць у ізаляваным кокане: адкрываючыся толькі для поглядаў, якія адлюстроўваюць іх уласныя, яны адной пстрычкай мышы набываюць усе патрэбныя навыкі і абсталяванне, неабходныя для рэалізацыі сваіх планаў. Такім чынам, вы існуеце ў *сфабрыкаванай нармальнасці*: узнікае прастора, якая стварае ўражанне, што ўсе вераць, як вы, думаюць, як вы, паводзяць сябе, як вы, і хочуць быць такімі ж, як вы. А калі вы вернік, то невялікі крок аддзяляе вас ад высновы, што на тое воля Бога. Гэта тое, што Бог хоча, каб вы рабілі.

Постзвыклы час спараджае пачуццё бездапаможнасці ў людзей з рэлігійнымі і духоўнымі схільнасцямі. У свеце, дзе вельмі мала сэнсу, значэнні знікаюць. Але наша імкненне да сэнсу павялічваецца, і мы часта знаходзім яго ўсюды, дзе шукаем. А вераванні часта перадаюць як тоеснасць, так і сэнс. Гэтая вар'яцкая пагоня за самаідэнтыфікацыяй не толькі не дае сапраўднага пачуцця прыналежнасці і сэнсу, але і ўзмацняе адчужанасць.

Тым не менш ніколі раней не было такой вялікай патрэбы ў людзях і супольнасцях з сапраўднымі рэлігійнымі і духоўнымі каштоўнасцямі. Для пераадолення шматлікіх супярэчнасцей постзвыклага часу патрабуюцца старамодныя рэлігійныя вартасці, такія як пакора, цярпенне, любоў, спачуванне і гатоўнасць ісці на кампраміс. Я б выказаў здагадку, што мэта рэлігіі павінна быць не столькі ў тым, каб увекавечыць веру ў звышчалавека, колькі ў тым, каб праяўляць любоў, спачуванне і служыць іншым. Справіцца з разнастайнасцю і множнасцю постзвыклага часу можна, толькі прызнаўшы, што вера іншых гэтак жа важная для іх, як наша вера для нас. Рэлігія павінна супрацьстаяць невуцтву ўсіх тыпаў і разглядаць няпэўнасць не як пагрозу, а як магчымасць сфарміраваць больш прывабныя варыянты будучыні.

Выдатны аптымізм заключаны ў ініцыятыве, якая распаўсюдзілася ў Даніі і вядомая як «Абдымі тэрарыста», калі грамадзяне, замест таго, каб пераследаваць маладых людзей, якія беглі ў Сірыю,

каб далучыцца да ДАІШ, добразычліва вітаюць іх і дапамагаюць зноў адаптавацца ў грамадстве [7].

Постзвыклыя часы надалі 140 выдуманым персанажам не меншую сілу, чым любой цытаце з рэлігійнага тэксту па вашым выбары. Мы вяртаемся да загадкі Варыса і задаемся пытаннем, хто застаецца ў жывых, а хто памірае. І вымушаны спытаць: дзе мы хочам бачыць уладу ў будучыні?

**Літаратура**


1. Martin, George R. R. (2012) *A Game of Thrones (A Song of Ice and Fire, Book 1).* (NewYork: Harper Voyager, 2014); Home Box Office, New York.
2. Paulson, M. (2014) Fred Phelps, Anti-Gay Preacher Who Targeted Military Funerals, Dies at 84. *The New York Times,* March 20.
3. Harris, P., and Gallagher, P. (2011) Terry Jones defiant despite murders in Afghanistanover Qur'an burning. *The Guardian*, April 2.
4. Küng, H. (1988) Theology for *The Third Millenium: An Ecumenical View*. Trans. by Peter Heinegg. New York: Doubleday.
5. Asad, T. (1993) *Genealogies of Religion: Discipline and Reasons of Power in Christianityand Islam.* Baltimore, MD: The Johns Hopkins University Press, pp. 2-27.
6. Armstrong, K. (2006) *The Great Transformation: The Beginning of Our Religious Traditions.* New York: Random House, pp. 3-48.
7. Rosin, H. (2016) How A Danish Town Helped Young Muslims Turn Away From ISIS. *NPR*, July 15.


# Перспектывы ісламскай будучыні ў постзвыклы час

*Зіяуддзін Сардар*

**Прэлюдыя**

Сённяшні ісламскі дыскурс па большай частцы можна пазначыць як зону, свабодную ад разважанняў пра будучыню. Будучыня – тэма, якая павінна хваляваць кожнага мусульманіна. Тым не менш размовы пра будучыню ў мусульманскіх колах відавочна адсутнічаюць.

Чаму такое адбываецца? Адсутнасць навуковых прац пра будучыню ісламу і мусульманскіх супольнасцей, якія можна было б абмяркоўваць, зусім не дапамагае справе. Ёсць кнігі, у назве якіх сустракаецца слова «будучыня». Але тэрмін «будучыня» выступае як прыдатак; у гэтых працах няма прызнання таго, што «будучыня» – развітая і складаная вобласць даследаванняў і вывучэння.

У пошуках кнігі, змест якіх адпавядае назве, варта звярнуцца да працы Уілфрыда Скаўэна Бланта «Будучыня ісламу» [1]. Блант цікавіўся пэўнымі трэндамі ў мусульманскіх супольнасцях; яны паказвалі на канкрэтную будучыню. Блант ілюструе асноўныя складнікі аналізу, заснаванага на перспектывах будучыні. Гаворка ідзе пра разуменне зменаў і хуткасці, з якой яны адбываюцца. Гаворка ідзе і пра разуменне трэндаў і іх экстрапаляцыі, каб убачыць, якую будучыню яны могуць сфарміраваць. Гаворка таксама ідзе аб распрацоўцы палітыкі і здзяйсненні пэўных дзеянняў у сучаснасці, якія спрыяюць дасягненню жаданай будучыні [2]. Блант таксама ілюструе яшчэ адзін ключавы момант: калі мусульмане не будуць думаць і фарміраваць уласную будучыню, іншыя з радасцю зробяць гэта за іх [3].

Адзіны выхад з цяперашняга тупіка – пачаць смела думаць катэгорыямі доўгатэрміновых перспектыў будучыні. Нам неабходна намеціць шлях да жаданай будучыні, разабрацца ў спосабах кіравання і прагназавання змяненняў і сістэматычна працаваць для дасягненняня жаданых мэтаў. Больш за ўсё нам патрэбныя інтэлектуальная смеласць і ўяўленне, каб уявіць сабе тое, што немагчыма было ўявіць раней, распрацаваць ідэі, якія дагэтуль лічыліся ерэтычнымі ці існавалі толькі на ўскрайку свядомасці, і прадбачыць альтэрнатыўныя шляхі таго, што ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі і стагоддзі можа вызначыць, што значыць быць мусульманінам.

Інакш кажучы, нам трэба развіваць яснае ўсведамленне, настроенае на будучыню.

**У пошуках будучыні**

Што менавіта я маю на ўвазе пад «свядомасцю, настроенай на будучыню»? Я маю на ўвазе разуменне паскораных змяненняў, патэнцыйных магчымасцей і пастак, якія маячаць на гарызонце недалёкай будучыні, і імкненне фарміраваць жаданую будучыню.

Думаць пра будучыню няпроста. Будучыня невядомая, і многія мусульманскія плыні адносілі яе ў значнай ступені да сферы «Божай волі». Цяжкасць ускладняецца тым фактам, што насамрэч будучыні не існуе: гэта заўсёды час, які яшчэ не надышоў. Аднак той факт, што будучыня не існуе і не можа існаваць у сапраўднасці, не азначае, што мы не можам вывучаць яе, развіваць ідэі, вобразы і метафары адносна яе, а таксама спрабаваць зразумець і сфарміраваць яго скіраванасць. Будучыня можа быць ілюзорнай і няпэўнай, але гэта тая сфера, над якой мы можам атрымаць пэўную ўладу.

Як мы можам актыўна фарміраваць перспектывы будучыні аднаго або двух будучых пакаленняў мусульманскіх супольнасцей сёння, на перыяд бліжэйшых 20-40 гадоў?

Нам неабходныя два важных інструменты. Нам трэба мець разуменне, карціну таго, якая будучыня нас чакае, калі ўсё будзе працягвацца так, як ёсць. І нам патрэбны вобраз, бачанне альтэрнатыўных магчымасцей такой будучыні, якую мы прагнем бачыць. Абодва варыянты патрабуюць творчага падыходу і ўяўлення, і для кожнага тыпу існуюць розныя метады.

**Вызначаючы месца мінулага**

Нашы варыянты будучыні таксама з'яўляюцца вынікам рашэнняў, прынятых нашымі папярэднікамі ў мінулым. Ва ўсіх грамадстваў ёсць жывая гісторыя, часта апісваная як традыцыі, якія фарміруюць іх тоеснасць (ідэнтычнасць). Будучыня без тоеснасці – увогуле не будучыня. Аднак не ўся наша мінулая гісторыя мае дачыненне да нашых перспектыў будучыні.

Задумайцеся таксама пра ідэю, што «іслам – дасканалы лад жыцця». Гэтая заява сцвярджае, што ўсе пытанні этыкі, маралі, закона, кіравання, ды і ўвогуле ўсяго чалавечага жыцця ўжо былі ўрэгуляваны некалі ў гісторыі. Калі б так яно і было, то гэтае эпічнае і маральнае развіццё, развіццё права і іншых найважнейшых абласцей чалавечай думкі цалкам спынілася б.

Яны (мы) адказныя за тое, што мусульманскія суполкі стагоддзямі дрэйфавалі ад адной непажаданай будучыні да іншай. Такі рух уяўляе сабой найбольш сур'ёзную пагрозу для пабудовы жыццяздольных і найбольш плённых варыянтаў будучыні для нас саміх.

Мусульманская гісторыя таксама мае багата канцэпцый, якія нясуць вызваленчы патэнцыял, якія адкрываюць мноства альтэрнатыў для будучыні. Магчыма, самай актывізуючай ідэяй, якая мае на мэце пастаяннае ўзаемадзеянне з сучаснасцю, а таксама з будучыняй, з'ўляецца *іджціхад*, які звычайна разумеюць як «незалежнае меркаванне / развага». Цалкам ясна, што развага – гэта не тое, што можна зрабіць раз і назаўжды; менавіта яна часта прыводзіць да інавацый. Гаворка ідзе пра адважнае і творчае разважанне аб магчымых, верагодных і пажаданых варыянтах будучыні.

Мы таксама можам бачыць усведамленне будучыні ў жыцці прарока Мухаммада. Напрыклад, ён забараніў высечку дрэў і паляванне на дзікіх жывёл у лясах вакол гарадоў, таму што яны забяспечваюць пражытак людзям і жывёлам і ахінаюць гарады зялёным поясам.

Гіджра была дбайна спланаваная, а шлях яе сістэматычна ўдакладняўся цягам некалькіх месяцаў. Прарок чакаў нападу курайшытаў. За некалькі месяцаў да Бітвы ля рова Прарок прадбачыў будучы канфлікт і падрыхтаваўся абараняць Медзіну, вырыўшы траншэю вакол горада, тым самым фактычна прадухіліўшы буйны канфлікт.

Я б сказаў, што іслам ад пачатку арыентаваны на будучыню і настойвае на тым, каб вернікі актыўна фарміравалі ўласныя перспектывы будучыні.

**Саступаючы месца сучаснасці**

Дадзены момант гісторыі – сёння – і ёсць сучаснасць, і ён адыгрывае сваю натуральную ролю ў вызначэнні нашай будучыні. Аднак сучаснасць не статычная, яна пастаянна мяняецца. Такім чынам, мы павінны ўспрымаць сучаснасць як дынамічны, зменлівы феномен, які пастаянна ўключае ў сябе новыя элементы і сітуацыі рэчаіснасці. Ёсць пяць розных элементаў такой рухавай сучаснасці, якія нам неабходна ўлічваць пры фарміраванні стабільнай будучыні.

Па-першае, відавочны факт заключаны ў тым, што мы жывём у глабалізаваным свеце. Па-другое, праблемы, з якімі мы сутыкаемся сёння, не з'яўляюцца простымі. Па-трэцяе, мы ўвесь час гатовыя сарвацца ў хаос [4]. Па-чацвёртае, сучаснасць напоўнена супярэчнасцямі, якія немагчыма вырашыць, іх можна толькі пераадолець. Па-пятае, няпэўнасць з'яўляецца нормай [5]. Ёсць і іншыя варыянты: *магчымыя перспектывы будучыні* – спалучэнне розных імавернасцей, якія мы можам сабе ўявіць; *праўдападобныя варыянты будучыні* – перспектывы, якія вызначаюцца намі з улікам бягучых умоў і гістарычнай дынамікі, якія маюць высокую верагоднасць рэалізацыі; і *жаданыя варыянты будучыні*, тыя, якія мы сапраўды хочам бачыць і да якіх імкнёмся.

**Рыхтуючыся да розных перспектыў будучыні**

Уявім, што мы апытваем выпадковую выбарку мусульман пра тое, якой яны бачаць будучыню сваіх супольнасцей. Несумненна, большасць з іх захочуць такой будучыні, якая вольная ад сектанцтва і грамадзянскіх беспарадкаў, гвалту і тэрору, катаванняў і жорсткасці, у якой іх дзеці могуць расці здаровымі і паспяховымі, у якой грамадства будзе ў міры з самім сабой і людзьмі розных веравызнанняў, з малой верай ці з яе адсутнасцю.

Нам патрэбна новая стартавая пляцоўка, каб рухацца наперад. Дзеля гэтага патрабуецца вярнуць чалавечую асобу ў ісламскі дыскурс. На прарока Мухамада не глядзяць як на чалавека. Насуперак

таму, што кажа Кур'ан, яго абвяшчаюць звышчалавекам, кожнае дзеянне якога бездакорна, яго варта капіяваць ва ўсіх дробязях. Праблема ў тым, што, калі ўсё дадзена Богам, чалавечыя намаганні і ўяўленне не адыгрываюць аніякай ролі. У вернікаў няма свабоды волі. Няма механізма паступовай змены рэлігійнай думкі і маралі, няма спосаба пабудаваць новую этыку для нашага часу.[13]

Па іроніі лёсу тыя, хто больш за ўсё дбае пра такі «іслам» і апантаны ім, хто б'е сябе ў грудзі і гучней за ўсіх крычыць аб «абароне ісламу» і шарыяту (ісламскага закона), хто настойвае на палітызацыі сваёй ідэнтычнынасці і яе рэзкім і відавочным выражэнні (праз нікаб, хіджаб або доўгую бараду), уяўляюць найбольшую пагрозу для ісламу і яго будучыні.

Для падрыхтоўкі і працы ў кірунку жаданай, праўдападобнай і жыццяздольнай будучыні ёсць дзве перадумовы. Па-першае, мэта, якую мусульмане шануюць вышэй за ўсё: данесці адзіную ісціну рознаабліčнаму грамадству і разнастайнаму свету. Па-другое, мы павінны ўсведамляць, што шарыят – гэта чалавечы канструкт, які не пазбег гістарычных памылак.

**Кода**

У нашым імкненні да жаданай, годнай будучыні для ісламу і мусульманскіх супольнасцей нам неабходна забяспечыць адкрытасць будучыні для ўсіх патэнцыйных і дысідэнцкіх магчымасцей. Мы не чакаем, калі штосьці зменіцца, а самі актыўна мяняем навакольны свет і тым самым робім гісторыю.

Безумоўна, самая вялікая праблема ў разважанні пра будучыню з ісламскага пункту гледжання – адсутнасць прыдатнай мовы. Мова – гэта не проста сродак зносін; гэта інструмент, з дапамогай якога абмяркоўваюцца сацыяльныя і культурныя патрэбы, неабходныя для выжывання. Такім чынам, існуе вострая патрэба напоўніць ісламскі дыскурс свядомасцю, арыентаванай на будучыню, і распрацаваць мову, якая заахвоціць нас глядзець наперад, а не назад.

**Літаратура**

1. Wilfred Scawen Blunt (1882) *The Future of Islam*. London; reprinted by Sind Sagar Academy, Lahore, 1975. Усе цытаты ўзятыя з дадзенага выдання.
2. Гл.: Sardar, Z. (2013) *Future: All that Matters*. London: Hodder, для агульных уводзінаў у курс вывучэння будучыні.

[13] Тут і далей аўтар ідзе насуперак артдаксальнаму (сунніцкаму) дыскурсу і пярэчыць традцыйным ісламскім каштоўнасцям і нормам. – *Заўв. пер.*

3. Больш падрабязна пра тое, як можна каланізаваць будучыню, гл.: Sardar, Z. (1993) Colonising the Future: The 'Other' Dimension of Future Studies. *Futures,* 25 (3); and: Other Futures: Non-Western Cultures in Futures Studies (1996). In: Richard A. Slaughter (ed.)
*The Knowledge Base of Future Studies: Directions and Outlook*, vol. three. DDM MediaGroup / Futures Study Centre, Hawthorn, Victoria; and: Sardar, Z. (ed.) (1998) *Rescuing All Our Futures: The Future of Future Studies.* London: Adamantine Press; Westport, CT: Praeger Publishers.
4. Больш аналітычнае тлумачэнне таго, што адбываецца, калі мы гатовыя «сарвацца ў хаос», гл.: Sardar, Z. (1998) *Introducing Chaos.* Cambridge: Icon Books; гл. таксама: What Chaos? What Coherence? Across the River I Called (1994). In: MikaMannermaa, Sohail Inayatullah and Rick Slaughter (eds.) *Coherence and Chaos in Our Uncommon Futures: Visions, Means, Actions.* Turku: Finland Future Studies Centre;and: Conquests, Chaos, Complexity: The Other in Modern and Postmodern Science. *Futures,* 26 (6), July / August 1994, pp. 665-682.
5. Гл.: Bammer, G., and Smithson, M. (eds.) (2008) *Uncertainty and Risk: Multidisciplinary Perspectives.* London: Earthscan.

# Навука і навукоўцы у постзвыклую эпоху

*Джэром Р. Равец*

Добра вядома, што новыя інфармацыйныя тэхналогіі карэнным чынам мяняюць працу большасці сфер. Магчымасці даследчыцкай навукі ў многіх галінах пашыраюцца і нават трансфармуюцца. Узнікаюць важныя новыя распрацоўкі, але не абавязкова «новыя формы навукі». У дадзеным артыкуле мы разглядаем практыкі і структуры, якія выклікаюць здзіўленне і неспакой, трапляючы ў поле зроку, і якім уласцівы ўнутраны імпульс для працягу хуткіх зменаў.

**Экскурс у гісторыю**

Каля паўвека назад навукоўцы ўсвядомілі, што ўсё змянілася. Бягучая сітуацыя ў навуцы змяняецца вельмі хутка.

Зменлівая самасвядомасць навукі цягам папярэдняга перыяду з'яўляецца напамінам пра тое, што ў сацыятэхнічнай сістэме навуковага свету інтэлектуальныя і матэрыяльныя аспекты глыбока ўзаемазвязаны адзін з адным.

Навука стала «індустрыялізаваная» па многіх параметрах: у сваім аб'ёме наогул, у маштабе асобных прадпрыемстваў і ў сваіх адносінах з прамысловасцю, якія сталі больш цеснымі. Яна таксама

набыла рысы «інкарпаравання» [1], гэта значыць удзелу ў справах дзяржавы markdown рознымі спосабамі. Навукоўцы да пэўнай ступені наіўна лічылі, што іх просяць «сказаць праўду ўладам», тады як іх кліенты часта хацелі атрымаць «палітычна абгрунтаваныя доказы». Што ж тычыцца стасункаў з больш шырокай грамадскасцю, то сталі вядомыя маніпуляцыі і скажэнні даследаванняў, звязаныя з камерцыйнай галіной. Нешта падобнае, у менш скандальнай, хоць і ў не менш важнай форме, знайшло адлюстраванне ў практыцы работы з міністэрствамі і дзяржаўнымі агенцтвамі.

### Структуры навуковай дзейнасці

Сёння шырока прызнана, што старое ўяўленне аб «вучоным», які робіць адкрыццё, а затым перадае яго «грамадству», з'яўляецца занадта спрошчаным. Перш за ўсё, варыянты матываў для ўдзелу ў даследаваннях або іх падтрымцы вельмі разнастайныя. Тая першапачатковая матывацыя – усяго толькі першы крок у шматэтапным цыкле тлумачэння складанасці і блытаніны, якая суправаджае дэбаты наконт удзелу навукі ў палітыцы.

Што тычыцца нашых бягучых праблем, то якасць падмяніла ісціну як асноўны эфектыўны кіруючы прынцып навукі. Неабходная наяўнасць этычных абавязацельстваў, якія павінны выконвацца на самым высокім узроўні ў любой установе. Калі гэтага няма, абавязкова ўзнікаюць карупцыя і бессэнсоўныя даследаванні.

### Персанал

Усё больш шырокае прызнанне атрымлівае той факт, што навука, арыентаваная на распрацоўку нарматыўна-прававых аспектаў, дамагаецца больш эфектыўнага выніку, калі ўжо на ранніх этапах даследаванняў выкарыстоўваецца пашыраны вопыт, а не толькі досвед палітыкаў, навуковых дарадцаў і экспертаў. Удзел грамадзян робіцца ўсё больш запатрабаваным і карысным. У традыцыйных навуковых даследаваннях існуе даўняя практыка прыцягнення аматараў, якія ўносяць свой уклад. Але ў апошні час такім людзям адводзілася роля памочнікаў з больш нізкім статусам. Тым не менш іх актыўны ўдзел увесь час нарастае. У выніку традыцыйны статус «вучонага» паступова размываецца.

### Працэдуры

Падобнага ж роду працэс змен, які бачыцца то як эрозія, то як дэмакратызацыя, працякае ў галіне працэдур. Доўгі час існавала ўніверсальная вера ў навуковы метад, у тыя працэдуры, з дапамогай

якіх навука беспамылкова дае правільныя адказы на праблемы, якія распрацоўваюцца. З ростам няпэўнасці, а затым і комплекснасці ведаў і палітыкі гэтая матывуючая вера паступова губляла пераканаўчасць. Немагчымасць вылучыць метад, які не з'яўляецца лагічна памылковым, ускладняе цяжкасці. Што да мадэляў, тое лепшае, што можна сказаць, гэта класічнае «усё мадэлі памылковыя, але некаторыя карысныя». Аднак, відаць, навуковая супольнасць востра ўсведамляе наяўнасць дадзеных праблем. Гэта можа прывесці да адначасовага ўзнікнення процілеглых эфектаў: стымуляваць рэформы і ўзмацніць цынізм.

**Уласнасць**

У папярэднюю эпоху сацыяльныя адносіны ў сферы ўласнасці не мяняліся з вялікай хуткасцю; адбывалася пастаяннае высвятленне традыцыйных «агульнадаступных ведаў» тым, што мы маглі б назваць «карпаратыўным ноў-хаў». Аднак у апошнія гады з'явілася прызнанне глыбока парадаксальнай сітуацыі ў кіраванні інтэлектуальнай уласнасцю. Паўстала перасцярога, што прагрэс у дадзенай вобласці сур'ёзна замаруджваецца з-за мноства правоў уласнасці, якія абараняюць розныя веды і тэхнікі, неабходныя для даследаванняў.

**Галоснасць**

Яшчэ больш хуткія змены адбываюцца ў сферы галоснасці, якая ў канчатковым выніку з'яўляецца жыццёвай сілай навуковай дзейнасці і ўключае ў сябе інфармацыю. Важным для самасвядомасці навукі служыць раптоўнае адкрыццё, што на самой справе існуе надзённая і глыбока праблематычная палітэканомія публічнасці. Навуковыя публікацыі не бясплатныя і не надта танныя. Праблема выдаткаў і ўзнагароды ў лічбавую эпоху, якая ўжо закранула крэатыўныя індустрыі, раптам з'явілася і ў навуцы. Дзякуючы публікацыі ў лічбавым фармаце бягучае даследаванне цяпер можа быць у цэнтры бесперапыннага патоку калектыўнага дыялогу і развіцця, у якім можа адбывацца часовая крышталізацыя «прадукту» для зручнасці.

**Гарантыя якасці**

Больш драматычным з'яўляецца ўплыў новых тэхналогій на цыкл забеспячэння якасці. Традыцыйна сістэмы забеспячэння якасці навукі працавалі ў асноўным нефармальна і ў значнай ступені канфідэнцыйна. Як паказаў прыклад Вікіпедыі, усе рэдакцыйныя працэсы

могуць быць не толькі зручнымі, але і празрыстымі. Тое, што раней было надзіва закрытым аб’ектам, які не прыцягваў шырокай грамадскай увагі да сваёй працы, пры амаль поўнай адсутнасці журналісцкіх расследаванняў, цяпер пачынае адкрывацца.

**Наступствы**

Бліжэй да канца цыклу нас чакаюць наступствы. Традыцыйна вынікі навуковай дзейнасці лічыліся ў асноўным станоўчымі, а з практычнага пункту гледжання – выключна спрыяльнымі. Таму навуковец мог з чыстым сумленнем перадаць вынікі сваёй дзейнасці грамадству. Сёння пытанне наступстваў прызнана вырашальным у дыскусіях па пытаннях палітыкі ў сферы новых тэхналогій, а таксама пры абмеркаванні больш усёабдымных палітычных момантаў. Мы зразумеем, што навука сапраўды ўступіла ў новую эпоху тады, калі негатыўныя прыклады навуковай дзейнасці будуць прызнаныя прадметам, годным выкладання ў рамках гуманітарнай адукацыі для прыродазнаўцаў.

**Роля постзвыклай навукі**

У працэсе змянення свету ўзровень развіцця свядомасці заўсёды адстае ад практыкі. Задача стварэння новай ідэалогіі для навукі ў гэтых новых умовах з’яўляецца першачарговай, паколькі карупцыя ў навуковай сферы квітнее. Няма ніякай гарантыі, што навука ў тым выглядзе, у якім мы яе ведаем, выжыве.

Паколькі ў працэсе атрымання навуковай адукацыі студэнты цалкам абаронены ад названых праблем, яны губляюцца, упершыню сутыкнуўшыся з імі на практыцы. Калі яны спрабуюць падзяліцца сваімі перажываннямі з калегамі, іх часта пачынаюць пазбягаць як носьбітаў нязручных ведаў. У многіх выпадках тэзіс аб постзвыклай навуцы служыў сігналам вызвалення.

Постзвыклая навука адкрывае шлях да множнасці пунктаў гледжання, да разумення права на памылку, да ўсведамлення свайго невуцтва і да пакоры. Характарызуючыся простымі ключавымі ідэямі, яна дазваляе нам убачыць, як існуючы вобраз навукі спрыяе абмежаванасці, нецярпімасці і ганарлівасці. У гэтай сувязі навука як інстытут вымушана глядзець на сябе рэалістычна, а не праз ідэалагічныя акуляры. Магчыма, у будучыні давядзецца прайсці яшчэ трохі па гэтым шляху.

**Літаратура**

1. Rose, S. and H. (1969) *Science and Society*. London: Allen Lane.

# Творчасць і лідарства у постзвыклы час

*Альфонса Мантуоры і Габрыэль Данэлі*

**Уводзіны**

Комплекснасць, плюралізм і нявызначанасць жыцця здаюцца ашаламляльнымі. Уяўленне і яго больш шырокае паняцце, творчасць, неабходныя «для таго, каб уявіць сабе выйсце з постзвыклага часу». Творчая дзейнасць ператварылася з займальнай, другаснай, дзіўнай і невытлумачальнай з'явы ў рухавік сацыяльных змяненняў і пераўтварэнняў. У пераходны час, падобны да нашага, нам неабходна зразумець, адкуль мы прыйшлі і як нас сфарміраваў наш час, каб рухацца да іншай будучыні.

**Гістарычныя карані**

Да 1980-х гадоў творчая дзейнасць на Захадзе даследавалася ў асноўным у межах дысцыпліны псіхалогіі. Асноўная ўвага надавалася персоне, працэсу і прадукту [1]. Адзінкай аналізу быў амаль выключна незвычайны або, іншымі словамі, «выдатны» чалавек [2].

**Зменлівы твар творчасці і лідарства**

Мяняецца тое, як мы разумеем, практыкуем і выказваем нашу творчасць. Творчая дзейнасць вядзе да пераменаў, а перамены – да творчасці. Тры асноўныя трэнды ўключаюць у сябе: (а) разгляд творчасці як больш сеткавага, калектыўнага працэсу, (б) паўсядзённага, паўсюднага, усеагульнага працэсу, а не чагосьці абмежаванага выключна дзейнасцю геніяў [3; 4], і (в) артыкуляцыя творчасці як формы лідарства, а лідарства як формы творчасці [5; 6; 7; 8; 9; 10; 11].

Лідарства і крэатыўнасць пераходзяць ад гераічнага, вялікага чалавека да больш адноснага, размеркаванага «для ўсіх / усюды / кожны дзень» працэсу. Лідарства можа быць формай самастварэння ў кантэксце сацыяльнай адказнасці і развіцця магчымасцей і альтэрнатыў у свеце. На што накіравана наша творчая дзейнасць? Кіраўнікі павінны даваць справаздачу, адказваючы за кірункі прымяненне чалавечага творчага патэнцыялу, а творчы падыход павінен даць кіраўнікам новыя шанцы і магчымасці для выхаду за межы постзвыклага часу.

**Пераўтвараючая творчасць**

У цяперашні час у даследаваннях псіхалогіі творчасці ўсё больш увагі надаецца паўсядзённай творчасці. *Месца* для творчасці

цяпер патэнцыйна знаходзіцца ўсюды. Пра гэта кажуць новыя даследаванні інавацый, групавой творчасці, джаза, а таксама нарастаючае прызнанне «мудрасці натоўпу», творчага патэнцыялу «адкрытых інавацый», калі да абмеркавання складаных праблем далучаецца грамадскасць, што дапамагае генераваць патрэбныя адказы [12; 13; 14; 15; 16; 17; 18].

Сёння ўзнікаюць пытанні аб тым, ці прывядзе тое, што мы называем творчасцю «для ўсіх / усюды / кожны дзень», да росту нарцысізму, спажывецкага эгацэнтрызму і згладжванню усіх каштоўнасных арыенціраў, з прычыны чаго «Я-пакаленне» будзе выглядаць пазітыўна-альтруістычным, або творчая энергія можа быць накіравана на годныя памкненні [19; 20; 21].

### Пераасэнсаванне лідарства

У пераходную эпоху мы не звязаны фіксаванымі ролямі або лёсамі. Новае лідарства не абавязкова азначае, што трэба быць кіраўніком пастаянна. Лідарства таксама ўсё часцей разглядаецца як гетэрархічнае, заснаванае на здольнасці дзейнічаць у пэўным кантэксце, выконваць спецыфічную задачу і вырашаць пэўную сітуацыю.

### Кланы і заводы

У папулярнай кнізе Сэта Годзіна «Кланы» ёсць два карысныя вобразы, якія дапамогуць нам зарыентавацца ў фарміруемым новым разуменні лідарства. Яго аргумент заключаецца ў тым, што з «эпохі заводаў» мы перайшлі ў «эпоху кланаў». «Клан, – піша Годзін, – гэта група людзей, звязаных адзін з адным, звязаных з лідарам і звязаных ідэяй» [22].

Заводы вялікія, іерархічныя, груваcткія, нягнуткія; яны, як правіла, не схільныя да інавацый. Кіраўніцтва завода складаецца з абмежаванай колькасці людзей. Камандаванне і кантроль – цэнтральныя асаблівасці кіраўніцтва на заводах. Кланы з’яўляюцца сеткавымі, гнуткімі і гетэрархічнымі, што дазваляе лідарству праяўляцца ў множнасці крыніц [23]. Дэмакратызацыя кіраўніцтва робіцца ўсё больш папулярнай перспектывай.

### Заключныя разважанні

Мы жывём у постзвыклы час. Творчасць і ўяўленне неабходныя для прадстаўлення новага свету. Творчая дзейнасць вядзе нас у гэты новы свет; дзякуючы яму мы ўяўляем сабе разнастайныя альтэрнатывы. Гэта азначае, што творчы падыход патрабуе большай адказнасці, чым калі-небудзь раней. Творчыя асобы – гэта тыя ж

лідары. Людзі вучацца працаваць разам, нягледзячы на адрозненні, каб знаходзіць новыя рашэнні старых праблем. Магчыма, жыццё ніколі больш не стане «звыклым», але нам сапраўды ёсць чаго чакаць і да чага імкнуцца.

**Літаратура**


1. Runco, M. (2007) *Creativity. Theories and Themes: Research, Development, and Practice.* Amsterdam: Elsevier.
2. Glaveanu, VP (2010) Paradigms in the study of creativity: Introducing the perspectiveof cultural psychology. *New Ideas in Psychology*, 28, pp. 79-93.
3. Montuori, A. (2011) Beyond postnormal times: The future of creativity and the creativity of the future. *Futures: The Journal of Policy, Planning and Future Studies*, 43 (2),pp. 221-227.
4. Montuori, A. (2013) Creativity and the Arab Spring. *East-West Affairs*, 1 (1).
5. Burns, J.M. (2004) *Transforming Leadership: The Pursuit of Happiness.* New York: Grove.
6. Csikszentmihalyi, M. (2004) *Good Business: Leadership, Flow, and the Making of Meaning.* New York: Penguin.
7. Gardner, H. (1995) *Leading Minds.* New York: Basic Books.
8. Hooker, C., and Csikszentmihalyi, M. (2003 г.) Flow, creativity, and shared leadership. In: C.L. Pearce & J.A. Conger (eds.) *Shared Leadership: Reframing the Hows and Whys of Leadership.* Thousand Oaks, CA: Sage, pp. 217-234.
9. Montuori, A. (2010) Transformative leadership for the 21st century. Reflection-son the de sign of a graduate leadership curriculum . *ReVision*, 30 (3-4), pp. 4-14.
10. Simonton, D.K. (1984) *Genius, Creativity, and Leadership: Historiometric Inquiries.* Cambridge: Harvard University Press.
11. Sternberg, RJ (2007 г.) A Systems Model of Leadership. WICS. *American Psychologist*, 62 (1), p. 34.
12. Barron, F. (1999 г.) All Creation is a Collaboration. In: A. Montuori & R. Purser (eds.) *Social Creativity.* Cresskill, NJ: Hampton, vol. 1, pp. 49-60.
13. Wheatley, M. (2006). *Leadership and the New Science.* San Francisco: Berrett-Koehler.
14. Andreasen, N.C. (2006) *The Creative Brain: The Science of Genius.* New York: Plume.
15. Montuori, A. (2003) The complexity of improvisation and the improvisation of complexity.Social science, art, and creativity. *Human Relations*, 56 (2), pp. 237-255.
16. Paulus, P.B., & Nijstad, B.A. (eds.) (2003) *Group Creativity: Innovation Through Collaboration.* New York: Oxford University Press.
17. Schrage, M. (1999) *Serious Play: How the World's Best Companies Simulate to Innovate.* New York: Harvard Business School Press.
18. Surowiecki, J. (2005) *The Wisdom of Crowds.* New York: Anchor.
19. Toffler, A., & Toffler, H. (2006) *Revolutionary Wealth.* New York: Knopf.
20. Greenberg, E., & Weber, K. (2008) *Generation We: How Millennial Youth are Taking Over America and Changing our World Forever.* Emeryville: Pachatusan.
21. Twenge, J.M., & Campbell, W.K. (2010) *The Narcissism Epidemic: Living in an Age of Entitlement.* New York: Free Press.
22. Godin, S. (2009) *Tribes. We Need You to Lead Us.* New York: Portfolio.
23. Sardar, Z. (1990) *Postmodernism and the Other.* London: Pluto Press.

## Пра аўтараў

**Габрыэль Данэлі,** пісьменнік і эксперт па сацыяльных зменах і іннавацыях, атрымала доктарскую ступень у галіне даследаванняў пераўтварэняў у Каліфарнійскім інстытуце інтэгральных даследаванняў. Яна з'яўляецца партнёрам кампаніі *Collective Wisdom Solutions,* кансультацыйнай службы, якая займаецца увасабленнем ідэй у жыццё і працуе з дзяржаўнымі, прыватнымі і некамерцыйнымі арганізацыямі, са штаб-кватэрай у г. Галіфакс, Новая Шатландыя (Канада).

**Шырын Элахі**, эксперт па рызыках, няпэўнасці, зменам і сцэнарным планаванні. Яна часта выступае з лекцыямі, у тым ліку ў *Said Business Center*, Оксфардскі універсітэт; бізнес-школе *HEC (École des hautes études commerciales de Paris)*, Парыж; у Міжнародным інстытуце прыкладнога сыстэмнага аналізу (IIASA), Лаксенбург (Аўстрыя); і ў даследчым цэнтры рызык імя Бенфілда Грэйга пры ўніверсітэцкім каледжы Лондана (UCL). Яна з'яўляецца кіруючым дырэктарам *Scenarios Architecture*, кансалтынгавай кампаніі па стратэгічным планаванні для сеткавых спецыялістаў, якія працуюць са складанымі глабальнымі рызыкамі.

**Сільвіа О. Фунтовіч** выкладаў матэматыку, логіку і метадалогію даследаванняў у г. Буэнас-Айрэс (Аргенціна). На працягу многіх гадоў ён быў запрошаным навукоўцам ў Аб'яднаным даследчым цэнтры Еўрапейскага супольнасці ў Іспры (Італія), дзе займаўся аналітычнай філасофіяй ў галіне даследаванняў навукі і тэхналогій. Разам з Джэромам Равецам ён стварыў NUSAP, сістэму пазначэнняў, якія характарызуюць няпэўнасць і якасць у колькасных выражэннях, і прадставіў канцэпцыю постзвыклай навукі. У цяперашні час ён з'яўляецца прафесарам Цэнтра вывучэння прыродазнаўчых і гуманітарных навук (SVT) ва Універсітэце Бергена (Нарвегія).

**С. Скот Джордан**, філосаф і палітолаг, працуе ў Азіяцкім сусветным цэнтры пры Універсітэце Крэйтан у г. Амаха, штат Небраска. Ён з'яўляецца членам Міжнароднага кансорцыума супраць гвалту *(Nonkilling Consortium International)*, працаваў з Фондам Сун Чынг Лін ў Кітаі. Скот рэгулярна публікуецца ў штоквартальным часопісе *Critical Muslim* і вядзе радыёшоу і падкаст *Tea Talk Asia*. Яго даследчая праца засяроджаная на постзвыклым кампаненце міжнародных адносін, палітыкі і кіравання, якія ён часта даследуе праз прызму кінематографа. Ён з'яўляецца навуковым супрацоўнікам Цэнтра постзвыклай палітыкі і даследаванняў перспектыў будучыні (CPPFS).

**Альфонса Мантуоры**, прафесар кафедры даследаванняў пераўтварэнняў Каліфарнійскага інстытута інтэгральных даследаванняў; з'яўляецца аўтарам некалькіх кніг пра творчасць, комплекснасць, сацыяльныя змены, кіраванне і адукацыю, у тым ліку сурэдактар двухтомніка *«Social Creativity»* («Сацыяльная крэатыўнасць», выд-ва Hampton Press, 1999) і кнігі, якая выйшла не так даўно *«Journeys in Complexity»* («Падарожжы па комплекснасці», Лондан: Routledge, 2015). Ён з'яўляецца галоўным рэдактарам часопіса *Advances in Systems Theory, Complexity, and the Human Sciences,* выдавецтва Hampton Press, і памочнікам рэдактара ў часопісе *World Futures: The Journal of General Evolution.*

**Джэром Р. Равец**, вядомы філосаф навукі, які праславіўся сваімі неардынарнымі працамі пра рызыку, навуковую аб'ектыўнасць і гісторыю навукі. Яго кніга *«Scientific Knowledge and Its Social Problems»* («Навуковае веданне і яго сацыяльныя праблемы», OUP, 1971) лічыцца асноватворнай працай. Сярод іншых яго кніг: *«The Merger of Knowledge with Power»* («Зліццё ведаў з уладай», Лондан: Cassell, 1990), (сумесна з С. О. Фунтовічам) *«Uncertainty and Quality in Science for Policy»* («Няпэўнасць і

якасць навукі для палітыкі», Kluwer, Dordrecht, 1990), (з Зіяуддзінам Сардарам) *«Cyberfutures»* («Перспектывы кібербудучыні», Лондан: Pluto, 1997) і *«Introducing Mathematics»* («Уводзіны ў матэматыку», Кембрыдж: Icon, 1998). Яго лічаць бацькам постзвыклай навукі. Разам з Сільвіа Фунтовічам Равец распрацаваў NUSAP, сістэму пазначэнняў, якія характарызуюць няпэўнасць і якасць у колькасных выразах. У цяперашні час з'яўляецца навуковым супрацоўнікам Інстытута навукі і цывілізацыі імя Джэймса Марціна пры Оксфардскім універсітэце.

**Зіяуддзін Сардар**, пісьменнік, футуролаг і асветнік, з'яўляецца сусветна вядомым грамадскім інтэлектуалам. Ён апублікаваў больш за 50 кніг, у тым ліку *«Rescuing All Our Futures»* («Ратуючы усе варыянты нашай будучыні», Нью-Ёрк: Adamantine, 1998), *«Islam, Postmodernism and Other Futures: A Ziauddin Sardar Reader»* («Іслам, постмадэрнізм і іншыя перспектывы будучыні: хрэстаматыя Зіяуддзіна Сардара», Лондан: Pluto 2003) і *«Future: All That Matters»* («Будучыня: усё, што важна», Лондан: Hodder, 2013). З 1999 па 2012 год ён быў галоўным рэдактарам *Futures*, штомесячнага часопіса даследаванняў палітыкі, планавання і перспектыў будучыні, а з 2006 па 2009 год займаў пасаду ўпаўнаважанага ў Камісіі Вялікабрытаніі па пытаннях роўнасці і правоў чалавека. Сардар з'яўляецца дырэктарам Цэнтра постзвыклай палітыкі і даследаванняў перспектыў будучага (CPPFS).

**Джордзі Серра**, футуролаг, кансультант і асветнік, дацэнт факультэта камунікацый і міжнародных адносін Універсітэта Рамона Льюля – Бланкерна ў Барселоне (Іспанія). Раней ён узначальваў аддзел форсайт-даследаванняў Цэнтра кіравання рызыкамі Аўтаномнага ўніверсітэта Барселоны. Ён уваходзіць у склад рэдакцыйнага савета часопісаў *Futures, World Future Review* і *Revista IAPEM*. Джордзі апублікаваў шэраг кніг на іспанскай мове, сярод якіх *«Inteligencia y análisis prospectivo: La gestión de la incertidumbre»* (Secretariade Inteligencia, Quito, 2014). Ён з'яўляецца дырэктарам па даследаваннях Цэнтра постзвыклай палітыкі і даследаванняў перспектыў будучыні (CPPFS).

**Джон А. Суіні**, футуролаг, кансультант і асветнік. Супрацоўнічае з універсітэтамі, агенцтвамі міжнароднага развіцця і гуманітарнай дапамогі, некамерцыйнымі фондамі, адукацыйнымі і культурнымі арганізацыямі, уключаючы ЮНІСЕФ, ЮНЕСКА, Глабальны цэнтр перадавога досведу дзяржаўнай службы ПРААН, Аб'яднаны даследчы цэнтр Еўрапейскай камісіі і Міжнародную федэрацыю таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца. Джон з'яўляецца сааўтарам кнігі *«Mutative Media: Communication Technologies and Power Relations in the Past, Present, and Futures»* («Мутацыйныя СМІ: камунікацыйныя тэхналогіі і суадносіны уладаў у мінулым, сучаснасці і будучыні», Springer, Dordrecht, 2015). Джон – намеснік дырэктара Цэнтра постзвыклай палітыкі і даследаванняў перспектыў будучыні (CPPFS).

**Цэнтр постзвыклай палітыкі і даследаванняў перспектыў будучыні (CPPFS)**: міжнародная даследчая і кансультатыўная сетка, якая надае асаблівую ўвагу людзям і суполкам, якія займаюць далёка не вядучае становішча. Цэнтр спрыяе павышэнню ўзроўню ведаў у пытаннях, якія тычацца будучыні і разумення постзвыклага часу, робячы акцэнт на новыя сродкі арыентацыі ў кантэксце супярэчлівых, комплексных і хаатычныхь сітуацый і з'яў. Праца Цэнтра накіравана на прасоўванне крытычных даследаванняў, навучанне праз дзеянні і развіццё этычнага ўяўлення для фарміравання дэкаланізаванай, альтэрнатыўнай і жаданай будучыні.

# Змест

**ПРА СЕРЫЮ** .......... 3
ШТО Ж АДБЫЛОСЯ? .......... 5
Уводзіны .......... 5
ВЫТОКІ І ТЭОРЫЯ .......... 6
Навука постзвыклай эпохі .......... 6
Прырода ўмешваецца ў навуковую лабараторыю .......... 7
Цэнтральная роля няпэўнасці і якасці .......... 7
Стратэгія вырашэння праблем .......... 7
Прыкладная навука .......... 8
Прафесійнае кансультаванне .......... 8
Постзвыклая навука .......... 8
Пашыраныя супольнасці роўных .......... 9
Заключэнне .......... 9
САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ У ПОСТЗВЫКЛЫ ЧАС .......... 10
Комплекснасць .......... 10
Хаос .......... 11
Супярэчнасці .......... 11
Няпэўнасць .......... 12
Маральныя вартасці .......... 12
Уяўленне .......... 13
Яшчэ раз пра постзвыклы час .......... 14
Постзвыклы час і яго змест .......... 14
Постзвыклы стан .......... 15
Пашыраны цяперашні этап постзвыклага часу .......... 16
«Будзь постзвыклым» .......... 16
МЕТАДЫ І ПЫТАННІ .......... 17
«Тры заўтра» постзвыклага часу .......... 17
Уводзіны .......... 17

Звыклая норма, постзвыкласць, постзвыклае спаўзанне і выбух....18
Тры заўтра асноў постзвыклага часу....19
Невуцтва, няпэўнасць і звярынец постзвыклых магчымасцей..20
Праца з "трыма З"....21
Месца "трох З" ў даследаванні перспектыў будучыні....22
Заразлівая ўзаемазвязанасць: ілюстрацыя «трох заўтра»....23
Наколькі постзвыклымі з'яўляюцца часы?....24
Чорныя сланы *пашыранай сучаснасці*....24
Чорныя лебедзі перспектыў *знаёмай будучыні*....24
Чорныя медузы перспектыў *неверагоднай будучыні*....25
Сцэнары....26
Падштурхоўваючы і ўзважваючы перспектывы будучыні....27
Невуцтва, нявызначанасць і "а што, калі?"....28
Навадныя пытанні....28
Заключэнне: кантэксты «а што, калі?»....30
«Тут жывуць цмокі»: даследуючы «невядомае невядомае»....31
Уводзіны....31
Прыклады «Тут жывуць цмокі»....31
Прызнанне вобласці «тут жывуць цмокі»....32
Сцэнары як аналіз мета-рызык....32
Заключэнне....32
ПРАСТОРА І ЧАС....33
Постзвыклыя артэфакты....33
Глабальнае адзівачванне....42
Адносіны "Усход – Захад" у постзвыклы час....44
Супярэчнасці Еўрапейскага саюза....46
Постзвыклая Амерыка ў кіно....50
Постзвыклае праўленне....54
Постзвыклая Японія....57
Жыццё і праца....60

Гульня рэлігійных тронаў ....................60
Перспектывы ісламскай будучыні ў постзвыклы час ....................63
Прэлюдыя ....................63
У пошуках будучыні ....................64
Вызначаючы месца мінулага ....................65
Саступаючы месца сучаснасці ....................66
Рыхтуючыся да розных перспектыў будучыні ....................66
Кода ....................67
Навука і навукоўцы у постзвыклую эпоху ....................68
Экскурс у гісторыю ....................68
Структуры навуковай дзейнасці ....................69
Персанал ....................69
Працэдуры ....................69
Уласнасць ....................70
Галоснасць ....................70
Гарантыя якасці ....................70
Наступствы ....................71
Роля постзвыклай навукі ....................71
Творчасць і лідарства у постзвыклы час ....................72
Уводзіны ....................72
Гістарычныя карані ....................72
Зменлівы твар творчасці і лідарства ....................72
Пераўтвараючая творчасць ....................72
Пераасэнсаванне лідарства ....................73
Кланы і заводы ....................73
Заключныя развражанні ....................73
Пра аўтараў ....................75

# Хрэстаматыя постзвыклага часу

Рэдактар: Зіяуддзін Сардар

Скарочаная версія: Скот Джордан

Пераклад: Давуд Радкевіч

Вокладка: Шыраз Хан

Макет: Гасан Гасанаў

**Серыя “Свет сучаснага ісламу”** знаёміць чытача з серыяй «Books-in-Brief», зборам асноўных выданняў Міжнароднага інстытута ісламскай думкі, прадстаўленых у кароткім выкладзе. Палегчаны фармат дазваляе зэканоміць час, даючы чытачу рэальную магчымасць атрымаць уражанне аб поўнай версіі кожнай кнігі і дапамагае паглыбіцца ў сутнасць арыгінала. Серыя складаецца са своеасаблівых сінапсісаў-аглядаў поўных выданняў, якія, спадзяемся, заахвоцяць чытачоў да далейшага, больш глыбокага вывучэння арыгіналаў.

Мы жывём у перыяд пераменаў, якія пастаянна паскараюцца. Новыя трэнды, тэхналогіі і крызісы ідуць адзін за адным, трансфармуючы традыцыйныя сацыяльныя і палітычныя ландшафты. Звыклая сістэма каштоўнасцей і ідэалаў можа абрынуцца ўраз: нібы ніадкуль з'яўляюцца новыя паняцці, усё часцей адбываюцца незвычайныя падзеі, пашыраюцца і робяцца пануючымі. Толькі за апошнія некалькі гадоў мы сталі сведкамі з'яўлення папулізму і крайне правых у Еўропе і ЗША, трэшчын у Еўрапеўскім саюзе, кібервойнаў. Кітай як новая звышдзяржава займае ўсё больш дамінуючае месца. Пандэміі, падобныя да вірусаў Эбола і Зіка. Змены клімату, якое вядзе да экстрэмальных з'яваў надвор'я. Беспілотныя аўтамабілі. Штучны інтэлект. “Фальшывыя навіны”. “Альтэрнатыўныя факты”. “Постапраўда”. “Прарыўныя тэхналогіі”, якія разбураюць і часта псуюць усё. Свет у палоне няспынных перамен... Здаецца, нікому і нічому нельга больш давяраць. Усё, што мы лічым нормай, растае проста перад намі.

Тэорыя постзвыклага часу дапамагае чытачу зарыентавацца ў зменлівым свеце, дзе пануе няпэўнасць, а невукі сталі шаноўнай супольнасцю.

Постзвыклы час лепш за ўсё вызначыць як «прамежкавы перыяд, калі старыя артадоксы адміраюць, новыя яшчэ не нарадзіліся,і здаецца, што вельмі мае сэнс». Як выказаўся Эцыа Маўра: «Мы знаходзімся ў падвешаным стане паміж “ужо не” і “яшчэ не”, і таму для нас непазбежная нестабільнасць: няма нічога фіксаванага вакол нас, нават кірунку нашага руху». Тэорыя постзвыклага часу спрабуе асэнсаваць зменлівы свет, дзе няпэўнасць з'яўляецца дамінуючай тэмай, а невуцтва стала каштоўным таварам. **«Хрэстаматыя постзвыклага часу»** – наватарская анталогія прац пра супярэчлівай, комплекснай і хаатычнай прыродзе нашай эпохі. Яна ўключае паходжанне, тэорыю і метадалогію постзвыклага часу; даследуецца мноства пытанняў – ад змены клімату, кіравання і блізкаўсходніх праблем да рэлігіі і навукі з пункту гледжання постзвыклага часу. Склаўшы карту некаторых ключавых мясцовых і глабальных праблем нашай пераходнай эпохі, хрэстаматыя дапамагае вызначыць арыенціры ў нашай турботнай будучыні.

Міжнародны Інстытут
Ісламскай Думкі
Серыя “Свет сучаснага ісламу”